WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 СТУДЗЕНЯ 2010 г.
СУБОТА
№ 12
(26620)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 студзеня разгледзеў кадравыя пытанні. Прэзідэнт назначыў:

Заічкова Ігара Мікалаевіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму;

Брылёва Валерыя Анатольевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан;

Дзенісенку Віктара Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кыргызскай Рэспубліцы;

Дзядкова Леаніда Мікалаевіча — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі;

Бахматава Ігара Андрэевіча — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі па кадравым забеспячэнні і арганізацыйнай рабоце;

Бусько Ігара Яўгенавіча — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці;

Ляскоўскага Івана Анатольевіча — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гомельскай вобласці;

Каржа Івана Аляксеевіча — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гродзенскай вобласці;

Сяргеенку Ігара Пятровіча — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Магілёўскай вобласці;

Калача Уладзіміра Віктаравіча — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па г. Мінску і Мінскай вобласці;

Кузняцова Ігара Ніканавіча — начальнікам дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь»;

Шугаева Сяргея Міхайлавіча — начальнікам галоўнага ўпраўлення контрразведкі Камітэта дзяржаўнай бяспекі;

Яруту Віктара Георгіевіча — начальнікам галоўнага ўпраўлення ўрадавай сувязі Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

Кіраўнік дзяржавы таксама назначыў:

Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах **Сямешку Аляксандра Віктаравіча** Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Дзяржаве Катар і Каралеўстве Саудаўская Аравія па сумяшчальніцтве;

Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Арабскай Рэспубліцы Егіпет, пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры Лізе арабскіх дзяржаў **Фісенку Ігара Валянцінавіча** Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Султанаце Аман па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

Дазорава Анатоля Мікалаевіча — першым намеснікам кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Назарава Юрыя Віктаравіча — намеснікам кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Роліча Іосіфа Баляслававіча — намеснікам кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Мохата Алега Віктаравіча — старшынёй Глыбоцкага райвыканкама;

Маскалёва Юрыя Іванавіча — кіраўніком адміністрацыі Чыгуначнага раёна г. Віцебска;

Аніскаўца Рыгора Уладзіміравіча — старшынёй Веткаўскага райвыканкама;

Пінчука Аляксандра Васільевіча — старшынёй Петрыкаўскага райвыканкама;

Хаджаева Валерыя Асімавіча — генеральным дырэктарам вытворча-гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белмедтэхніка»;

Сазановіча Аляксандра Васільевіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага гандлёва-вытворчага аб'яднання «Белрэсурсы»;

Ананьева Мікалая Канстанцінавіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнай установы «Шматпрофільны культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна»;

Старчанкі Таццяны Міхайлаўны — намеснікам адказнага сакратара Камісіі Мытнага саюза;

Цэдрыка Сяргея Дзмітрыевіча — намеснікам кіраўніка дэпартамента эканамічнай палітыкі Сакратарыята Інтэграцыйнага камітэта Еўразійскага эканамічнага супольніцтва;

Харужыка Лявонція Іванавіча — начальнікам дэпартамента эканомікі і галіновых праграм Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы;

Мацюшкі Аляксея Уладзіміравіча — кіраўніком спраў, членам Віцебскага аблвыканкама.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ФАРМАЛІЗМ І БЮРАКРАТЫЗМ — ГАЛОЎНЫЯ НЕДАХОПЫ Ў РАБОЦЕ ІДЭАЛАГІЧНЫХ СТРУКТУР

Такую думку выказала ўчора ў Рэчыцы журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля Пяткевіч, якая брала ўдзел у рабоце рэгіянальнага семінару ідэалагічных работнікаў Гомельскай вобласці.

Паводле слоў Наталлі Пяткевіч, нярэдкія выпадкі, калі ідэалогія разглядаецца не як жывыя стасункі з людзьмі, а штосьці штучнае, што робіцца проста для «галачкі». «Нельга сказаць, што гэта характэрна для нас у цэлым, але гэта нашы галоўныя недахопы, з якімі, натуральна, мы змагаемся».

Разам з тым, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі ўпэўнена, што за апошнія некалькі гадоў аблічча ідэолага радыкальна змянілася. А ў тым, што гэта работа вядзецца і яна патрэбная, змагліся пераканацца нават скептыкі. «Таму што ідэалогія — гэта насамрэч прапаганда маральнасці, патрыятызму. Тое, што ва ўсе вякі было, ёсць і будзе», — канстатавала Наталля Пяткевіч.

Валерый СІДОРЧЫК, БЕЛТА.

ЯШЧЭ ПАШЧАСЦІЦЬ

20-гадовы хлопец з в. Хатынічы Ганцавіцкага раёна прадаў сваю аўтамашыну і на ўтаргаваныя грошы купіў 705 білетаў «Суперлато». На білеты хлопец патраціў 3,5 млн рублёў, а выйграў толькі 2,6 мільёна.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.01.2010 г. (для б/н разлікаў)

Агенцтва Уладзіміра Грацуова

▼1 долар ЗША	2 861,00
▲1 еўра	4 046,03
1 латвійскі лат	5 710,01
1 літоўскі літ	1 171,05
1 чэшская крона	155,12
1 польскі злоты	992,71
▼1 расійскі рубель	96,18
1 украінская грыўня	351,69

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,7458
UAH	36,5652
1000 BYR	10,3825
EUR	42,0576

ISSN 1990 - 763X

Фота Вольгі ЛАСКІ.

ПРАКАВЕТНАЕ

Развітанне з Калядамі, альбо Як адкусіць кату «нешта»

Магчыма, нехта скептычна ўсміхнецца, маўляў, вось яшчэ прыдумалі, хіба так бывае? Па-першае, калі Каляды сустракаюць, значыць, і праводзяць таксама. А праводзіць трэба гэтак жа годна і ўрачыста. Па-другое, прыдумалі гэта не тое што не мы — нашы далёкія мудрыя продкі. Мы ж толькі паглядзелі, як адбываецца развітанне ў Бярэзінскім раёне, дзе абрад мае сваю асаблівую назву: «Каляду на дуба цягнуць». А менавіта ў вёсцы Новіны, дзе ў адрозненне ад іншых вёсак Каляду ўсцягвалі не на бярозу, хвою ці якое іншае дрэва, а менавіта на магутны дуб — сімвал сапраўднай моцы.

СТАР. 6

Прамая лінія

НЕТРАДЫЦЫЙНАЯ МЕДЫЦЫНА СУПРАЦЬ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ХВАРОБАЎ

Госцем нашай чарговай «прамой лініі» будзе **прафесар, доктар медыцынскіх навук, загадчык кафедры рэфлексатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, галоўны спецыяліст па нетрадыцыйных метадах лячэння Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аляксандр СІВАКОЎ.**

Аляксандр Паўлавіч вывучае ўсходнюю медыцыну больш за 30 гадоў. Чатыры разы ён стажыраваўся ў Кітаі, а ў 1991 годзе — у Інстытуце традыцыйнай в'етнамскай медыцыны. Аб тым, якія сучасныя тэхналогіі нетрадыцыйных метадаў лячэння існуюць і пры якіх захворваннях дапамагаюць, вы можаце спытаць у нашага госця.

«Прамая лінія» адбудзецца 26 студзеня, у аўторак, з 12.00 да 13.00 па нумарах 8(017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

ГУ «НАЦИОНАЛЬНЫЙ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ МУЗЕЙ-ЗАПОВЕДНИК «НЕСВИЖ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА, АРЕНДОДАТЕЛЬ)

ПРОВОДИТ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности (сроком на 5 лет), расположенных по адресу: Минская обл., г. Несвиж, Дворцово-парковый ансамбль 16—17 вв., помещение кафе с подсобными помещениями общ. пл. 263,25 кв. м на 36 посадочных мест. *Начальная цена права аренды — 2 303 438 бел. рублей.* Договор аренды предусматривает ставку арендной платы за 1 кв. м — 30 903 бел. рубля. Кафе укомплектовано и оборудовано необходимой мебелью, технологическим оборудованием, грузовым лифтом (в стоимость арендной платы не входит стоимость арендуемого оборудования). Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3632900000007 в фил. № 620 АСБ «Беларусбанк» г. Несвижа, МФО 153001523, ГУ «НИКМЗ «Несвиж», УНП 600207920. Оплата стоимости права аренды производится в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с арендодателя. Договор аренды подписывается сторонами в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона и оформления протокола. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **01.03.2010** г. в 11.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Ленинская, 19. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.02.2010 г.** до 16.30 по указанному адресу.

Тел.: (8 01770) 5 40 80, 5 57 91.

НЕДАРЭЧНАЯ «ЦЫБУЛІНА» НА НЯСВІЖСКІМ ЗАМКУ БУДЗЕ ЗМЕНЕНАЯ!

Рэзананс

Такое рашэнне прыняла Рэспубліканская навукова-метадычная рада. Пытанне толькі — калі адбудзецца тая змена...

Пра абсалютна недарэчную вежу-цыбуліну на Нясвіжскім замку казалі і пісалі даўно і ўсе, у тым ліку і «Звязда». Яна была пастаўленая на замак паводле праекта 2002 года. Праект той «грунтаваўся» на адной-адзінай гравюры Томаша Макоўскага, аднак нават там была выяўленая не дакладна такая вежа. Больш за тое, у часы Макоўскага ўвесь замак выглядаў зусім не так! У канцы XVIII стагоддзя, калі Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька скончыў адбудову замка (які быў разбураны падчас Паўночнай вайны), ён надаў яму адзіны стылістычны выгляд — абедзве вежы былі прыкладна аднолькавыя.

Канцэпцыя аднаўлення Нясвіжскага замка «на розныя часы» не вытрымлівае крытыкі і выглядае ўтапічнай. Як можна на «жывым» аб'екце, які перабудоўваўся і дабудоўваўся некалькі разоў, паказаць чатыры стагоддзі адначасова?! У выніку дзеля аднаўлення часоў «цара гароху» быў знішчаны, скажам, салонік каля бальнай залы з унікальнымі скляпеннямі...

І вось нарэшце розум узяў верх — вырашана прыбраць з замка гэты ганебны выраб, устаўляваўшы нармалёвы купал. Такое рашэнне прыняла на чарговым пасяджэнні

Пачынаючы ад XVIII стагоддзя абедзве вежы выглядалі аднолькава (так як левая). Менавіта такой вежы-цыбуліны (як справа) на замку не было ніколі. Нешта падобнае захавалася толькі на гравюры пачатку XVII стагоддзя, аднак тады замак выглядаў зусім інакш...

Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Мінкульце. Пра гэта «Звязда» паведаміў сябра **Рады, начальнік Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Ігар ЧАРНЯЎСКІ:**

— Прынцыпова вырашана змяніць сённяшнюю вежу — і вярнуць ёй звыклы выгляд. Замак мусіць быць прыведзены да стылёвага адзінства — пра гэта ўжо даўно казалася. Наконт тэрмінаў казаць нешта цяжка, бо трэба знайсці некалькі соцень мільёнаў рублёў, каб гэтую работу правесці... Магу сказаць толькі, што гэтае рашэнне Рады — абавязковае да выканання. Аднак канкрэтныя тэрміны, безумоўна, залежаць ад наяўнасці сродкаў...

Карацей кажучы, знак вельмі добры, але канчаткова радавацца рана. Бо сродкі могуць быць знойдзеныя і заўтра, і праз 10 гадоў. Самы нярадасны варыянт, агучаны ў кулуарах, — змяніць вежу падчас наступнага капітальнага рамонту. Аднак дзіцяці зразумела, што пасля такой грандыёзнай адбудовы замка гэты капрамонт будзе гадоў праз 25—30. А калі рабілі дабротна, як Радзівілы, — то і пазней.

Іншае пытанне, якое ўжо пачало ўзнікаць, — як тэхнічна замяніць купал? Чаплялі яго кампактным вежавым кранам. Маўляў, няма ў нас такіх мабільных кранаў на машынах, каб гэта выканаць. Тут, мяркую, яшчэ трэба ўдакладняць. Бо вышыня вежы 43,3 метра — да канца шпіля. А вышыня, скажам, галоўнай ёлкі краіны на Кастрычніцкай плошчы — 35 метраў. І яе без праблемаў ставілі кранам. Можа і туды дацягнецца?..

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРУЗІЯ КАНЧАТКОВА ВЫЙШЛА З СНД

Грузія ў пятніцу, 22 студзеня, паставіла кропку ў працэсе выхаду з Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У гэты дзень фармальна завяршылася яе знаходжанне ў складзе Міжпарламенцкай Асамблеі (МПА) СНД.

Парламент Грузіі абвясціў МПА аб спыненні членства ў ёй 22 ліпеня 2009 года, а працэдура выхаду займае паўгода. Такім чынам, Грузія афіцыйна не прадстаўленая ў Асамблеі з пятніцы. Але дэ-факта грузінскіх парламентарыяў няма ў складзе МПА ўжо даўно. Генеральны сакратар МПА СНД Міхаіл Кротаў паведаміў, што прадстаўнік Грузіі «з'ехаў месяцаў сем-восем таму». «Іх ніхто не выганяў, я асабіста шчыра шкадую аб іх рашэнні і думаю, што яны вернуцца», — заявіў ён.

ЦІГІПКА ГАТОВЫ СТАЦЬ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ УКРАІНЫ

Лідар партыі «Моцная Украіна» Сяргей Цігіпка ў інтэрв'ю Украінскай службе Бі-Бі-Сі не выключыў, што стане прэм'ер-міністрам пры новым прэзідэнце Украіны.

Цігіпка, які заняў трэцяе месца на выбарах прэзідэнта, прызнаў, што прэм'еру давядзецца зрабіць шмат непапулярных крокаў і прыкласці тытанічныя высілкі для мадэрнізацыі краіны. У той жа час ён сказаў: «Я гатовы рызыкнуць сваім імем і сваёй рэпутацыяй. І не баюся гэтага, бо змагу ўсё растлумачыць людзям, і яны нармальна гэта ўспрымуць. Не проста так працаваць, а тлумачыць, тлумачыць і тлумачыць».

Лідар «Моцнай Украіны» падкрэсліў, што краіне тэрмінова неабходныя рэформы. «Для мяне самае галоўнае — гэта мадэрнізацыя Украіны. Калі гэта адбудзецца, то зменіцца ўсё. У сучаснай краіне людзі стануць больш свабоднымі. Не будзе люмпена. Гэта азначае, што і палітыкі зменяцца — да ўлады прыйдуць больш прагматычныя людзі», — растлумачыў ён сваю пазіцыю.

У ЛІТВЕ ЗАТРЫМАЛІ НАМЕСНІКА МІНІСТРА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

21 студзеня намеснік міністра аховы здароўя Літвы Артурас Скікас быў затрыманы на працоўным месцы, паведамляе Delfi.lt. Паводле інфармацыі агенцтва, яго падазраюць у хабарніцтве.

Затрыманне правялі супрацоўнікі Службы адмысловых расследаванняў. Чыноўніка, як паведамляецца, дапытвалі да вечара. Скікас затрыманы на 48 гадзін. Ці будуць сілавікі звяртацца ў суд па санкцыю на арышт, пакуль невядома.

ЮШЧАНКА ПРЫСВОІЎ БАНДЭРУ ЗВАННЕ ГЕРОЯ УКРАІНЫ



Прэзідэнт Украіны Віктар Ющчанка 22 студзеня абвясціў аб прысваенні звання Героя Украіны пасмяротна кіраўніку Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў Сцяпану Бандэру».

Пайсці на гэты крок украінскага прэзідэнта раней не раз прасілі мясцовыя нацыяналістычныя арганізацыі, а таксама некаторыя абласныя і гарадскія рады Заходняй Украіны.

Аб узнагароджанні Бандэры самым ганаровым украінскім званнем Віктар Ющчанка заявіў на ўрачыстым сходзе з нагоды Дня Саборнасці Украіны. Паводле меркавання прэзідэнта, гэтага ўзнагароджання «мільёны ўкраінцаў чакалі шмат гадоў». Ющчанка падкрэсліў, што гэтае высокае званне, паводле яго ўказа, Бандэру прысвоена за «адстойванне нацыянальнай ідэі і барацьбу за незалежнасць украінскай дзяржавы». Ацэнкі дзейнасці Сцяпана Бандэры ва Украіне дагэтуль з'яўляюцца прадметам спрэчак. На захадзе краіны яго лічаць барацьбітом супраць нямецкай і савецкай акупацыі, а на ўсходзе большасць людзей схільныя лічыць Бандэру і яго паплечнікаў тэрарыстамі, калабарацыяністамі і здраднікамі, якія стралялі ў спіны савецкіх салдатаў.

СУТЫКНЕННЕ НА ПЕРАЕЗДЗЕ

50 метраў праляцеў і перакуліўся аўтамабіль «Жыгулі», які сутыкнуўся з пасажырскім цягніком «Масква—Гомель» зусім побач з абласным цэнтрам, на перагоне «Лазурнае-Касцюкоўка». Машына, за рулём якой знаходзіўся 44-гадовы жыхар пасёлка Рассветны, раніцай, пры добрай бачнасці выехала на чыгуначнае палатно на забаронны сігнал святлафора. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ДАІ, кіроўца, рабочы мясцовага прадпрыемства ЖКГ, загінуў на месцы. З моцна пашкоджанага аўтамабіля выратавальнікі вымалі цела з дапамогай спецабсталявання. Лакаматыў таксама атрымаў механічныя пашкоджанні, з-за чаго ён не змог працягваць рух. На месца здарэння быў накіраваны іншы лакаматыў, які і павёз састаў да месца прызначэння. Пасажыры не пацярпелі. Крыху больш, чым дзве гадзіны склала затрымка ў руху цягніка пасля аварыі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

УДЗЕНЬ — СОНЕЧНА, УНАЧЫ — ДА МІНУС 30!

На выхадныя надвор'е ў нашай краіне будзе вызначаць моцны сібірскі антыцыклон з цэнтрам над Ленінградскай вобласцю. Маразы ў Беларусі ўзмацняцца, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Усталюецца сонечнае надвор'е. Тэмпература сёння мінус 13—18. У нядзелю стане яшчэ халадней. Маразы ўначы будуць дасягаць 20—27, месцамі да 30, удзень — 16—23. Моцна марозіць будзе і ў панядзелак, уначы — 21—27, месцамі да 30, удзень — 15—21, у асобных рэгіёнах да 24. У аўторак—чацвер часам чакаецца невялікі снег. Уначы — 15—22, пры працяглых праясненнях — да 28, удзень — 12—19, месцамі да 23.

Сіноптыкі амаль упэўненыя, што моцныя маразы ў нашай краіне пратрымаюцца мінімум да пачатку лютага.

Сяргей КУРКАЧ.

АСЦЯРОЖНА — МАРОЗ!

За мінулыя суткі васьмі жыхарам сталіцы ўрачы хуткай медыцынскай дапамогі паставілі дыягназ «абмарожанне».

Пераахаладзіўшыся, чалавек адчувае дрыжыкі, слабасць, галавакружэнне, санлівасць. Пры абмарожанні назіраецца бледнасць, мармуровасць скурнага покрыва, адчуванне паколвання і болю ў пашкоджаных участках. Але ў стане алкагольнага ап'янення болевая адчувальнасць зніжаная, таму адрозніць пераахаладжэнне ад абмарожання складана.

Пасля працяглага знаходжання на марозе ні ў якім разе нельга рэзка сагравацца (напрыклад, пад струменем гарачай вады), расціраць пераахаладжаныя ўчасткі цела. Лепш апрануцца ў сухое цёплае адзенне і выпіць цёплую гарбату, малако або булён, а пры неабходнасці выклікаць хуткую дапамогу.

Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск—Навіны».

БЕЛАРУСКАЯ ЦЫБУЛЯ — НА ТУМАННЫ АЛЬБІЁН?

Канцэрн «Белдзяржхарчпрам» і брытанская кампанія «Rectory Foods Ltd» падпісалі мемарандум аб сумеснай дзейнасці, адна з асноўных мэтаў якога — пастаўкі беларускай замарожанай прадукцыі (садавіны, агародніны, ягад і мяса птушкі) у Вялікабрытанію.

Як паведаміла прэс-сакратар канцэрна Ірына Гусева, перш-наперш англічане выказалі асаблівую зацікаўленасць у набыцці дзікарослых ягад (чарніц і суніц), а таксама цыбулі і зялёнага гарошку. Пры гэтым, з улікам адчувальнага павышэння попыту, супрацоўніцтва з кампаніяй «Rectory Foods Ltd» дае перспектывы выхаду на рынак не толькі Вялікабрытаніі, але і Еўрасаюза.

Дарэчы, зазначыла Ірына Гусева, кампанія «Rectory Foods Ltd» працуе на еўрапейскім рынку з 1996 года і на сёння з'яўляецца адным з найбуйнейшых пастаўшчыкоў свежай і замарожанай агароднінай прадукцыі, а таксама прадукцыі птушкагадоўлі ў Вялікабрытаніі, Ірландыі і іншых краінах Старога Свету.

Сяргей ГРЫБ.

НОЧ «ПАЛЯВАННЯ» НА АЎТО

За адну ноч у Мінску ў сталічным мікрараёне Серабранка пацярпелі адразу шэсць аўтаўладальнікаў: нехта «папрацаваў» над іх машынамі і прыхапіў з салонаў розныя рэчы...

Паводле звестак прэс-афіцэра Ленінскага РУУС Сяргея Козела, агульны ўрон для пацярпелых склаў каля 7 мільёнаў рублёў. Адразу тры ўладальнікі аўтамабіляў БМВ заявілі аб крадзяжы люстэркаў задняга віду. А гаспадар «Мерседэса» не ўбачыў на звычайным месцы фірменны знак яго «жалезнага каня», які злачынца сарваў. Акрамя таго, здабычай зладзюжак, якія гаспадарылі ў чужых машынах, сталі ноўтбук, магнітола, кампакт-дыскі і партманэ.

Ігар ГРЫШЫН.

НАПАДАЎ НА ЖАНЧЫН

У Пінску затрыманы грамадзянін Украіны, які абрабаваў чатырох жанчын за навагоднія святы. Ён высочваў жанчыну ў бязлюдным месцы, нападаў ззаду і душыў за горла. Такім чынам злыдзень адбіраў кашалькі і мабільныя тэлефоны. Цяпер замежны «госць» будзе адказваць па нашых законах.

Яна СВЕТАВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Во даюць!

НЕ ХОЧАШ НАРАДЖАЦЬ? АДКЛЮЧЫМ СВЯТЛО!

У гэта цяжка паверыць, тым не менш праблемай нізкай нараджальнасці заклапочаны не толькі ўрады еўрапейскіх краін — актуальная гэта праблема і для Паўднёвай Карэі. Па меркаванні дэмографаў гэтай краіны, хуткае старэнне насельніцтва можа ў найбліжэйшыя гады істотна затармазіць эканамічнае развіццё Паўднёвай Карэі.

Свой унёсак у павышэнне нараджальнасці вырашыла зрабіць і Міністэрства аховы здароўя гэтай краіны, прычым вельмі арыгінальным чынам. Кіраўніцтва міністэрства вырашыла практыкаваць штомесячныя адключэнні святла ў будынку міністэрства, каб прымусіць сваіх супрацоўнікаў раней вяртацца з працы дамоў. Мяркуецца, што гэта мера паспрыяе павышэнню нараджальнасці ў сем'ях чыноўнікаў.

Як паведамляе прэс-служба міністэрства, святло ў будынку будзе адключацца кожную трэцюю сераду месяца а палове восьмай вечара, за выключэннем аддзелаў, занятых выкананнем тэрміновай работы. А той час, што вызваліцца ў чыноўнікаў, мяркуецца прысвяціць нараджэнню і выхаванню дзяцей. «Скарочаны працоўны дзень не звязаны напрамую з колькасцю дзяцей, аднак нельга выключыць магчымасці такой сувязі, — адзначыў супрацоўнік Міністэрства аховы здароўя Цой Чын Сон, адказны за рэалізацыю гэтага праекта.

Міністэрства аховы здароўя Паўднёвай Карэі не можа змірыцца з той акалічнасцю, што ў семя'х чыноўнікаў міністэрства, якія адказваюць у тым ліку і за дэмаграфічную сітуацыю ў краіне, вельмі невысокі ўзровень нараджальнасці. У сярэднім на сям'ю супрацоўніка міністэрства прыпадае 1,63 дзіцяці, у той час як на сем'і чыноўнікаў іншых ведамстваў — 1,82 дзіцяці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дзе была галава...

НЕ СПРАБУЙЦЕ САГРЭЦЦА НА ЦЕПЛАТРАСЕ Ў МАРОЗ!

У адной з медыцынскіх устаноў Брэста лечыцца чалавек з апёкам і абмаражэннем адначасова. Малады мужчына, нецвярозы, ішоў па вуліцы, адчуў холад і рашыў пагрэцца незвычайным чынам: прылёг на люк цеплатрасы. Потым заснуў. У выніку — абмаражэнне адкрытых участкаў цела, а таксама ног і... вельмі моцныя апёкі прамежнасці. Пакуль урачы не робяць ніякіх прагнозаў наконт захавання жыцця і здароўя чалавека.

Гэту інфармацыю агучыў на прэс-канферэнцыі для сродкаў масавай інфармацыі **загадчык апёкавага аддзялення Брэсцкай абласной бальніцы Аляксандр СЕМЯНЮК.** Было сказана таксама, што ў гэтым месяцы ў абласным цэнтры з абмаражэннямі шпіталізаваны 21 чалавек, а па вобласці — 45. Усяго ж ад холадавых траўмаў сёлетняй зімой пацярпела 76 грамадзян рэгіёна. Што характэрна, 90 працэнтаў з іх былі нападпітку. Таму медыкі прасілі яшчэ і яшчэ раз заклікаць грамадскасць не «саграваць» сябе спіртнымі напоямі ў мароз. Гэта вельмі небяспечна.

Урачы-педыятры звярнулі ўвагу бацькоў на тое, каб дзеці доўга не гулялі на вуліцы, асабліва з адкрытымі вушамі і рукамі. 13-гадовы брэсцкі школьнік трапіў у бальніцу з абмаражэннем пальцаў ног 1-3 ступеняў. Аказалася, хлопчык доўга гуляў на снежнай горцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Ну і ну!

ЗА НОС — 4 МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ

Менавіта 4 мільёны рублёў абавязаны заплаціць, згодна з прыгаворам суда, 46-гадовы жыхар Оршы, які... адкусіў частку носа мужчыну падчас высвятлення з ім адносінаў.

Як паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына ТАЎТЫН,** асуджаны атрымаў 3 гады пазбаўлення волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, плюс, згодна з прыгаворам суда, абавязаны сваёй ахвяры выплаціць 4 мільёны рублёў за маральную шкоду. Ды яшчэ выдаткі медыцынскай установе, патрачаныя за лячэнне пакрыўджанага ім грамадзяніна.

Суд устанавіў, што апошняму нанеслі невылечнае абязвечванне твару.

А ўсё пачалося, як часта бывае, выпадкова. Цяпер, ужо асуджаны, разам з жонкай і знаёмай сямейнай парай днём прыйшоў у кавярню. Там сядзела вясёлая кампанія. Зрабіў мужчынам заўвагу. Выйшлі разбірацца на вуліцу. На дапамогу кампаніі падышлі знаёмыя, якія недалёка на вуліцы пілі піва. Падчас высвятлення адносінаў адзін і адкусіў частку носа другому.

Пацярпеламу медыкі потым наклалі 12 швоў. На судзе ён канстатаваў, што, на ягоны погляд, гэта не вельмі дапамагло, маўляў, нават роднае дзіця роднага бацьку «не распазнае», баіцца. І прасіў у якасці кампенсацыі 5 мільёнаў на пластычную аперацыю. Суд прысудзіў выплаціць на мільён меней.

Цікава, што асуджаны — раней не судзімы, таксама бацька няпаўнагадовага дзіцяці. Працуе машыністам кацельні. На судзе свае дзеянні тлумачыў тым, што... нічога не памятае. Таксама не быў цвярозым. Маўляў, зрабіць такога не мог. Але суд вырашыў, што мог. І нават пасля касацыі прыгавора раённага суда ў абласным судзе прыгавор пакінулі без змянення.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВАРОТ

кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў да народаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці і сусветнай грамадскасці ў сувязі з 65-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў

Народы дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў 9 мая 2010 года адзначаюць 65-ю гадавіну Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. У небывалай па напружанасці і жорсткасці вайне шматнацыянальны народ Савецкага Саюза і яго Узброеныя Сілы адстаялі свабоду і незалежнасць сваёй Айчыны, пазбавілі многія краіны свету ад фашысцкага прыгнёту.

На фронце і ў тыле нашы народы праявілі самаадданасць і масавы гераізм, патрыятызм і інтэрнацыяналізм, нябачаную трываласць, без якіх перамога была б немагчымай. Такой трываласці гісторыя не ведала. Не ведала яна і такой волі да перамогі.

З гадамі не гасне велічэ подзвігу, які здзейснілі нашы народы. Чым больш часу аддаляе нас ад гэтай падзеі, тым выразней усведамляецца значнасць гістарычнай місіі салдатаў Перамогі, якія адстаялі права на будучыню. Таму, звяртаючыся да народаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці і сусветнай грамадскасці, мы кажам сёння «дзякуй» ветэранам, якія цяпер жывуць у нашых дзяржавах. Мы заклікаем не толькі словам, але і справай аддаваць даніну павагі герояm-пераможцам, праяўляць штодзённы клопат аб удзельніках вайны і працаўніках тылу, аказваць ім увагу і стварацьгодныя ўмовы жыцця.

9 мая — Дзень Перамогі — застаецца для нашых людзей днём трыумфу справядлівасці, гордасці і ўсенароднага смутку па мільёнах загінулых у гэтай вельмі жорсткай і страшнай бітве. Для нас імёны тых, хто загінуў смерцю храбрых у гады Вялікай Айчыннай вайны, святыя і дарагія. Мы ў неаплатным даўгу перад тымі, хто цаной свайго жыцця адстаяў Айчыну, а значыць — нашу свабоду.

Мы не забудзем гераізму салдатаў і працаўнікоў тылу, якія выратавалі свет ад фашызму. Таму мы заклікаем свята помніць тых, хто загінуў за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, праяўляць пастаянны клопат аб захаванні і падтрыманні ў належным стане воінскіх пахаванняў, мемарыяльных комплексаў, помнікаў і абеліскаў, а таксама магіл партызан, падпольшчыкаў і вязняў фашысцкіх лагераў; актывізаваць пошук астанкаў воінаў і мірных грамадзян, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ад рук фашысцкіх захопнікаў.

Мы не падзяляем Перамогу на сваю і чужую, заўсёды аддаём даніну мужнасці тых, хто аказаў супраціўленне нацызму. Мы помнім пра ўклад нашых саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамогу, іх дапамогу нам. Аднак найбольш маштабныя і, у канчатковым выніку, галоўныя падзеі адбываліся на савецка-германскім фронце. Нашы краіны страцілі за гады вайны дзясяткі мільёнаў грамадзян. Сярод загінулых на палях бітваў былі людзі ўсіх нацыянальнасцяў.

Улічваючы, што народы нашых дзяржаў зрабілі вырашальны ўклад у дасягненне Перамогі, мы заклікаем выхоўваць у падрастаючага пакалення пачуццё гордасці за агульную гераічную гісторыю і вялікі подзвіг у барацьбе з фашызмам.

Пацвярджаючы сваю адданасць агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права, палажэнням Статута ААН і Хельсінскага Заключнага акта, мы заклікаем да актыўнага ўзаемадзеяння ва ўмацаванні бяспекі і стабільнасці ў свеце, нарошчванні намаганняў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам і экстрэмізмам, мірнага палітычнага ўрэгулявання існуючых і прадухілення магчымых канфліктаў.

Асцярожна: падман!

«Экзамен у ДАІ? Без праблем!»

У Віцебску дзейнічалі злодзеі, якія зараблялі на даверлівых грамадзянах: абяцалі ім спрыяць у здачы экзаменаў у ДАІ на атрыманне правоў аўтамабілістаў.

Як паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Чыгуначнага раёна Віцебска Ірына ШЭРШАНЬ,** прадпрымальным маладым мужчынам — рабочаму і індывідуальнаму прадпрымальніку — і трыццаці гадоў няма. Абодва раней не судзімыя.

Спачатку да рабочага звярнуўся знаёмы, які папрасіў «знайсці выхад» на патрэбных людзей у ДАІ. Маўляў, ёсць у цябе знаёмы, ты ж расказваў, свякі якога ў інспекцыі працуюць. І, зразумела, рабочы ніяк не мог рэальна дапамагчы. Проста патэлефанаваў свайму знаёмаму — індывідуальнаму прадпрымальніку. Той сказаў, браць грошы, а потым, маўляў, разбяромся. За пасрэдніцтва рабочы папрасіў 100 долараў.

Сам індывідуальны прадпрымальнік вельмі актыўна браў грошы ад ахвотных атрымаць правы. З дзяўчыны, якая ў першы раз не змагла атрымаць правы, узяў 100 долараў, 240 тысяч рублёў — з мужчыны, які наогул не хацеў вывучаць правілы дарожнага руху... Каб ягоныя «кліенты» не сумняваліся ў тым, што іх «справы вырашаюцца», тэлефанаваў ім і называўся адказным работнікам ДАІ. Супакойваў, абяцаў, што хутка правы яны атрымаюць. Усяго зарабіў 350 долараў і 240 тысяч.

Падманутыя людзі звярнуліся па дапамогу ў праваахоўныя органы. Рабочы асуджаны да 1 года папраўчых работ з 15-працэнтным утрыманнем заробку на карысць дзяржаве. Прадпрымальнік за падбухторванне да дачы хабару і махлярства асуджаны да трох гадоў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕДАРЭЧНАЯ «ЦЫБУЛІНА» НА НЯСВІЖСКІМ ЗАМКУ БУДЗЕ ЗМЕНЕНАЯ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А яшчэ — неверагодны, але магчымы варыянт. У кастрычніку 2009 года беларускія ратаўнікі прадэманстравалі незвычайныя ўменні і майстэрства — перанеслі ў паветры на верталёце Мі-26 фюзеляж Ту-154 вагою 20 тонаў (!) на адлегласць 80 кіламетраў (!!!). Уяўляеце грандыёзную піяр-акцыю Міністэрства па надзвычайных сітуацыях: усталяванне на верталёце купала вежы Нясвіжскага замка! Мне здаецца, такі сюжэт паказалі б многія сусветныя тэлеканалы — і майстэрства беларускіх ратаўнікоў прагучала б на ўвесь свет!

Тым больш што вага купала не павінна скласці архішмат — навуковым кіраўніком аб'екта Сяргеем Друшчыцам распрацаваны мудры праект, які дазволіць у тым ліку ашчадзіць бюджэтныя сродкі — пакінуць апорна-нясучыя канструкцыі, замяніўшы толькі «абалонку».

Рашэнне пра замену вежы толькі прынятае, а неабыякавыя людзі не хаваюць свае радасці. **Анатоль БУТЭВІЧ, старшыня грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, у нядаўнім мінулым міністр культуры і друку Беларусі,** падзяліўся са «Звяздой»:

— Вітаю гэтае рашэнне рады! Бо барочны выгляд вежы стаў звыклы для многіх пакаленняў людзей у некалькіх стагоддзях! Вежа, якую павінны аднавіць, звязаная з сусветнай вядомасцю замка — менавіта па такім выглядзе яго пазнаюць. І калі такая змена на «цыбуліну» адбылася — то гэта не лепшым чынам працуе на наш імідж... Прыязджаюць людзі — і бачаць на гравюрах і 100-тысячнай купюры адно, а ў рэальнасці — нешта зусім іншае, недарэчнае і незразумелае. Я — за вяртанне нармалёвай вежы!..

Застаецца спадзявацца, што рашэнне не застанецца на паперы. І вельмі важна, каб вежа была змененая яшчэ да канца аднаўлення замка. Бо пасля, калі ў замак паедуць тысячы турыстаў, уявіць у двары пад'ёмны кран цяжка.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Напярэдадні

НА ЗМЕНУ СЁННЯШНЯМУ ФАРМАТУ ВЯШЧАННЯ ПРЫЙДЗЕ ДАМАШНЯЕ 3D-ТЭЛЕБАЧАННЕ

Паводле прагнозаў вядучых IT-спецыялістаў, 2010 год пройдзе пад знакам 3D. З аб'ёмным паказам эксперты звязваюць будучыню тэлебачання і гавораць, што ён стане галоўным стымулам для развіцця тэхналогій заўтрашняга дня, паведамляюць інфармагенцтвы.

Так, у гэтым годзе з'явяцца тэлеканалы, якія ў кругласутачным рэжыме будуць працаваць у 3D-фармаце. Трансляцыю 3D-перадач пачне брытанскі правайдар спадарожнікавага тэлебачання Sky, які ўваходзіць у імперыю медыямагната Руперта Мэрдака. Кіраўніцтва хоча паспець зрабіць гэта да пачатку чэмпіянату свету па футболе-2010 у ПАР.

Тым часам японская карпарацыя Panasonic мае намер захапіць першынство на пакуль яшчэ не існуючым рынку 3D-тэлевізараў. На працягу года з красавіка 2010-га гэта кампанія плануе вырабіць і рэалізаваць 1 млн такіх тэлевізараў. А ўжо ў 2012 годзе Panasonic мае намер павялічыць вытворчасць у 10 разоў. Калі гэтыя планы ажыццявяцца, то ўжо ў 2012-2013 гадах японская карпарацыя будзе кантраляваць 60 працэнтаў сусветнага рынку тэлевізараў з трохмернай выявай, які ацэньваецца экспертамі ў 15 млн адзінак. Прагназуемая цана на першыя 3D-тэлевізары будзе на 20 працэнтаў вышэй, чым на апараты з плоскаснай выявай.

У 3D-тэлевізары выкарыстоўваецца сістэма, у якой першапачатковая трохмерная выява HD-якасці падзяляецца па кадрах для кожнага вока, а потым па чарзе выводзіцца на экран са звышвысокай хуткасцю. Спецыяльныя акуляры сінхранізуюць падачу кадраў для кожнага вока па чарзе, пазбягаючы эфекту мігцення. Праграмы з аб'ёмнай карцінкай трэба праглядаць у спецыяльных акулярах. 3D-тэлевізар будзе працаваць таксама ў звыклым плоскасным рэжыме.

ТАКІ ВОСЬ СЫНОК...

Пенсіянерка з Брэста, якая пражывае па вул. Грыцаўца, апынулася ў бальніцы з разбітым тварам. Міліцыя выявіла, што на маці напаў 40-гадовы сын, які пачаў патрабаваць грошы. Жанчына заўпарцілася, тады сын пабіў маці і забраў 250 тысяч. Хулігана затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДРЭННЫ ЗРОК І ХВОРЫЯ НОГІ

У Мінску трамвай, які рухаўся па вуліцы Даўгабродскай, наехаў на 73-гадовага дзядулю. Апошні пераходзіў праезную частку па-за пешаходным пераходам. Пажылы чалавек атрымаў закрыты пералом 7-га, 8-га рэбраў.

— На пытанне, чаму ён выйшаў на дарогу ў забароненым месцы, — паведаміў **інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Мінгарвыканкама Аляксандр БРУЙ,** — адказаў так: «Тое, што няма пешаходнага перахода, я не бачыў, бо ў мяне дрэнны зрок, не пайшоў на падземны пераход, бо хворыя ногі, і наогул, я ніколі туды не хадзіў!».

Надзея ДРЫЛА.

ТАРЫФЫ НА ПАСЛУГІ ЖКГ ДА КАНЦА АЦЯПЛЯЛЬНАГА ПЕРЫЯДУ ПАВЫШАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

паведаміў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Уладзімір БЕЛАХВОСТАЎ.

«Тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі ў ацяпляльны перыяд павышаны не будуць, каб не дапусціць рэзкай нагрузкі на бюджэт сям'і», — адзначыў міністр. У далейшым урад разгледзіць абгрунтаванні Мінжылкамгаса па павелічэнні тарыфаў у 2010 годзе.

Цяпер сярэдняя сума плацяжоў за паслугі ЖКГ для сям'і з трох чалавек, якая пражывае ў стандартнай двухпакаёвай кватэры агульнай плошчай 48 кв. м, складае пры нарматыўным спажыванні камунальных паслуг Br162,9 тыс. З іх каля Br56,7 тыс. прыпадае на аплату ацяплення. У снежні плацяжы за ацяпленне павялічыліся ў параўнанні з лістападам у сярэднім на 15-20 працэнтаў. Як адзначылі ў Мінжылкамгасе, у студзені ў сувязі з моцнымі маразамі яны могуць вырасці яшчэ на Br6-15 тыс. у залежнасці ад характарыстык дома.

БЕЛТА.

Абзац

◢ Мінскі сямікласнік, перабягаючы дарогу ў неналежным месцы, трапіў пад машыну. Хлопчык з'явіўся на дарозе нечакана каля 6 гадзін вечара, калі ўжо прыцямнела, і кіроўца легкавой машыны, мабыць, проста не паспеў зарыентавацца. Хлопчык атрымаў закрыты пералом плечавай косткі, тупую траўму жывата і ўдар. З гэтымі траўмамі яго даставілі ў бальніцу.

◢ Мінскія выратавальнікі аказалі дапамогу 2-гадовай дзяўчынцы, галава якой засела ў крэсле для кармлення. У службу МНС звярнулася 26-гадовая маці дзяўчынкі. Выратавальнікі прыехалі на месца здарэння і вызвалілі малую. Летась такіх здарэнняў было больш за 10, а сёлета — першае.

◢ Кіраўнікі масласырзавода ў Верхнядзвінску на працягу 2 гадоў займаліся крадзяжом прадукцыі прадпрыемства. Пракуратура Віцебскай вобласці завяла крымінальную справу ў дачыненні да жыхара Мінска 1967 г.н. і жыхаркі Верхнядзвінска 1976 г.н. Яны, працуючы адпаведна дырэктарам і намеснікам дырэктара масласыразавода ў Верхнядзвінску, скралі прадукцыі прадпрыемства на Br75 млн. Выяўлена, што крадзеж яны ўчынялі ў перыяд са студзеня 2007-га па люты 2009 года.

◢ Пракуратура Пінска расследуе крымінальную справу ў дачыненні да ўрача мясцовай паліклінікі. Працуючы ўрачом-тэрапеўтам пункта здароўя ААТ прамыслова-гандлёвага аб'яднання «Палессе», яна ў 2007-2008 гг. неаднаразова выдавала фіктыўныя лісткі непрацаздольнасці работніцам прадпрыемства, якія ў гэты час знаходзіліся за межамі Беларусі. Вядзецца следства.

◢ У выніку шырокамаштабнай сумеснай аперацыі МУС Беларусі, МУС Расіі і ГУУС па Маскве затрыманы 7 удзельнікаў расійска-беларускай арганізаванай злачыннай групы пад назвай «Інтэрнацыянал», перадае БЕЛТА. Групоўка спецыялізавалася на забойствах, незаконным абароце баявой зброі і выбуховых прыстасаванняў. У затрыманых канфіскавныя падробленыя пашпарты і пасведчанне супрацоўніка ФСБ Расіі, рэвальверы «Наган», «Смит&Вессон», пісталеты Макарава, «Парабелум», «Зауэр», ТТ, а таксама прыстасаванні для бясшумнай стральбы, вялікая колькасць боепрыпасаў, 2 кг тратылу. Праваахоўнікі дзвюх краін праводзяць дадатковы комплекс мерапрыемстваў па высвятленні ўсіх фрагментаў дзейнасці АЗГ.

◢ Ва Ушацкім раёне супрацоўнікам МНС некалькі гадзін давялося шукаць у лесе 29-гадовага мужчыну, які заблудзіўся, выйшаўшы са спадарожнай машыны. На шчасце, у маладога чалавека быў з сабой мабільны тэлефон, і ён патэлефанаваў у міліцыю. Супрацоўнікі праваахоўных органаў паведамілі пра нестандартную сітуацыю выратавальнікам. Хлопца знайшлі за пяць кіламетраў ад таго месца, дзе ён, па яго словах, выйшаў са спадарожнай машыны.

◢ Ва Украіне ад абмаражэнняў і пераахалоджвання за перыяд з 18 снежня мінулага года па 21 студзеня г.г. загінулі 236 чалавек. Найбольшая колькасць ахвяраў моцных маразоў зафіксаваная ў Данецкай (97 чалавек), Запарожскай (29), Кіеўскай (17), Валынскай (16) абласцях.

Поўны абзац

◢ Ізраільскім уладам не ўдалося пахваліцца сваімі вынікамі ў барацьбе з выкрадальнікамі антыкварыяту. Напярэдадні ў горадзе Ашдодзе павінна была адбыцца выстава «Раскрадальнікі антыкварыяту ў Ізраілі», на якой выставілі старадаўнія рэчы, адабраныя ў злачынцаў. Першымі яе ацанілі ўзломшчыкі, не забыўшы скрасці самыя каштоўныя экспанаты. Цяпер у іх руках знаходзяцца залатыя завушніцы, кераміка і бронзавы накаенчнік кап'я. Здабычай злачынцаў стала таксама манета са срэбра з выявай профілю Аляксандра Македонскага. Заспакойвае толькі тое, што ўсе прадметы добра знаёмыя паліцыі і спецыялістам прадаць іх будзе няпроста.

◢ Жыхарку штата Джорджыя арыштавалі за тое, што яна прымусіла сына забіць хамяка. Як стала вядома ўладам, такім чынам 38-гадовая Лін Мідлбрукс Гетэр пакарала хлопчыка за дрэнную паспяховасць у школе. Гетэр прымусіла 12-гадовага сына расправіцца з гадаванцам пры дапамозе малатка. Праз дзень хлопчык расказаў пра здарэнне свайму настаўніку, а той перадаў інфармацыю мясцоваму шэрыфу. Гетэр была арыштаваная па абвінавачаннях у жорсткім абыходжанні з жывёламі, жорсткім абыходжанні з дзецьмі і абразе дзеяннем.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПАДАТКІ: НОВАЕ

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Міхаіл РАСОЛЬКА ўчора на брыфінгу адзначыў журналістам, што сёлета змяніліся падыходы прадастаўлення падатковых ільгот пры адчужэнні аўтатранспартных сродкаў. З пачатку 2010 года такая льгота будзе прымяняцца толькі для аўтамабіляў вагой да 3,5 тоны, колькасць пасажырскіх месцаў у якіх (без уліку месца кіроўцы) не больш як 8. Такім чынам, сёлета пры адчужэнні велікагрузных аўтамабіляў фізічнымі асобамі падаткаабкладанне атрыманых даходаў ажыццяўляецца на падставе пададзеных дэкларацый па выніках года. У выпадку, калі аўтатранспарт прадае арганізацыя, то менавіта гэты суб'ект гаспадарання ўтрымлівае з даходу падаходны падатак.

Павялічыўся сёлета стандартны падатковы вылік пры вылічэнні падаходнага падатку на кожнага работніка з 250 да 270 тысяч рублёў. Цяпер гэта сума не будзе абкладацца падаходным падаткам у тым выпадку, калі работнік атрымлівае максімальны заробак у месяц да 1,635 млн рублёў. Згодна з новым заканадаўствам, стандартны падатковы вылік можна атрымаць не толькі па месцы асноўнай працы.

Сёлета паменшаны падатковы цяжар на даходы, атрыманыя ў якасці дывідэндаў з 15 да 12 працэнтаў. З пачатку гэтага года даходы, атрыманыя грамадзянамі Беларусі ў выглядзе дарэння ад іншых фізічных асобаў у памеры да 500 базавых велічыняў (17,5 млн рублёў), вызваляюцца ад падаткаабкладання незалежна ад таго, з якой краіны і ад якога рэзідэнта яны былі атрыманыя. Да гэтага часу ад падаткаў вызвалялася 500 БВ з даходаў толькі ў тым выпадку, калі яны былі атрыманы ад рэзідэнтаў РБ. Сёлета пачала дзейнічаць новая льгота па падаходным падатку на бязвыплатную дапамогу ў памеры 1 тысячы базавых велічыняў для інвалідаў і асобаў, якім неабходная дарагая медыцынская дапамога.

З пачатку гэтага года пачынае дзейнічаць новая норма па прадастаўленні прафесійных падатковых вылікаў па аўтарскіх узнагароджаннях непасрэдна падатковымі агентамі, якія выплачваюць даход такім аўтарам. Цяпер падаткаплацельшчык мае права атрымаць нарматыўны прафесійны вылік па аўтарскіх узнагароджаннях непасрэдна ў падатковага агента ці праз падачу дэкларацыі у падатковым органе па выніках года. Для атрымання такога нарматыўнага выліку падаткаплацельшчык павінен звярнуцца з адпаведнай заявай непасрэдна ў бухгалтэрыю па месцы сваёй працы, ці па месцы атрымання аўтарскіх узнагароджанняў.

Застаюцца пакуль пытанні па стаўках падатку на нерухомасць і зямельнага падатку. Раней мясцовыя органы ўлады мелі права павялічваць ці змяншаць не больш чым у 2 разы гэтыя стаўкі для асобных катэгорый плацельшчыкаў. Цяпер Асаблівая частка Падатковага кодэкса і Закон аб бюджэце не прадугледжваюць змяненне гэтых ставак. Разам з тым, як паведаміла журналістам **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый МНС Лідзія ЦЫБІНА,** сёння ўжо падрыхтаваны праект указа, які рэгулюе гэтыя пытанні і захоўвае раней існуючыя нормы па карэкціроўцы ставак зямельнага падатку і падатку на нерухомасць. Хутчэй за ўсё, крыху пазней па гэтых падатках будзе зроблены перараслік з улікам прынятага ўказа.

Асобна Лідзія Цыбіна спынілася на аспекце цэнаўтварэння. Адмена сёлета мясцовага падатку з продажу і адначасовае павелічэнне стаўкі ПДВ з 18 да 20 працэнтаў патрабуе ад суб'ектаў гаспадарання перагледзець структуру фарміравання цаны. Неабходна з базавых цэнаў адмінусаваць адменены падатак з продажу і адначасова павялічыць яе за кошт змянення стаўкі ПДВ да 20 працэнтаў. Па ПДВ спецыяліст патлумачыла, што стаўка гэтага падатку пачынае дзейнічаць пасля адгрузкі тавараў менавіта ў 2010 годзе незалежна ад факту паступлення выручкі за адгружаны тавар. Калі, напрыклад, летась ажыццяўлялася папярэдняя аплата, а адгрузка тавару была зроблена сёлета, то дзейнічае стаўка ПДВ ужо на ўзроўні 20 працэнтаў.

Сяргей КУРКАЧ.

У КЛІЧАВЕ — ПРАВАСЛАЎНАЕ СВЯТА

У горадзе Клічаве адкрылася праваслаўная выстава-кірмаш. Ініцыятыва яе правядзення належыць Свята-Елісавецінскаму манастыру Мінскай епархіі.

На плошчы каля Дома культуры ў Клічаве з'явілася часовая капліца, а ў памяшканні прадаюцца абразы, рэлігійная літаратура, мёд, зёлкі, бальзамы і хлеб, які пячэцца ў манастыры па старажытных рэцэптах.

На адкрыцці адбыўся **хросны ход са старажытным абразом святога пакутніка дзіцяткі Гаўрылы Беластоцкага.** Гэты святы лічыцца ў праваслаўнай царкве апекуном дзяцей, а яго мошчы, вераць людзі, даюць вылячэнне ад хваробаў. Клічаўскія вернікі могуць прыкласціся да абраза і часткі мошчаў святога ўгодніка на працягу 3 дзён.

У межах выставы праходзіць акцыя «Пабудуем храм разам». У Клічаве цяпер аднаўляюць Свята-Дабравешчанскі храм. Ён быў пабудаваны ў 2000 годзе, але праз 6 гадоў згарэў з-за няспраўнасці пячнога ацяплення. На выставе, дзе на працягу тыдня пабывае шмат людзей з Клічава і навакольных паселішчаў, арганізаваны збор ахвяраванняў на аднаўленне мясцовага храма.

Яшчэ адзін **праект пад назвай «Агульная справа»** накіраваны на прафілактыку алкагалізму сярод падлеткаў і дарослых дзяцей. Яго стваральнікі хочуць данесці праўду аб алкагольнай залежнасці: у навучальных установах Клічава дзецям і іх бацькам пакажуць фільм пра піўны алкагалізм падлеткаў і бытавое п'янства дарослых. А таксама раскажуць, чаму п'янства — сацыяльнае зло і бязбожная справа.

Фотавыставу «Храмы і манастыры Беларусі» і выставу работ сучасных іканапісцаў дапоўняць майстар-класы. Адзін з іх правядзе і клічаўская майстрыха Валянціна Ісачкіна, якая вышывае абразы бісерам.

Ілона ІВАНОВА.

Рыштаванні Бацькаўшчыны

МЯСТЭЧКА БЛІЗ БЫЛОЙ МЯЖЫ

На радзіме продкаў Янкі Купалы не святкуюць... Купалле

Нібыта сёння яны збольшага зарабляюць сялянскай працай, трымаюць прысядзібныя гаспадаркі, маюць пераважна драўляныя дамы, а ўсё адно назаві мясцовых жыхароў «вяскоўцамі» — адразу ж пакрыўдзяцца. Многім не падабаецца нават цяперашні афіцыйны статус аграгарадка, ці не кожны заўважыць, што Рубяжэвічы — гэта прынцыпова мястэчка. Бо так было ад самага пачатку. А традыцыі тут не гублялі ніколі.

Хата для «яўрэйскага музея».

ШАНЦУЕ НА ЧАЦВЁРТЫ РАЗ

Лічыцца, што Рубяжэвічы з'явіліся недзе ў XIV стагоддзі дзякуючы яўрэям, якім вельмі спадабалася пляцоўка на ўзвышшы паміж дзвюма рэчкамі. Прычым не абышлося без пэўнага камерцыйнага разліку. На той час якраз тут праходзіла мяжа літоўскіх уладанняў, а гэта адкрывала добрыя перспектывы для гандлю. Ён і сапраўды квітнеў, крыху пазней у Рубяжэвічах ладзілі ажно пяць буйных кірмашоў у год, сюды з'язджаліся купцы з Навагрудка, Вільні, Масквы. А што да небяспекі, то ў мястэчку мелі абароннае збудаванне і, хутчэй за ўсё, драўляную крэпасць. Ад крэпасці дагэтуль захаваліся равы — сёння гэта мясціна мае назву Лосеў кут.

— Аб тым, што Рубяжэвічы былі мястэчкам, можна меркаваць нават па цяперашняй забудове, — кажа настаўніца мясцовай сярэдняй школы і краязнаўца Рамуальда Сабалеўская. — Дамы ў нас стаяць шчыльна, страха ў страху, тады як падворкі — маленькія. А гэта сведчыць аб тым, што людзей амаль не цікавіла сельская гаспадарка, што жылі яны іншым — шылі адзенне і абутак, займаліся кавальскай справай, і, зразумела, гандлявалі. Балазе, спрыяў таму і стары тракт, шлях з Мінска да Вільні.

Яшчэ даваенным часам дзве трэці тутэйшых жыхароў былі іудзеямі, у мястэчку стаялі дзве сінагогі. Прычым ніякіх непаразуменняў з суседзямі-хрысціянамі не ўзнікала. Яўрэі заўжды зычліва ставіліся да каталікоў і праваслаўных, часцяком давалі тавары напавер. Аднак сёння аб тым застаецца хіба што ўспамінаць. Яўрэяў у Рубяжэвічах больш няма — каля 360 чалавек расстралялі падчас мінулай вайны, іншыя трапілі на цяжкія прымусовыя работы ці ў канцэнтрацыйныя лагеры. А тыя, хто выжыў, затым палічылі за лепшае падацца ў эміграцыю.

— Такі быў час, — заўважае Рамуальда Сабалеўская. — Да 1939 года літаральна за тры кіламетры ад мястэчка праходзіла польска-савецкая мяжа, а да жыхароў прымежных раёнаў стаўленне было асаблівым. Я шмат размаўляла са старымі людзьмі, і ўсе казалі: пасля ўз'яднання Беларусі ніхто з рубяжэвічаў не рабіў нічога кепскага супраць новай улады, людзі хацелі проста жыць і займацца сваёй справай. Тым не менш многіх вывезлі — фактычна толькі за тое, што яны былі добрымі гаспадарамі. А гэта было крыўдна ўдвая. Паваенным сёй-той нават з'ехаў у Польшчу, дзе патрапілі ўладкавацца, знайсці сваю долю. Але большасць усё ж засталася, жыццё паступова наладзілася.

Ці не адзінае, што было па-сапраўднаму непрыемным, — гэта стаўленне да рэлігіі. Недзе ў сярэдзіне 1960-х гадоў у Рубяжэвічах зачынілі праваслаўную царкву, а пайшоў да цара ў чацвёрты раз, і, нарэшце, — паспяхова. Праўда, цар даручыў кіраванне будоўляй мінскаму губернатару. А ў сваю чаргу губернатар паставіў умову — будаваць толькі з камення і толькі 4 гады.

Помнік вёскам парафіі.

— Тэрмін быў абмежаваным, але спяшацца не сталі — важна было вытрымаць усе тэхналогіі, — працягвае Рамуальда Сабалеўская. — У першы год толькі выкапалі глыбокую, на трэць ад цяперашняй бачнай часткі касцёла, яму пад фундамент, забілі дубовыя палі, накідалі каменне — і пакінулі ўсё, каб прайшла «ўсадка». А ўжо потым за справу ўзяліся паўсотні муляраў, якія зноў жа рабілі раствор па старых «рэцэптах», замешвалі растворам на кіслым малацэ, яйках і вапне — у сценах храма няма ніводнага грама цэменту. Прычым сама будоўля стала агульнай, той, хто не быў заняты на ёй непасрэдна, прыносілі авечку, цяля, іншую ежу — работнікаў неабходна было добра карміць.

Укласціся ў патрэбны час не атрымалася, спачатку планавалася, што касцёл святога Іосіфа будзе мець 11 вежаў — у рэшце рэшт, паспелі ўзвесці ўсяго дзве. Але велічны неагатычны храм стаіць і цяпер, да таго ж сёлета ён адзначыць свой 100-гадовы юбілей — менавіта такі ж «узрост» мае і яго ўбранне, лаўкі, алтар, арган. Што ж да праваслаўнай Мікалаеўскай царквы, то ў Рубяжэвічах яна новая — царкву паставілі ў сярэдзіне мінулага дзесяцігоддзя.

ЦАРКВА КАСЦЁЛУ НЕ СУПЕРНІК

У старыя часы ў рубяжэвічцаў быў такі звычай. Калі сюды прыходзіла эпідэмія халеры ці іншай пошасці, жанчыны за адну ноч ткалі палатно, ранкам выносілі яго на дарогу, а пасля, як па тканіне пройдзе статак кароў, абавязкова неслі палатно ў храм. Ці зноў жа: была завядзёнка несці ў храм падарункі, воск, масла, іншыя прадукты — тое, што мелі са сваёй працы.

Усё гэта — традыцыі «свае». І ў той жа час адметна, што ў Рубяжэвічах амаль не надавалі ўвагі звычным народным святам.

— Колькі гадоў таму паспрабавалі наладзіць Купалле, але якойсьці пранікнёнасці тут ніхто не заважыў, і неяк гэта не прыжылося, — распавядае Рамуальда Сабалеўская. — Бо народныя святы ў нас не адзначалі, шанаваныя святы ў мястэчку заўсёды звязаныя толькі з хрысціянскім календаром.

Прыслухацца да мовы рубяжэвічцаў таксама цікава. Гаворка збольшага «мяшаная», беларуска-руская, але часцяком — з польскімі словамі. Многія з местачкоўцаў лічаць сябе палякамі, і цяпер па-польску робіцца абсалютная большасць надпісаў на каталіцкіх могілках. А з 1989 года пры жаданні польскую мову стала магчыма вывучаць у мясцовай школе. Жаданне маюць 54 працэнты вучняў, і гэта без уліку пачатковых класаў — праграма іх навучання цяпер знаходзіцца на зацвярджэнні.

Адметнасць школы — і польскамоўны тэатр. Юныя акцёры аб'ехалі ці не ўсю Польшчу, нават атрымалі спецыяльны медаль Сената гэтай краіны за развіццё польскай культуры. Аднак гэта ўзнагарода — не адзіная. Маюць тут і юбілейны медаль да 1000-годдзя хрышчэння Беларусі. І перш-наперш за развіццё культуры нашай краіны.

— У нас няма ніякіх канфліктаў паміж беларусамі і палякамі, гэтаксама як не ўзнікае бар'еру паміж праваслаўнымі і каталікамі, змяшаных шлюбаў у мястэчку шмат, — заўважае Рамуальда Сабалеўская. — Гісторыя ведае толькі адно прыкрае здарэнне ў пачатку мінулага стагоддзя, калі каталікі забраліся каля забранага ў іх касцёла святога Антонія і спілавалі праваслаўны крыж. Прычым гэтым учынкам абураўся Янка Купала, які прыкладна прыкладна праз дзесяцігоддзе яе ўвогуле разабралі. Такі ж лёс напаткаў і драўляны касцёл святога Антонія, што быў збудаваны яшчэ ў 1799 годзе. Пашанцавала толькі новаму каталіцкаму храму — касцёлу святога Іосіфа. Але па-іншаму, пэўна, быць не магло.

Калі ў сярэдзіне XIX стагоддзя касцёл святога Антонія забралі пад царкву, адзін з местачкоўцаў, Антоній Тур, вырашыў дамагчыся дазволу на будаўніцтва новага храма. Антоній Тур тройчы хадзіў пешшу асабіста да цара, але кожны раз чуў адмову. І тады ў 1866 годзе ён проста паставіў у Рубяжэвічах камень з высечанымі па-польску словамі: «Тут будзе стаяць касцёл каталіцкі». Пакаранне за ўчынак было жорсткім — Тура разам з сям'ёй выслалі ў Сібір. Але вера была настолькі моцнай, што па вяртанні ён

пайшоў да цара ў чацвёрты раз, і, нарэшце, — паспяхова. Праўда, цар даручыў кіраванне будоўляй мінскаму губернатару. А ў сваю чаргу губернатар паставіў умову — будаваць толькі з камення і толькі 4 гады.

— Тэрмін быў абмежаваным, але спяшацца не сталі — важна было вытрымаць усе тэхналогіі, — працягвае Рамуальда Сабалеўская. — У першы год толькі выкапалі глыбокую, на трэць ад цяперашняй бачнай часткі касцёла, яму пад фундамент, забілі дубовыя палі, накідалі каменне — і пакінулі ўсё, каб прайшла «ўсадка». А ўжо потым за справу ўзяліся паўсотні муляраў, якія зноў жа рабілі раствор па старых «рэцэптах», замешвалі растворам на кіслым малацэ, яйках і вапне — у сценах храма няма ніводнага грама цэменту. Прычым сама будоўля стала агульнай, той, хто не быў заняты на ёй непасрэдна, прыносілі авечку, цяля, іншую ежу — работнікаў неабходна было добра карміць.

Укласціся ў патрэбны час не атрымалася, спачатку планавалася, што касцёл святога Іосіфа будзе мець 11 вежаў — у рэшце рэшт, паспелі ўзвесці ўсяго дзве. Але велічны неагатычны храм стаіць і цяпер, да таго ж сёлета ён адзначыць свой 100-гадовы юбілей — менавіта такі ж «узрост» мае і яго ўбранне, лаўкі, алтар, арган. Што ж да праваслаўнай Мікалаеўскай царквы, то ў Рубяжэвічах яна новая — царкву паставілі ў сярэдзіне мінулага дзесяцігоддзя.

Маёнтак Ленскіх у Суле.



Сёлета касцёлу святога Іосіфа — 100 гадоў

ХАТА БЯНІГНЫ ІВАНАЎНЫ

Між тым візіт у Рубяжэвічы Купалы выпадковым назваць нельга. Літаральна за тры кіламетры ад мястэчка знаходзіцца фальварак Няшота, дзе жылі Іван і Кацярына Валасевічы — дзед і

РАДАР

ВЫПУСК № 1 (5)

Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь

КАНТРОЛЬ ДАІ ЗНІЖАЙ ХУТКАСЦЬ

3 ЗВЯЗДА 23 студзеня 2010 г.

КОЖНЫ, ХТО ГАТОВЫ ЗАПЛАЦІЦЬ 2 МІЛЬЁНЫ, МОЖА СТАЦЬ УЛАДАЛЬНІКАМ НУМАРА З ТОЙ КАМБІНАЦЫЯЙ ЛІЧБАЎ І ЛІТАР, ЯКАЯ ЯМУ ДАСПАДОБЫ. КОШТ НА ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ, ЯКІЯ МОГУЦЬ АКАЗВАЦЬ РАБОТНІКІ ДАІ, ЗАЦВЕРДЖАНЫ Ў 2009 ГОДЗЕ ПАСТАНОВАЙ МІНІЭКАНОМІКІ №143.

КАЛІ РАПТАМ СУПРАЦОЎНІКІ ДАІ СПЫНЯЦЬ ВАШАГА ЗНАЁМАГА Ў СТАНЕ АЛКАГОЛЬНАГА АП'ЯНЕННЯ ЦІ БЕЗ ПРАВОЎ, ТО АДКАЗВАЦЬ ДАВЯДЗЕЦЦА НЕ ТОЛЬКІ ЧАЛАВЕКУ, ЯКІ СЯДЗЕЎ ЗА РУЛЁМ, АЛЕ І ТАМУ, НА КАГО ГЭТЫ АЎТАМАБІЛЬ АФОРМЛЕНЫ.

Васіль БУЛЬБЯНКОЎ, намеснік начальніка УДАІ МУС РэспублікіБеларусь:

«МАШЫНЫ З НУМАРНЫМІ ЗНАКАМІ НАКШТАЛТ «БАГІНІ», «ПУПСІКІ» ПА БЕЛАРУСКІХ ДАРОГАХ НЕ ЕЗДЗЯЦЬ»

Аўтамабіль не раскоша, а сродак перасоўвання, гаварыў усім вядомы герой рамана «Залатое цяля» Астап Бэндэр. Але гаспадары «крутых» машын, альбо не вельмі «крутых», але з «крутымі» нумарамі, думаю, пагодзяцца з ім не да канца. Маўляў, аўтамабіль з'яўляецца яшчэ і паказчыкам высокага альбо нізкага «палёту» ўладальніка, яго становішча ў грамадстве. Апошнім часам лакмусавай паперкай паспяховасці ці непаспяховасці лічыцца рэгістрацыйны знак. Па камбінацыі лічбаў і літар на якім можна судзіць аб «крутасці» аўтаўладальніка.

Менавіта гэтай тэме ў большасці прысвечана сённяшняя размова з кампетэнтным суразмоўцам. Як замовіць нумар з годам свайго нараджэння? І колькі будзе каштаваць гэта задавальненне? Якія рэгістрацыйныя знакі можна набыць за паўцаны? І чым можа скончыцца паездка па даверанасці? На гэтыя і іншыя не менш хвалюючыя пытанні адказвае намеснік начальніка УДАІ МУС Беларусі Васіль БУЛЬБЯНКОЎ.

— Васіль Васільевіч, у Швецыі альбо Германіі, напрыклад, аўтамабілі, маркі якіх з'яўляюцца аднымі з самых дарагіх у свеце, можна ўбачыць на кожным кроку. А колькі налічваецца «крутых» машын у Беларусі?

— Я вам так па памяці і не скажу. Бо, калі шчыра, мяне хвалюе больш бяспека на дарозе. Якая розніца на якім аўтамабілі едзе чалавек, за 60 тысяч долараў ці за 6 тысяч, галоўнае, каб аўтамабіль быў спраўны і кіроўца ехаў па правілах. Але калі цікава, можна паглядзець па базе. Вы толькі называйце марку аўтамашыны, а я вам буду казаць, колькі іх на сёння зарэгістравана.

— «Астан Марцін»?
— 6.
— «Майбах»?
— 3.
— «Мазэраці»?
— 9.
— «Ламбарджыні»?
— 2.
— «Бугаці»?
— 0.
— «Паршэ»?
— 425.
— «Ягуар»?
— 311.
— «Ферары»?
— 1.
— «Бэнтлі»?
— 16.

— Прыкмеціла, у вас на стале ляжыць не зусім звычайны аўтанумар...

— З выявай тыгра і лічбай 2010? Гэты сувенір сёлета на Новы год я атрымаў ад калег з Расіі.

— А ці рэальна ўбачыць на беларускіх дарогах аўтамабіль з рэгістрацыйным знакам, на якім замест лічбаў выбіта імя кіроўцы (ці якое-небудзь іншае слова, напрыклад, БАГІНЯ ці ПУПСІК)?

— Вы можаце замовіць знак абсалютна з любым надпісам, з любым малюнкам. Але ж машыны з нумарнымі знакамі накшталт «БАГІНІ», «ПУПСІКІ» па беларускіх дарогах не ездзяць. Выкарыстоўваць іх давядзецца выключна ў якасці сувеніру. На машыну ж, якая не будзе стаяць на выставе, а будзе ездзіць па дарогах, трэба прымацоўваць рэгістрацыйны знак, устаноўлены стандартам. А «Васі», «Пеці» і іншае глупства на беларускіх дарогах не практыкуюцца. Самі падумайце, у нас жа Васяў і Пецяў шмат. А калі, не дай Бог, кіроўца наедзе на чалавека і ўцячэ з месца здарэння, дзе нам яго тады шукаць?..

— А калі, напрыклад, маладзіны чалавек захоча парадаваць каханую і папросіць вас выдаць рэгістрацыйны знак з датай яе нараджэння?

— Гэта ўжо іншая рэч. Сярод паслуг, якія за дадаткоўю плату можа аказваць Дзяржаўтаінспекцыя, значыцца і тая, пра якую вы пытаецеся. Кожны, хто гатовы заплаціць 2 мільёны, можа стаць уладальнікам нумара з той камбінацыяй лічбаў і літар, якая яму больш даспадобы. Кошт на платныя паслугі, якія могуць аказваць работнікі ДАІ, зацверджаны ў 2009 годзе пастановай Міністэрства эканомікі №143. Попытам карыстаюцца чатыры (дзве) аднолькавыя лічбы, тры нулі ў пачатку, некаторыя замаўляюць свой (ці каханай) год альбо дзень і месяц нараджэння.

— Што трэба зрабіць, каб атрымаць індывідуальны нумар?

— Дастаткова напісаць заяву ў рэгістрацыйна-экзаменацыйнае падраздзяленне па месцы рэгістрацыі і заплаціць 2 мільёны. Нягледзячы на тое, што знакі вырабляюцца ў Мінску, жыхарам іншых гарадоў і вёсак не трэба для гэтага ехаць у сталіцу. Мы самі ў сціслыя тэрміны даставім гатовыя знакі туды, куды трэба.

— А калі я захачу мець нейкі канкрэтны аўтанумар з той серыі, якая маецца ў наяўнасці ДАІ?

— Камплект знакаў, якія ўласнік аўтамабіля атрымлівае падчас рэгістрацыі па чарзе, каштуе 70 тысяч рублёў. Калі ж вы жадаеце стаць уладальнікам нейкага канкрэтнага рэгістрацыйнага знака з бягучай серыі па-за чаргой, то можаце заплаціць за падбор 400 тысяч рублёў.

— Рэгістрацыйны знак, як і ўсё матэрыяльнае ў нашым жыцці, не вечны. З цягам часу гнецца, ламаецца, сціраецца...

— Аўтаўладальнік можа напісаць заяву, каб яму памянялі саспаваны знак на ідэнтычны новы. Камплект абыдзецца ў 70 тысяч рублёў. Рэгістрацыйныя знакі, якія мы выдаём сёння, калі правільна імі карыстацца, служаць як мінімум пяць гадоў.

— А калі знак скралі?

— Такія нумары ставяцца на асобны ўлік і не ўзнаўляюцца.

— Нават за 2 мільёны?

— Нават за 2. Аўтаўладальніку давядзецца зноў набываць новы камплект знакаў.

— А калі я набыла за 2 мільёны. Колькі вы будзеце мяняць аўтамабіль, столькі вам будуць выдаваць гэты знак. Праўда, здараецца, уладальнік такога знака пераязджае жыць, напрыклад, з Мінска ў Брэст ці наадварот. У гэтым выпадку яму нічога не застаецца, як адмовіцца ад свайго дарагога знака. Мы ж маем права гэты знак прапанаваць іншым людзям, але ўжо за 35 тысяч рублёў.

— Як вы караеце злачынцаў, якія прымацоўваюць да машыны саматужныя знакі?

— За падробку рэгістрацыйных знакаў адміністрацыйным кодэксам прадугледжана адказнасць да 20 базавых велічыняў (1 базавая на сёння — 35 тысяч рублёў), паўторна — да 40 базавых. Але гэта адзінкавыя выпадкі. Як правіла, несапраўдныя знакі прымацоўваюць да матацыклаў вясковыя падлеткі. Іх нескладна выявіць.

— І на дарогах, і на стаянках можна сустрэць аўто, чорныя лічбы і літары на рэгістрацыйных знаках якіх цалкам зліваюцца са слоем бруду. Наколькі я ведаю, існуе адказнасць і за брудныя рэгістрацыйныя знакі?

— Вы маеце рацыю. Лічбы і літары на брудным знаку, як правіла, складана разабраць нават спецыяльным прыборам, не кажучы ўжо пра няўзброенае вока. У адпаведнасці ж з пунктам 10.3 ПДР кіроўцу забараняецца ўдзельнічаць у дарожным руху на ТС з забруджанымі рэгістрацыйнымі знакамі, інфармацыя на якіх не бачная з адлегласці 40 і менш метраў. І за гэта часткай 3 артыкула 18.12 адміністрацыйнага кодэкса прадугледжана папярэджанне ці штраф да 2 базавых велічыняў.

— Некаторыя, бачыла, прымацоўваюць на знак побач са сцягам і беларускі герб. Думаюць, напэўна, што іх радзей работнікі ДАІ будуць спыняць...

— На рэгістрацыйным знаку не павінна быць нічога лішняга. За гэта таксама прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

— Васіль Васільевіч, ці можа чалавек, які пакуль не мае правоў альбо мае правы, але пакуль збірае грошы на аўтамабіль, набыць рэгістрацыйны знак?

— Рэгістрацыйны знак прысвойваецца канкрэтнаму транспартнаму сродку. Таму, зразумела, без наяўнасці аўтамабіля атрымаць камплект знакаў нерэальна. Адзінае, можна зрабіць індывідуальны заказ за 2 мільёны — і ваш знак будзе чакаць свайго «выхаду ў свет» у ДАІ, пакуль вы не набудзеце аўтамабіль. І яшчэ: зарэгістраваць аўтамабіль можа і чалавек, які не мае правоў. Сам садзіцца за руль ён у гэтым выпадку не мае права, а вось любавацца ім штодзень у гаражы ці даць паездзіць сыну, брату ці свату, якія маюць права на кіраванне, — чаму б і не. Гэта ўжо яго справа.

— Што датычыцца рэгістрацыі (перарэгістрацыі) аўтамабіля, то на гэта, як вядома, даецца 10 дзён з моманту пакупкі (рэгістрацыі па новым месцы жыхарства)...

— За парушэнне гэтых тэрмінаў часткай 5 артыкула 18.12 адміністрацыйнага кодэкса прадугледжана папярэджанне ці штраф у памеры да 2 базавых велічыняў. Хочацца яшчэ раз нагадаць чытачам «Звязды», што кіраваць аўтамабілем, на якім няма аўтанумароў, забаронена.

— Раней, калі папрасіў у добрага знаёмага аўтамабіль, напрыклад, каб праведаць маці ў вёсцы, трэба было пісаць даверанасць. Цяпер, наколькі я ведаю, гэта не абавязкова.

— Сапраўды, цяпер уласнік можа перадаць сваё аўто ў часовае карыстанне без распіскі. Праўда, тут ёсць адно але. Калі раптам супрацоўнікі ДАІ спыняць вашага знаёмага ў стане алкагольнага ап'янення ці без правоў, то адказваць давядзецца не толькі чалавеку, які сядзеў за рулём, але і таму, на каго гэты аўтамабіль аформлены.

— Цяпер многія, замест таго, каб законна перааформіць аўтамабіль у ДАІ, набываюць яго па даверанасці.

— Я не раіў бы так рабіць. Ад гэтага можа пацярпець і адзін і другі. Па першае, пакупнік, бо ён рызыкуе набыць шыла ў мяшку — аўтамабіль, які знаходзіцца ў вышуку.

Па-другое, прадавец, бо калі, не дай Бог, здарыцца нешта сур'ёзнае, напрыклад, кіроўца здзейсніў ДТЗ, а пасля ўцёк з месца здарэння, то прэтэнзіі будуць прад'яўляцца, у першую чаргу, да ўласніка.

Надзея ДРЫЛА.

СТУДЗЕНЬСКАЯ МАЗАІКА

З 20 па 28 студзеня ў краіне праходзіць спецыяльны комплекс мерапрыемстваў «Вучэбны аўтамабіль». Падчас рэйдаў інспектары ДАІ праверацьтэхнічны стан транспартных сродкаў аўташкол, фізічны стан майстроў па навучанні кіраванню. Асаблівую ўвагу звернуць на магчымыя факты прыпіскі гадзін заняткаў, выкарыстання вучэбнага транспарту не па прызначэнні, невыканання майстрамі правілаў дарожнага руху.

❑

На працягу двух першых месяцаў года сярод школьнікаў Гродна праходзіць конкурс відэаролікаў на тэму бяспекі дарожнага руху. Гэта ініцыятыва звязаная ў першую чаргу з тым, што летась у абласным цэнтры павялічылася колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей.

❑

У Брэсцкай вобласці стартавала буйнамаштабная акцыя «ДАІ і БМВ разам за бяспечныя дарогі». Картэж з 20 аўтамабіляў БМВ разам з інспектарамі ДАІ ўжо наведалі пасёлак Сонечны, што ў Пружанскім раёне. Наступны аўтапрабег запланаваны ў Пінск.

❑

27 студзеня пройдзе тэматычная экскурсія ў ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама для студэнтаў мастацкага вучылішча. Юныя дызайнеры, мастакі і скульптары змогуць пазнаёміцца з тэхнікай, якая сёння выкарыстоўваецца для кантролю за кіроўцамі: вымяральнікі хуткасці, прыборы відэафіксацыі... Ахвотныя змогуць паспрабаваць сябе ў ролі дыктара пры дапамозе рэпрадуктара, таксама ім будзе паказана карта горада, дзе акрэслены найбольш аварыйныя ўчасткі.

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

МАРОЗ — СЛУЖБЕ НЕ ПЕРАШКОДА

Цяперашняя зіма падносіць сюрпрызы ў выглядзе моцнага марозу не толькі вадзіцелям, але і супрацоўнікам Дзяржаўтаінспекцыі. Нягледзячы на тое, што многія аўтамабілі, асабліва дызельныя, у такі час «на прыколе», аўтамабільны паток ў наваколлі сталіцы не зменшыўся. У такі час вартавым дарог можна толькі паспачуваць. Холад прабірае да касцей! Але ж міліцыянеры сцвярджаюць, што яны прывыклі несці службу ў любое надвор'е.

Карэспандэнт «Звязды» ўпэўніўся ў гэтым падчас кароткачасовага «дзяжурства» з інспектарамі ДАІ Мінскага раёна капітанамі міліцыі Аляксандрам Комлевым і Віталем Прыбалаўцом, якія сачылі за парадкам на ўчастку Слабада — Радашковічы, што мяжуе з алімпійскім спартыўным комплексам Раўбічы. З улікам таго, што праз гэтае месца праходзяць маршруты многіх аўтобусаў Мінск-2 і з трасы, якая вядзе з Віцебска, інтэнсіўнасць руху вельмі высокая. А вось наконт магчымага перавышэння хуткаснага рэжыму паклапоціцца радар.

Супрацоўнікі ДАІ паказваюць, што ён без праблем паказвае выбраную вадзіцелямі хуткасць і ў траскучы мароз. Праўда, зазначаюць інспектары ДПС, у такое надвор'е аўтааматары стараюцца не ліхачыць, бо на дарозе можа быць галалёд. Калі ж у іх поле зроку трапляецца «шумахер», то ён у абавязковым парадку будзе спынены. Толькі ад паводзінаў вадзіцеля будзе залежаць: атрымае ён папярэджанне ці квітанцыю на аплату штрафу.

Мароз жа службе не перашкода, сцвярджаюць вартавыя дарог. Калі што — можна і ў валёнкі пераабуцца. Хоць за рулём неабходна ездзіць у форменным абутку.

Вольга ВАЛОГА, інжынер-праграміст ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама:

«РЭГУЛЯВАЛА Б УСЁ СВАЁ ЖЫЦЦЁ»

Фота Сяргея САВЕЛЬЕВА.

Прыгажуня, разумніца Вольга Сяргееўна Валога — старшы лейтэнант міліцыі, захапляецца кветаводствам, шмат чытае і займаецца фізкультурай. Прама як у тым папулярным фільме: «камсамолка», спартсменка і проста прыгажуня.

Служыць прыгажуня ў радах ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама. Займае пасаду інжынера — праграміста аддзялення па эксплуатацыі аўтаматызаваных сістэм ДАІ пры УУС. А раней служыла ў Дубровенскім раёне, які побач з яе малой радзімай — Оршай.

Менавіта ў глыбінцы мы з ёй і пазнаёміліся. Даволі нечакана — у Доме культуры вёскі Ляды. Яна спявала на сцэне. Ды так добра выконвала песні сучасных аўтараў, адразу і не паверыў, што яна афіцэр міліцыі. А потым з задавальненнем назіраў за яе выступленнямі на сцэне ў іншых месцах. Яна пажаданая ўдзельніца самых розных акцый. У Полацку ў Дзень маці выступала ў жанры пародыі. А раней, у Віцебску, — на цырымоніі акцыі «Грамадзянская мужнасць», падчас ушанавання нераўнадушных людзей, якія дапамаглі міліцыі, усіх прысутных уразіла майстэрствам мяняць вобраз і весяліць.

— Калі я ўпершыню выйшла на сцэну? Я ж з пяці гадоў у дзіцячым садку спявала. А потым займалася ў аршанскім Доме культуры чыгуначнікаў у тэатры эстрадных мініяцюр, — распавядае «Звяздзе» абаяльная Вольга Сяргееўна. — Чаму не пайшла ў артысткі? Я ж артыст народнага тэатра. І пасведчанне адпаведнае ёсць.

Мой тата служыў у міліцыі. Цяпер ён пенсіянер МУС. А сястра мая судовы выканаўца. У нас складваецца сямейная традыцыя — служыць закону.

Я яшчэ ў школьныя гады вырашыла служыць Радзіме, ахоўваць парадак, дапамагаць людзям у складаных жыццёвых сітуацыях. Пасля завяршэння вучобы ў школе паступіла ў Мінскую акадэмію міліцыі, дзе атрымала адукацыю юрыста.

— Памятаецца, у пазамінулым годзе падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» рух на дарогах рэгулявалі жанчыны. Вы былі сярод іх?

— Так. Рыхтаваліся мы рэгуляваць рух некалькі месяцаў. І амаль штодня ездзіла практыкавацца ў Віцебск з Дубровенскага раёна.

Думаю, што рэгуляваць добра навучылася. Мне гэта было зусім няцяжка. Наадварот, вельмі цягне зноў на дарогу рэгуляваць рух. Ужо пасля «базару» праз нейкі выпрацаваны «рэфлекс», калі пераходзіла дарогу, спыняла рукой аўтамабілі.

— А ў вас ёсць уласны аўтамабіль?

— Пакуль што няма.

— Безумоўна, у такую прыгажуню-рэгуляроўшчыка немагчыма было не закахацца.

— Я замужам (яшчэ года няма). Муж Уладзімір таксама міліцыянер. Пакуль што служыць у Дубровенскім раённым аддзеле міліцыі, дзе мы з ім і пазнаёміліся.

Калегі вельмі цэняць Вольгу за яе сціпласць (па-за сцэнай), адкрытую душу. Ад імя «Звязды» хочацца ёй пажадаць далейшых поспехаў на службе, каб з задавальненнем вярталася з працы дамоў і наадварот.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕРАДАВЫ ВОПЫТ

«ПАЛІЦЭЙСКІХ» У ВІЦЕБСКУ БУДУЦЬ... НАСІЦЬ

У Віцебску, для таго, каб зменшыць колькасць выпадкаў гібелі і раненняў пешаходаў, пачнуць выкарыстоўваць так званыя прыўзнятыя пешаходныя пераходы (шырокія і прыўзнятыя «ляжачыя паліцэйскія»), якіх можна... пераносіць з месца на месца.

Як адзначыў «Звяздзе» **Юрый ГЕРМАНАЎ, начальнік аддзялення ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама**, такія пешаходныя пераходы будуць выхоўваць вадзіцеляў — аматараў хуткай язды, парушальнікаў правілаў дарожнага руху, якія не будуць ведаць, дзе ў наступны раз пакладуць канструкцыю. І, хутчэй за ўсё, у выніку ў іх выпрацуецца рэфлекс.

ДАРОГА НЕ ЦЕРПІЦЬ АЛКАГОЛЮ

У добрай тэндэнцыі да памяншэння колькасці аўтааварый і іх ахвяраў ёсць лыжка «дзёгцю» — п'яныя вадзіцелі.

Начальнік Магілёўскай ДАІ Віктар Волкаў назваў першую прычыну дарожных здарэнняў — кіраванне транспартам у нецвярозым стане. Колькасць ахвяраў п'яных вадзіцеляў павялічваецца. Летась у Магілёўскай вобласці яны сталі віноўнікамі 129 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 29 чалавек загінулі і 178 атрымалі траўмы.

— Страшна, што ў большасці выпадкаў менавіта цалкам цвярозыя і дысцыплінаваныя ўдзельнікі дарожнага руху церпяць па віне ахвяраў «вогненнай вады», — зазначыў Віктар Волкаў.

Вось некалькі прыкладаў. У лістападзе ў Магілёве 35-гадовы нецвярозы вадзіцель на аўтамабілі «ГАЗ» дагнаў і стукнуў аўтобус, потым выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з «Лексусам». У выніку п'яны вадзіцель і яго пасажыры, жанчына і падлетак, атрымалі траўмы і былі шпіталізаваныя.

У снежні ў Шклове адбыліся адна за адной дзве аварыі па віне нецвярозых вадзіцеляў. Каля гадзіны ночы п'яны 18-гадовы шкловец за рулём «ВАЗ-2106» не заўважыў на дарозе і наехаў на 45-гадовага веласіпедыста. Мужчына памёр на месцы, а вадзіцель з месца здарэння збег.

Віноўніка гэтага здарэння хутка знайшлі, і ўвесь горад Шклоў ведаў пра пошукі п'янага вадзіцеля. Аднак гэта зусім не перашкодзіла праз некалькі дзён выпіць і зноў-такі сесці за руль аўтамабіля «ВАЗ-2106» 28-гадоваму шклоўцу, які наехаў на 58-гадовага пешахода.

Не меншую небяспеку для дарожнага руху ўяўляюць і нецвярозыя пешаходы. П'янства пешаходаў стала прычынай 28 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінулі 7 чалавек і параненыя 23.

Зусім не адзінкавымі летась былі выпадкі, калі п'яніцы папросту клаліся адпачываць на праезнай частцы. Напрыклад, у кастрычніку ў Хоцімскім раёне каля 18 гадзін 62-гадовы вадзіцель на «ВАЗе» наехаў на 50-гадовага мясцовага жыхара, які ляжаў на дарозе.

— Таму ў 2010 годзе мы будзем яшчэ больш настойліва займацца прафілактыкай, — падвёў вынік кіраўнік Магілёўскай ДАІ. **— Гутарыць, пераконваць, паказваць страшныя кадры аварый. Карацей — давядзіць да свядомасці людзей, што п'янства ўдзельнікаў дарожнага руху вядзе да бяды.**

Ілона ІВАНОВА.

ЗА ПАРАДАК — НА ПРАСПЕКЦЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Інспектар ДПС спецпадраздзялення па забеспячэнні дарожнай бяспекі УДАІ Мінска **Сяргей ШАБЛЫКА** (справа) атрымаў ганаровае званне найлепшага інспектара-2009 у сталіцы. Сёння разам са сваім напарнікам інспектарам **Іванам ШАКУНОМ** яны сочаць за парадкам на галоўным сталічным праспекце краіны — праспекце Незалежнасці.

Аляксандр ЛЕНЕЦ, намеснік начальніка УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама:

НЕ ТОЛЬКІ КАРАЦЬ, АЛЕ І ПЕРАКОНВАЦЬ

Тэматыка бяспекі дарожнага руху прысутнічае на ўпакоўцы прадуктаў прадпрыемстваў Гродзеншчыны

Перад пачаткам прэс-канферэнцыі ва ўпраўленні ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама журналістаў азнаёмілі з даволі незвычайнай экспазіцыяй. На ёй дэманстраваліся не толькі розныя варыянты памятак па бяспецы дарожнага руху, але і ўзоры прадукцыі шэрагу прадпрыемстваў вобласці (хлеб, смятана, сыр, сметанковае масла, спіртныя напоі і іншыя вырабы) з папераджальнымі заклікамі на ўпакоўцы: «ДАІ інфармуе. Увага! Пазнач сябе на дарозе», «Выпіў — не сядай за руль».

— Наша праца не абмяжоўваецца толькі прымяненнем адміністрацыйных мераў, пакараннем удзельнікаў дарожнага руху, якія здзейснілі парушэнне, — расказвае намеснік начальніка Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі Аляксандр ЛЕНЕЦ. — Вялікую ўвагу надаём прафілактычным мерапрыемствам. Першымі ў ліпені мінулага года сацыяльную рэкламу па тэме бяспекі дарожнага руху на ўпакоўках сваёй прадукцыі размясцілі адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гроднахлебапрадукт», «Малочны свет», «Гродзенскі мясакамбінат» і «Гродзенскі лікёра-гарэлачны завод «Nemanoff». Затым гэту ініцыятыву падтрымалі Бераставіцкі камбінат бытавога абслугоўвання, Дзятлаўскі віна-гарэлачны і Слонімскі вінны заводы. Мяркуем, што неўзабаве гэта сацыяльная рэклама з'явіцца і на ўпакоўках іншай прадукцыі.

Гэта таксама датычыцца і такіх прафілактычных акцый, як «Стань больш прыкметным!», «Прышпілі ся!», «Хочаш пагаварыць — спыні ся!», «Увага, дзеці!», «Дзеці-пасажыры», «Хуткасць», «Асцярожна — пешаход!», «П'яны пешаход!»...

— Трэба выхоўваць не толькі вадзіцеляў, але і пешаходаў?

— Так, узровень аварыйнасці з удзелам пешаходаў па-ранейшаму застаецца высокім. Летась на тэрыторыі Гродзеншчыны ў здарэннях 57 чалавек загінулі і 232 атрымалі раненні рознай цяжкасці. Пры гэтым у 62 выпадках пешаходы не былі пазначаныя святловяртальнымі элементамі. Здараецца і так, што аўтамабіль наязджае на ляжачага на дарозе п'янага пешахода, якога вадзіцель не бачыць. У мінулым годзе па віне нецвярозых пешаходаў адбылося 46 аўтааварый, у якіх 15 чалавек загінулі і 32 атрымалі траўмы.

— Як збіраецеся ўплываць на гэту сітуацыю?

— Па-першае, заканадаўствам узмацняюцца патрабаванні да выкарыстання пешаходамі флікераў, што дасць большую прастору для дзейнасці супрацоўнікаў ДПС. Па-другое, сёлета адным з прыярытэтаў для супрацоўнікаў ДАІ будзе праца з катэгорыяй пешаходаў, якія могуць стаць віноўнікамі і ахвярамі вышэйзгаданых аварый на дарогах — тыя, хто ўжо затрымліваўся ў нецвярозым стане, знаходзіцца на ўліку ў нарколагаў. Мяркую, што разам з намі ў гэтым прафілактычным кірунку будуць працаваць і работнікі іншых службаў міліцыі.

— У Гродзенскай ДАІ ўжо ёсць досвед супрацоўніцтва з вадзіцелямі аўтамабіляў, матацыклаў. Чаго пакуль не скажаш пра веласіпедыстаў, многія з якіх лічаць, што для іх на дарогах пакуль не створаны неабходныя ўмовы...

— Сапраўды, мы праводзім актыўную працу па ўмацаванні даверлівых адносінаў з вадзіцелямі, у тым ліку схільнымі да экстрэмальнай язды, каб сфарміраваць у іх пазітыўнае стаўленне да выканання патрабаванняў Правілаў дарожнага руху і дзейнасці Дзяржаўтаінспекцыі. Напрыклад, летась разам з аддзелам моладзі аблвыканкама і актывістамі БРСМ арганізавалі чатыры этапы «Адкрытага кубка г. Гродна па хуткасным манеўраванні на аўтамабілях». Наладжана цеснае супрацоўніцтва з мотаклубам «Насарогі», на базе Бераставіцкага, Воранаўскага, Ваўкавыскага, Лідскага, Навагрудскага, Астравецкага, Слонімскага, Смаргонскага, Шчучынскага РАУС і ў абласным цэнтры праводзіліся конкурсы прафесійнага майстэрства матацыклістаў.

Што датычыцца веласіпедыстаў... У мінулым годзе па іх віне адбылося 37 дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх 10 чалавек загінулі і 26 — атрымалі раненні. Так, можна і трэба ставіць пытанне аб паляпшэнні дарожных умоў для язды на веласіпедах. Праблемы тут ёсць, і праца ў гэтым кірунку вядзецца. У прыватнасці, летась пешаходныя і веласіпедныя дарожкамі абсталяваныя 26 кіламетраў загарадных аўтадарог, гэта праца будзе працягвацца і сёлета. Інтарэсы веласіпедыстаў будуць улічаны і пры праектаванні новых мікрараёнаў у Гродне, там будуць абсталяваныя дарожкі і ўсталяваныя адпаведныя знакі. Але, разам з тым, неабходна строга выконваць Правілы дарожнага руху.

— Калі ж гэтыя нормы тым ці іншым удзельнікам дарожнага руху не выконваюцца, то «арбітрам» выступае не толькі ДАІ, але відэаназіранне?

— Так, ёсць праблемныя ўчасткі дарог, перакрыжаванні, дзе складана даказаць парушэнне Правілаў дарожнага руху, асабліва пры адсутнасці сведак. Таму ў абласным цэнтры ўжо вызначаны месцы для ўстаноўкі камер відэаназірання, каб мець доказы, з якімі не паспрачаешся. Пры гэтым па-ранейшаму ў праблемных сітуацыях будуць выкарыстоўвацца і сістэмы відэаназірання, якімі абсталяваныя многія будынкі і якія нярэдка «захопліваюць» і праезную частку.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Адказныя за спецвыпуск Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Надзея ДРЫЛА.

Пытальнік

КРЭДЫТ НА АЎТАМАБІЛЬ — БЕЗ ПРАБЛЕМ!

Яшчэ нядаўна вельмі папулярнымі былі валютныя крэдыты на аўтамабілі, якія можна было атрымаць практычна ў любым банку. А якая сітуацыя з аўтакрэдытаваннем цяпер?

І.І. ШЫМКО, *г. Мінск*

Паважаны Іван Іванавіч, пры вялікім жаданні атрымаць крэдыт, праўда ў беларускіх рублях, на пакупку аўтамабіля можна і зараз. Праўда, не ў любым банку. Напрыклад, «Белсвісбанк» такую паслугу не аказвае. А вось «ВТБанк» можа прапанаваць вам аформіць крэдыт: на новае аўто — да 80 % грошай ад намінальнага кошту машыны з растэрміноўкай на 5 гадоў. Пры гэтым працэнтная стаўка банка — 24,9 працэнта гадавых. На патрыманае аўто — 75 %. Пры гэтым, калі крэдыт будзе аформлены тэрмінам да 5 гадоў, банкаўская стаўка за год складзе 24,9 %, калі на большы тэрмін — то 26,9 %.

Магчыма, вам больш прывабнымі здадуцца прапановы «МТБанка», для якога аўтакрэдытаванне з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў. Цяпер крэдытны работнік гэтай банкаўскай установы вызначае гнуткая шкала ставак (ад 23,9 %). Крэдыт таксама выдаецца тэрмінам да 5 гадоў на набыццё новых аўто і да 3 гадоў на патрыманыя машыны.

Увогуле, аўтакрэдытаванне на банкаўскім рынку нашай краіны паранейшаму застаецца папулярным відам паслуг з вельмі шырокім відам прапаноў. Важна праявіць настойлівасць і атрымаць, напрыклад, па тэлефоне альбо інтэрнэце за лічаныя гадзіны ўсю неабходную інфармацыю.

«АЎТАЎРАГАН» ВЫЛІЧЫЦЬ ПАРУШАЛЬНІКА

Калі вашу машыну прыпыніў інспектар ДАІ і адразу, не пабачыўшы пасведчання, звярнуўся да вас па імені-прозвішчу, значыць, вы чамусьці трапілі ў поле зроку «Аўтаўрагана».

Цяпер і гомельскім кіроўцам аўто, якія не лічацца з правіламі дарожнага руху, не пазайздросціш. Апаратна-праграмныя комплексы пачалі праверку аўтатранспарту на добранадзейнасць.

Партатыўны сканер са знешняга выгляду — звычайны ноўтбук. Праўда, каштуе значна даражэй. У набыцці такога суперкамп'ютара супрацоўнікам ДАІ дапамаглі гомельскія ўлады.

— Так, прыбор вельмі каштоўны, але ён таго варты, — абсалютна ўпэўнены часовы выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення ДАІ Гомельскага аблвыканкама Ігар Макушэнка. **— Ён акупіцца хутка і адпрацуе ўкладзеныя ў яго грошы.**

«Аўтаўраган» выкарыстоўваецца падчас патрулявання дарог. Прыбор «бачыць» адразу тры паласы сустрэчнага і спадарожнага руху пры хуткасці да 150 км/ч. Пры праходжанні любой машынай зоны кантролю відэакамера «чытае» ўсе нумарныя знакі запар. Відэавыява трапляе ў камп'ютар, дзе і адбываецца распазнаванне рэгістрацыйных знакаў, праводзіцца імгненная праверка машыны па падключаных базах звестак, і аператару выдаецца пэўнае паведамленне. База звестак змяшчае інфармацыю пра ўсе праблемныя машыны. Гэта тыя, якія лічацца ўкрадзенымі, у якіх пратэрмінаваны тэхагляд, пратэрмінаваная ці падробленая страхоўка. Асобна вызначаюцца кіроўцы, якія пазбаўленыя пасведчанняў або неаднаразова траплялі ў поле зроку ДАІ нецвярозымі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

БІЗНЭС РЫХТУЕ НОВУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПЛАТФОРМУ — КАМПАКТНУЮ І ЧЫТЭЛЬНУЮ

Дзелавая супольнасць працягвае працу над Нацыянальнай платформай бізнэсу Беларусі на 2010 год. На апошнім пасяджэнні каардынацыйнага савета па развіцці і прасоўванні платформы Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, акрэсліў асноўную канцэпцыю новай платформы:

— Чаканні дзелавой супольнасці вельмі вялікія, таму платформа павінна быць кампактнай, павінна быць чытэльнай, больш успрымальнай. Шэраг пытанняў, якія мы не вырашылі ў папярэдніх платформах, павінны быць вынесеныя з раздзелаў у спецыяльны спіс нявырашаных, але не страціўшых актуальнасці пытанняў. Такім чынам мы сканцэнтруем увагу на паўсотні асноўных рэальных пытанняў, — лічыць Уладзімір Карагін.

Цікава, што на асамблею дзелавых колаў, якая мусіць адбыцца 3 сакавіка і на якой будзе шырока абмяркоўвацца Нацыянальная платформа бізнэсу Беларусі-2010, ужо пачынаюць запісвацца некаторыя высокія чыноўнікі. Прынамсі, Уладзімір Карагін паведаміў, што да асамблеі праяўляецца вялікая цікавасць — паабяцаў быць асабіста новы міністр эканомікі, а таксама адзін са спікераў парламента.

Сёння ж члены каардынацыйнага савета працуюць над фармулёўкай канкрэтных пытанняў, што ўвойдуць у Нацыянальную платформу. Ужо вядома, што асобна будуць вынесеныя дзесяць самых важных задач, і што да яе дададуць падрабязную аналітычную запіску. Пакуль дакладна невядома, але наўрад ці асобным раздзелам пойдуць праблемы рэгіёнаў.

— На першым пасяджэнні мы казалі, што ў нашай платформе не хапае рэгіянальнага аспекту. Але прама скажам, што ніякіх геніяльных канструктыўных ідэй пакуль з рэгіёнаў выціснуць не ўдалося, — сказаў Уладзімір Карагін. — Яны кажуць, што платформа не адлюстроўвае рэгіянальных асаблівасцяў. Але якія праблемы ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і іншых абласцях? Яны пакуль не выяўлены, і калі мы пачынаем пытаць у рэгіянальных асацыяцый, то ўсе называюць праблемы не мясцовага, а рэспубліканскага ўзроўню...

Спецыяльна для Нацыянальнай платформы-2010 будзе праведзена даследаванне праблем індывідуальных прадпрымальнікаў. Зараз распрацоўваюцца анкеты, а потым усе рэгіянальныя бізнэс-асацыяцыі правядуць апытанне сярод ІПшнікаў. «Такім чынам мы рэальна адлюструем праблемы ІП — выпукла і дакладна», — лічыць Уладзімір Карагін.

Дарэчы, непасрэдна перад пасяджэннем каардынацыйнага савета па развіцці і прасоўванні платформы адбылася рэспубліканская селектарная нарада ГА «МССПіІП» і Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.

— Сёння ўлада дастаткова адкрытая для працы з намі па ўсіх пытаннях, але цяпер склалася іншая сітуацыя — ёсць моманты нашай негатоўнасці працаваць на ўзроўні асобна ўзятага міністэрства, — лічыць **Віктар МАРГЕЛАЎ, сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.** — З аднаго боку, глабальныя пытанні не вельмі добра вырашаць за тры дні, але з іншага боку, або мы спрабуем узяцца за вырашэнне якога-небудзь пытання, альбо яно, скажам, будзе яшчэ гады на два адсунутае. Зразумела, што ў кожнага свае праблемы, але калі мы не зможам наладзіць механізм фарміравання рашэнняў, то мы не зможам быць дастойнымі партнёрамі з урадам, а значыць і вынікі нашай сумеснай працы будуць не тыя, на якія мы маглі б разлічваць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

НАН БЕЛАРУСІ — МАКСІМАЛЬНАЕ ЗБЛІЖЭННЕ З ЭКАНОМІКАЙ

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі істотна розніцца ад іншых аналагічных устаноў на постсавецкай прасторы, бо ідзе па шляху максімальнага збліжэння з эканомікай. Пра гэта паведаміў намеснік Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей РАХМАНАЎ.

Паводле яго слоў, сур'ёзныя змяненні адбыліся ў акадэміях навук усіх постсавецкіх краін, многія акадэміі перасталі існаваць ці сталі грамадскімі арганізацыямі. «Мы пайшлі па своеасаблівым шляху, — адзначыў Рахманаў. — Не адмаўляючыся ад фундаментальных даследаванняў, якімі мы займаліся заўсёды, імкнёмся максімальна наблізіцца да эканомікі, увайсці ў праблематыку яе галін і пастарацца зрабіць усё для таго, каб яны развіваліся эфектыўна. Сёння акадэмія навук удзельнічае ва ўсіх сур'ёзных праектах, якія рэалізуюцца ў краіне, з нашымі спецыялістамі кансультуюцца, і менавіта таму мы адчуваем сябе ў максімальнай ступені запатрабаванымі».

У акадэміі пастаянна павялічваюцца пазабюджэтныя даходы. Пры запланаваным аб'ёме фінансавання на 2010 год у памеры 1 трлн рублёў доля пазабюджэтных сродкаў павінна перавысіць 30 працэнтаў. Навукова-практычныя цэнтры і навукова-вытворчыя аб'яднанні, створаныя пры акадэміі навук, а таксама вытворчыя навуковыя ўчасткі на некалькі сотняў млрд рублёў у год. «Гэтая тэндэнцыя ўзмацняецца, што дазволіць нам выйсці на сур'ёзнае павелічэнне экспартных паставак, — патлумачыў намеснік Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі. — Мы плануем выйсці на некалькі дзясяткаў мільёнаў долараў экспарту».

Рахманаў нагадаў, што наша дзяржава абрала інавацыйны шлях развіцця і познаёміў з некалькімі асабліва важнымі комплекснымі праектамі, якія канкурэнтаздольныя на сусветным рынку.

У тым ліку распрацоўкі святлодыёднай тэхнікі, якую нездарма называюць тэхнікай будучыні. Яна заснавана на выкарыстанні нанатэхналогій. Сёння Беларусь мае адзін з самых лепшых цэнтраў на постсавецкай прасторы. Святлодыёдныя свяцільні, якія ўжо сёння выпускаюцца ў Беларусі, у 10 разоў больш эканамічныя, чым звычайныя лямпачкі напальвання. Якасная святлодыёдная свяцільня можа працаваць больш за 10 гадоў. За гэты час спатрэбілася б памяняць сотні звычайных лямпачак напальвання ці дзясятак люмінесцэнтных, падкрэсліў сп. Рахманаў. Пры гэтым эканоміцца вялікая колькасць электраэнергіі. Святлодыёднае асвятленне радыкальна адрозніваецца ад звычайнага — яго інтэнсіўнасць можна змяняць ад нуля да 100 працэнтаў шляхам камп'ютарнага кіравання. Напрыклад, пры замене на святлодыёдныя свяцільні ліхтароў на кальцавой аўтамагістралі, можна атрымаць значны эканамічны эфект, бо свяціць у поўную сілу такія ліхтары будуць толькі перад набліжэннем машыны, а ў астатні час будуць знаходзіцца ў рэжыме мінімальнага асвятлення. Гэта вельмі скіраванае выпраменьванне, падкрэсліў Рахманаў. У гэтым сэнсе яно нагадвае найлепшыя ўзоры лазернага асвятлення, але без негатыўных эфектаў уздзеяння. «Сёння, калі вы едзеце па кальцавой, нашы ліхтары асвятляюць найбліжэйшы лес, можна нават грыбы збіраць. Гэта гаворыць аб тым, што нерацыянальна расходуецца светлавая энергія. Святлодыёдныя свяцільні асвятляюць менавіта тыя ўчасткі, якія неабходна асвятляць».

Яшчэ адзін важны момант выкарыстання святлодыёдаў датычыцца раслінаводства. «Святло Сонца ініцыюе фотахімічны сінтэз, на якім заснавана ўсё жыццё на нашай планеце, — нагадаў навуковец. — Аднак пэўны спектр сонечнага выпраменьвання шкодны і для жывых арганізмаў. Калі б у нас не было ахоўнай атмасферы і магнітасферы, жыццё на Зямлі не ўзнікла б. Святлодыёднае асвятленне дазваляе выключыць адмоўныя бакі асвятлення і, дзякуючы гэтаму, мы можам рэалізоўваць такія працэсы, якія, напрыклад, забяспечаць выспяванне таматаў ва ўмовах Беларусі. Па якасці яны не будуць саступаць лепшым гатункам памідораў, якія вырошчваюцца ў паўднёвых рэгіёнах... У не вельмі далёкай перспектыве ў нас у кватэрах, на нашых кухнях будуць міні-біялагічныя комплексы са святлодыёдным асвятленнем, і мы штодзень зможам зрываць з нашай хатняй градкі свежую зеляніну і гародніну».

Асобны блок даследаванняў займаюць работы ў галіне водападрыхтоўкі. Дзякуючы распрацоўкам спецыялістаў акадэміі навук, мы сёння маем тэхналогіі на ўзроўні найвышэйшых сусветных стандартаў. У прыватнасці — унікальныя палімерныя валокны, якія валодаюць адначасова іонаабменнымі і фільтравальнымі якасцямі. Гэта значыць, што валокны затрымліваюць бруд і замяняюць шкодныя іоны, што могуць утрымлівацца ў вадзе, на карысныя, патлумачыў Рахманаў. Паводле яго слоў, на базе такіх валокнаў, якія, між іншым, выпускаюцца толькі ў некалькіх краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі, можна ствараць унікальныя сістэмы водападрыхтоўкі, якія могуць прымяняцца як у побыце, так і ў прамысловых маштабах. Вучоны паведаміў, што беларускімі распрацоўкамі зацікавіліся расіяне (канкрэтна — карпарацыя «Раснанатэх»). Цяпер разглядаецца пытанне аб стварэнні ў Беларусі аднаўленчага цэнтра. Святлодыёдныя свяцільні асвятляюць менавіта тыя ўчасткі, якія неабходна асвятляць».

Яшчэ адзін важны момант выкарыстання святлодыёдаў датычыцца раслінаводства. «Святло Сонца ініцыюе фотахімічны сінтэз, на якім заснавана ўсё жыццё на нашай планеце, — нагадаў навуковец. — Аднак пэўны спектр сонечнага выпраменьвання шкодны і для жывых арганізмаў. Калі б у нас не было ахоўнай атмасферы і магнітасферы, жыццё на Зямлі не ўзнікла б. Святлодыёднае асвятленне дазваляе выключыць адмоўныя бакі асвятлення і, дзякуючы гэтаму, мы можам рэалізоўваць такія працэсы, якія, напрыклад, забяспечаць выспяванне таматаў ва ўмовах Беларусі. Па якасці яны не будуць саступаць лепшым гатункам памідораў, якія вырошчваюцца ў паўднёвых рэгіёнах... У не вельмі далёкай перспектыве ў нас у кватэрах, на нашых кухнях будуць міні-біялагічныя комплексы са святлодыёдным асвятленнем, і мы штодзень зможам зрываць з нашай хатняй градкі свежую зеляніну і гародніну».

Асобны блок даследаванняў займаюць работы ў галіне водападрыхтоўкі. Дзякуючы распрацоўкам спецыялістаў акадэміі навук, мы сёння маем тэхналогіі на ўзроўні найвышэйшых сусветных стандартаў. У прыватнасці — унікальныя палімерныя валокны, якія валодаюць адначасова іонаабменнымі і фільтравальнымі якасцямі. Гэта значыць, што валокны затрымліваюць бруд і замяняюць шкодныя іоны, што могуць утрымлівацца ў вадзе, на карысныя, патлумачыў Рахманаў. Паводле яго слоў, на базе такіх валокнаў, якія, між іншым, выпускаюцца толькі ў некалькіх краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі, можна ствараць унікальныя сістэмы водападрыхтоўкі, якія могуць прымяняцца як у побыце, так і ў прамысловых маштабах. Вучоны паведаміў, што беларускімі распрацоўкамі зацікавіліся расіяне (канкрэтна — карпарацыя «Раснанатэх»). Цяпер разглядаецца пытанне аб стварэнні ў Беларусі аднаўленчага цэнтра. Святлодыёдныя свяцільні асвятляюць менавіта тыя ўчасткі, якія неабходна асвятляць».

Сёння ў хірургіі ўсё часцей замест скальпеля прымяняецца лазерная тэхніка, як найбольш перадавы спосаб вядзення аперацый. Шырокае распаўсюджанне яна атрымала ў краінах Азіі, напрыклад, у Паўднёвай Карэі. Беларускія распрацоўшчыкі прапаноўваюць троххвалевыя медыцынскія хірургічныя лазеры. Такіх пакуль не мае ні адна іншая дзяржава, у тым ліку ЗША і Японія. Беларускія ўстаноўкі даюць магчымасць рабіць аперацыі рознага тыпу (на косных тканках, мяккіх, нервовых і г.д.) з выкарыстаннем аднаго прыбора, — сказаў Рахманаў. — «Першыя ўзорныя лазерныя ўстаноўкі ўжо выкарыстоўваюцца ў медыцыне, а самыя сучасныя мадыфікацыі сёлета будуць пастаўлены ў сістэму аховы здароўя. Нашымі распрацоўкамі актыўна цікавяцца замежныя калегі. Мы плануем так разгарнуць гэтую ўнікальную вытворчасць, каб пастаўляць названыя прыборы па перыферыі Беларусі. У тым ліку і ў краіны, якія лічацца высокатэхналагічнымі».

Навуковец расказаў, што знаёмаму ўсім спажыўцам штрыхавому кадзіраванню сёлета спаўняецца 30 гадоў. Гэтая тэхналогія састарэла і больш не адпавядае патрэбам сучаснага грамадства ў плане хуткасці абслугоўвання пакупнікоў, сістэмы ўліку тавару і правілаў лагістыкі. На змену ёй прыходзіць метад радыёчастотнай ідэнтыфікацыі, які дазваляе ідэнтыфікаваць тавар бескантактным шляхам. «Уявіце, пакупнік з цэлай цялежкай тавараў проста праходзіць праз рамку, якая «счытвае» сігналы ўсіх чыпаў, вызначае агульную суму пакупкі і аўтаматычна здымае яе з вашай карткі. Гэта чыста на бытавым узроўні. А калі мець на ўвазе вялікія транспартныя патокі, мытныя афармленні...»

Апошні блок, з якім пазнаёміў Рахманаў, — інфармацыйныя тэхналогіі. Ён нагадаў, што Беларусь — суперкамп'ютарная дзяржава, чые суперкамп'ютары ўваходзяць у сусветную камп'ютарную эліту.

Больш чым у 100 медустановах краіны ўкаранёныя медыцынскія інфармацыйныя сістэмы і іх кампаненты для забеспячэння якаснага медыцынскага абслугоўвання пацыентаў і аператыўнага кіравання медпадраздзяленнямі. У 2004-2008 гадах пастаўлена больш за 1200 аўтаматызаваных працоўных месцаў медыцынскіх спецыялістаў. Эфект ад імпартазамяшчэння пры гэтым склаў больш за 1200 тыс. у.а. Сумесна з беларускімі вучонымі-медыкамі была распрацаваная і ўведзеная ўнікальная для СНД размеркавальная тэлемедыцынская сістэма рэальнага часу па лічбавым флюарафотаздымку на базе 1-га і 2-га мінскіх гарадскіх супрацьтуберкулёзных дыспансэраў і 27 гарадскіх паліклінік. Гэта дазволіла павысіць аператыўнасць ранняга выяўлення хваробаў лёгкага і дало эканамічны эфект ад імпартазамяшчэння больш за 500 тыс. у.а. За кошт скарачэння дадатковых дыягнастычных даследаванняў лёгкіх эканомія бюджэтных сродкаў складае больш за 1 млрд рублёў у год.

Інга МІНДАЛЁВА.

Ну і ну!

Брытанскія мужчыны ўсё часцей карыстаюцца касметыкай сваіх партнёрак

Усё больш мужчын у Вялікабрытаніі выкарыстоўваюць касметыку, якой раней карысталіся толькі прадстаўніцы прыгожага полу.

Праведзенае сярод 2 тыс. чалавек апытанне паказала, што кожны дзясяты брытанец карыстаецца касметыкай сваёй партнёркі для таго, каб выглядаць маладым і прыгожым.

Самым папулярным аксесуарам, які мужчыны пазычаюць у жанчын, аказаўся пінцэт. Потым па папулярнасці ідуць крэм для ўвільгатнення скуры і фен. Трэць прадстаўнікоў моцнага полу раскалі, што наводзяць марафет як мінімум з трыма касметычнымі вырабамі. У дзясятку ўвайшлі таксама пілачка для пазногцяў, выпрамляльнік валасоў, штучны загар, бясколерны лак для пазногцяў, туш або аловак для вачэй, бляск для губ.

Характэрна, што трэць апытаных прызналіся, што карыстаюцца жаночай касметыкай употай. Пры гэтым 31 працэнт з жанчын, якія прынялі ўдзел у апытанні, сказалі, што выкрывалі ў гэтым сваіх партнёраў.

БЕЛТА.

НЕ пераймай!

ТРЫ ПАРЫ АБУТКУ ЗАДАРМА

Дазволіць сабе купляць абутак пад настрой можа далёка не кожны беларус. Якасныя зімовыя боты зараз каштуюць ад 300 тысяч, а калі ўзяць сям'ю з чатырох чалавек, то палічыце, колькі грошай спатрэбіцца на адзін толькі абутак. Але наш народ быў бы не нашым, каб не прыдумаў выйсце і з такой складанай сітуацыі.

Каця смела купляе боты ў фірмовых вялікіх крамах сталіцы. Рынак Ждановічы і падобныя месцы дзяўчыну ніяк не цікавяць. Па адной простай прычыне: там не даюць чэкаў і гарантыйных талонаў. Апошнія — магчымасць панасіць некалькі параў абутку за сезон. А калі пашчасціць абмяняць боты напрыканцы сезона, то і магчымасць набыць абутак на новы сезон.

— Летам я змяніла тры пары абутку. Спачатку набыла басаножкі на раменьчыках, — распавядае Каця. — Яны мне пачалі ціснуць. Галоўнае, што свайго ж памеру набыла, а ціснуць і ўсё тут. А ў іх была двухслойная падэшва. І вось яна якраз-такі і стала расслойвацца. Таму была аб'ектыўная прычына іх здаць. Пасля я набыла больш прыгожыя басаножкі на абцасах. Яны мне вельмі падабаліся. Аднак прыйшоў час ехаць у Кіеў, а з такімі абцасамі наўрад ці можна было б файна адпачыць. Так што я вырашыла іх таксама здаць. Прычапілася да таго, што, маўляў, падэшва крыху абдзіраецца. Праўда, былі праблемы: я набойкі ўжо змяніла. Але ў краме «Мегатоп» іх прынялі без пытанняў.

— На маіх басаножках адноўчы пачало разыходзіцца шво, — расказвае Вера. — І калі б я прыйшла толькі з гэтай прэтэнзіяй, мне адмовілі б. Маўляў, не дурыце галавы, пакуль не разышлося. Тут заканчваецца лета. Я сабе думаю, а навошта мне гэтыя басаножкі? І крыху дапамагла разысціся гэтаму шву. Быў яшчэ адзін выпадак. Я абула шлёпанцы толькі другі раз, у аўтобусе мне на нагу наступіў хлопец. І яны парваліся. Я, як нічога не было, пайшла ў краму і з незалежным выглядам іх памяняла.

— Паношаны абутак можна рэанімаваць, — расказвае Святлана, — трэба толькі звярнуцца ў абутковую майстэрню. Мая сяброўка пранасіла восеньскія боты на шпільцы цэлы тыдзень, а пасля зразумела, што яны ёй не падыходзяць. Аддала іх у абутковую майстэрню, дзе вельмі прасіла прывесці іх у такі выгляд, каб яны былі як новыя. І ёй дапамаглі: памазалі падэшву нейкай вадкасцю, падфарбавалі абцасы і ўсё. Памяняла без праблем .

— Лепш за ўсё мяняць абутак у вялікіх камерцыйных крамах, — расказвае Лена. — Яны баяцца за сваю рэпутацыю, таму скандаліць і сварыцца з вамі не будуць. Ім прасцей яго абмяняць ці вярнуць вам грошы.

Галоўнае, па словах дзяўчат, гэта мець пры сабе чэк, здаваць абутак у гарантыйны тэрмін, а таксама па-сапраўднаму верыць у тое, што ты маеш рацыю.

У абутковых крамах не вельмі раздзяляюць аптымістычныя настроі «мянял». Але і інфармацыю пра такія выпадкі даюць неахвотна.

— Так, ёсць такія людзі, прыходзяць, — расказваюць мне ў краме «Axis». — Але я вам не магу сказаць, на што скардзяцца, якія боты здаюць. Стараемся змагацца з такімі кліентамі.

— Да нас прыходзяць часам такія людзі, — расказвае прадавец крамы «Чаравічкі». — Бывае, што і скандаляць, скаргі пішуць. Гэта ад таго, што людзі хочуць часта абутак мяняць. Некаторых мы ўжо ведаем у твар. А што рабіць? Пакупнік жа заўжды «мае рацыю». Адпраўляем на экспертызу.

У Мінскім таварыстве спажыўцоў паведамілі, што адміністрацыйнага пакарання для «мянял» не прадугледжана.

— Прыносяць да нас абутак, і нярэдка бачна, што ён быў пашкоджаны наўмысна, — расказвае эксперт таварыства, — Але заўважыць гэта можна не заўжды. Асабліва калі дэфект зроблены прафесіяналам у абутковай справе.

А вось розныя «парывы», «парэзы» і іншыя пашкоджанні па віне пакупніка эксперт адрозніць адразу. І тады грошы за праведзеную экспертызу будзеце плаціць вы, а не крама.

Настасся ЗАНЬКО.

МЕРКАВАННЕ:

— Увогуле такая практыка абмену некалькіх ботаў за сезон, на мой погляд, з'явілася ад нашай беднасці, — кажа Кацярына. — Таму што наш абутак каштуе столькі ж, колькі і італьянскі. Наш — якасны абутак, я не спрачаюся, але прабачце, ён зроблены ў Беларусі, а не ў Італіі і павінен быць ужо хоць бы з-за гэтага таннейшы.

Георгій МАРЧУК

АФАРЫЗМЫ

Ганебна нажытае багацце ганебна і выкарыстоўваецца.

Час узвялічвае мастака. Чым далей ён ад нас, тым больш значнымі здаюцца нам яго творы.

Старыя губляюць кантроль над часам — гэта натуральна. Маладыя губляюць кантроль над часам — нічога не дасягнуць.

Ніхто яшчэ не вызначыў тую прычыну, па якой людзі адчуваюць закаханасць.

Хто ганарысты, той і зайздросны.

Слава аднаго перашкаджае славе іншага. Заганы ж аднаго не перашкаджаюць заганам іншага.

Хто намагаецца да ўсяго дадаць сэнс — той мудрэц.

Голад — самы надзейны рухавік для чалавека на ўсё жыццё.

Калі ў вёсцы няма катоў ды сабак — людзі там ці то злыя, ці то бедныя.

Нічога так не прагне сябелюб, як славы.

Пытаеш, навошта два вухі і адзін язык? Каб больш слухаць і менш балбатаць, ёлупень.

Шмат хто баіцца Бога, але ўпарта адмаўляе богабаязны лад жыцця.

Толькі вернасць жонкі надае мужчыну ўпэўненасці і гонару, умацоўвае годнасць.

Каханне падобнае на першы веснавы лісток. Яно распусціцца ў свой тэрмін, якія б перашкоды ні былі на яго шляху.

Цяжкахворага паэта не крытыкуюць.

Пры сацыялізме грошы ганяліся за таварам, пры капіталізме тавар ганяецца за грашыма.

Радасць мільёнаў не памяншае гора аднаго чалавека.

Камунізм яшчэ доўга будзе паміраць у назвах вуліц.

Вайна і смерць — найбліжэйшыя сваякі і, у адрозненне ад людзей-сваякоў, адна без адной жыць не могуць.

Жыццё — выдатная магчымасць абраць для сябе спадарожнікаў, з якімі хацелася б існаваць і ў іншым свеце.

Быў бы юнак, а надзея знойдзецца.

Зайздрасць усёабдымная. Нават кату зайздросцяць.

У злога царкоўнага старасты і мышы злыя — свечкі ядуць.

КУРЫШ? КОЖНЫ РАЗ ГЛЯДЗІ НА НАСТУПСТВЫ Ў ЖАЛОБНАЙ РАМЦЫ

Многія курцы апошнім часам звярнулі ўвагу на тое, што пачкі тытунёвых вырабаў крыху змянілі свой знешні выгляд. На іх з'віліся больш кідкія (у прыкметнай чорнай акантоўцы, што вельмі нагадвае жалобную), чым было раней, папераджальныя надпісы аб шкодзе курэння. Прычына ў тым, што пастановай Дзяржстандарта ў снежні мінулага года былі ўведзены новыя патрабаванні да маркіроўкі цыгарэт. Яны распаўсюджваюцца як на тытунёвыя вырабы айчыннай вытворчасці, так і на тыя, што ўвозяцца.

Новыя патрабаванні, што змяняюць знешні выгляд пачкаў цыгарэт, павінны ўвайсці ў сілу з 1 красавіка. Аднак ужо зараз у продажы можна пабачыць як ранейшы «дызайн» упакоўкі тытунёвых вырабаў (рэшткі запасаў), так і новы. Многія вытворцы і імпарцёры вырашылі ўлічыць патрабаванні да маркіроўкі датэрмінова, паведамілі ў Міністэрстве гандлю.

У прыватнасці, як удакладнілі ў СП «Тытунь — Інвест», разам з распродажам рэшткаў прадукцыі ў ранейшай упакоўцы, тут папераджальныя надпісы аб шкодзе курэння, згодна з новымі патрабаваннямі, ужо пачалі наносіць практычна на ўвесь асартымент (29 марак цыгарэт), што выпускае прадпрыемства.

У чым заключаецца новаўвядзенне? Як нам падрабязна распавялі ў Міністэрстве аховы здароўя і Дзяржстандарце, папярэджанне аб шкодзе курэння складаецца з чорнай прамавугольнай рамкі таўшчынёй не менш за тры міліметры і надпісу, які змяшчаецца ў такую рамку. На пачку плошча папярэджання павінна займаць не менш за 30 працэнтаў плошчы кожнага з вялікіх бакоў пачка. На адным вялікім баку пачка наносіцца асноўны надпіс аб шкодзе курэння: «Курэнне — прычына развіцця сардэчна-сасудзістых і ракавых захворванняў». На другім вялікім баку — адзін з дадатковых надпісаў на тую ж тэму: «Курэнне садзейнічае развіццю імпатэнцыі і жаночага бясплодзя», «Курэнне — прычына інфаркту і інсульту», «Курэнне — цяжкая залежнасць. Не пачынайце курыць», «Курцы паміраюць маладымі», «Засцеражыце дзяцей ад тытунёвага дыму». Кожны з дадатковых надпісаў пра шкоду курэння павінен быць нанесены на прыкладна роўную колькасць адзінак спажывецкай тары аднаго наймення цыгарэт, што выпускаціць вытворца ў абарачэнне на працягу каляндарнага года.

Асноўны і дадатковы надпіс аб шкодзе курэння павінны быць надрукаваныя чорным тлустым шрыфтам на белым фоне ў цэнтры рамкі, прычым такім чынам, каб забяспечыць захаванасць надпісаў пры адкрыцці пачка. Гэтыя надпісы не павінны перакрывацца ніякай іншай інфармацыяй або акцызнымі маркамі.

Акрамя таго, надпіс аб утрыманні смалы і нікаціну ў кандэнсаце дыму цыгарэт (міліграм на цыгарэту) павінен займаць не менш за 15 працэнтаў аднаго з вузкіх бакоў пачка (надпіс павялічаны ў параўнанні з ранейшым). Тут таксама — чорны шрыфт на белым фоне. Акрамя таго, павінен быць надпіс «Продаж асобам, якія не дасягнулі 18 гадоў, забаронены».

...Неаднойчы, асабліва ў кампаніі, даводзілася чуць меркаванне людзей, які не кураць: «Паглядзіш на прыгожы пачак у тваіх руках — і якія не ўмеюць чытаць, для імігрантаў, часовых рабочых, якія не ведаюць мовы краіны, дзе яны знаходзяцца, а таксама для прадстаўнікоў моўных меншасцяў.

Нагадаем, што, згодна з Рамачнай канвенцыяй па барацьбе супраць тытуню, якая з'яўляецца міжнародным дагаворам і аб'ядноўвае 165 бакоў, пад папярэджанне аб шкодзе курэння на індывідуальных упакоўках цыгарэт і блоках трэба адводзіць ад 30 да 50 працэнтаў іх паверхні. Колькасць краін, якія пераходзяць да выкарыстання графічных папярэджанняў аб шкодзе курэння, імкліва ўзрастае. Заўважана, што эфектыўнасць папярэджанняў узрастае прапарцыянальна павелічэнню іх памераў. Чым больш месца адводзіцца на пачках цыгарэт, тым больш тэксту можна там размясціць, можна таксама выкарыстаць больш буйны шрыфт і больш якасныя выявы. Дарэчы, на міжнародным узроўні ўжо гучаць прапановы размяшчаць папярэджанні і на самой цыгарэце ці на міжволі ўзнікае жаданне ўзяць цыгарэту, зацягнуцца». Сапраўды, вытворцы тытунёвых вырабаў у апошнія гады ў справе вонкавага прывабліванне спажыўца дасягнулі, пэўна, сваіх вяршыняў. Калі так кажуць нават дарослыя, што гаварыць пра дзяцей? Зразумела, што новаўвядзенне скіравана якраз на тое, каб зменшыць колькасць тых, хто ўжо курыць, і не дапусціць павялічэння гэтай арміі за кошт «навабранцаў». Нездарма ж у многіх замежных краінах ужо даўно пачкі цыгарэт робяць у пэўным сэнсе страшнымі, напрыклад, размяшчаюць на іх фатаграфіі лёгкіх чалавека, хворага на рак. Заўзятага курца гэта, магчыма, ужо і не спыніць (да таго ж там налаўчыліся хаваць такія малюнкі пад спецыяльнымі ўпакоўкамі са скуры і іншых прыгожых матэрыялаў для пачкаў цыгарэт), але «пачаткоўца», ёсць надзея, адпудзіць, не дасць уцягнуцца ў згубную звычку. Дарэчы, падобныя малюнкі ці фатаграфіі пэўны час таму планавалася размяшчаць на ўпакоўцы тытунёвых вырабаў і ў нас, аднак чамусьці зараз вырашылі абмежавацца толькі папераджальнымі надпісамі.

Як успрымаюць новаўвядзенні ў асяроддзі курцоў? Дакладна пакуль можна сказаць толькі тое, што на інфармацыю звярнулі ўвагу, абмеркавалі. Гэта, напэўна, ужо станоўча. А што да больш глабальных вынікаў... Як вядома, вялікі шлях пачынаецца з невялікага кроку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАГЛЯДЗЕЎ НА ЦЫГАРЭТНЫ ПАЧАК І... КІНУЎ КУРЫЦЬ

Упакоўка тытунёвых вырабаў з'яўляецца найбольш эканамічным і эфектыўным каналам інфармавання насельніцтва аб шкодзе курэння. Да такой высновы прыйшлі эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

Калі ўлічыць, што курыльшчык дастае пачак з цыгарэтамі ў сярэднім 20 разоў на дзень, то ў год атрымліваецца ўжо 7300 разоў. Вельмі часта пры гэтым пачак трапляе на вочы і іншым людзям, напрыклад, членам сям'і, сябрам і калегам. Такім чынам у поле дзеяння антыпрапаганды курэння трапляе ўсё насельніцтва. Пры гэтым найбольш эфектыўнымі бываюць не тэкставыя паведамленні на пачках, а малюнкі з выявамі негатыўных для здароўя наступстваў курэння. Адзін малюнак можа замяніць тысячу слоў — такая інфармацыя лепш запамінаецца і аказвае больш моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. Яна зразумелая і даступная, у тым ліку і для людзей, якія не ўмеюць чытаць, для імігрантаў, часовых рабочых, якія не ведаюць мовы краіны, дзе яны знаходзяцца, а таксама для прадстаўнікоў моўных меншасцяў.

Нагадаем, што, згодна з Рамачнай канвенцыяй па барацьбе супраць тытуню, якая з'яўляецца міжнародным дагаворам і аб'ядноўвае 165 бакоў, пад папярэджанне аб шкодзе курэння на індывідуальных упакоўках цыгарэт і блоках трэба адводзіць ад 30 да 50 працэнтаў іх паверхні. Колькасць краін, якія пераходзяць да выкарыстання графічных папярэджанняў аб шкодзе курэння, імкліва ўзрастае. Заўважана, што эфектыўнасць папярэджанняў узрастае прапарцыянальна павелічэнню іх памераў. Чым больш месца адводзіцца на пачках цыгарэт, тым больш тэксту можна там размясціць, можна таксама выкарыстаць больш буйны шрыфт і больш якасныя выявы. Дарэчы, на міжнародным узроўні ўжо гучаць прапановы размяшчаць папярэджанні і на самой цыгарэце ці на дэталях кальяна, увесці някідкую упакоўку, прымусіць усіх вытворцаў выкарыстоўваць адзін і той жа асноўны колер, напрыклад, карычневы, забараніць лагатыпы ці элементы дызайну, вызначыць стандартны шрыфт, памер шрыфту, колер і размяшчэнне назвы брэнда, стандартызаваўшы фармат упакоўкі. Прапануецца таксама праяўляць больш фантазіі ў прыдумцы надпісаў. Напрыклад, надпіс «Кідай курыць, каб эканоміць грошы» можа таксама паўплываць на пэўную частку курцоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

БЛІЗНЯТАМ ВАРТА ПРАЯВІЦЬ АКТЫЎНАСЦЬ І НАСТОЙЛІВАСЦЬ, А КАЗЯРОГАМ ЛЕПШ ПАБЕРАГЧЫ НЕРВЫ

ВАЕН. Спрыяльны час для павышэння прафесійнага ўзроўню. Так што мае сэнс задумацца, з якога боку за гэта лепш узяцца. Добрасумленнасць дазволіць дамагчыся практычна ўсіх пастаўленых мэтаў. Паспрабуйце не навязваць сваё меркаванне, бо гэта можа прывесці да канфліктнай сітуацыі. Найбольш спрыяльны дзень — субота.

ЦЯЛЕЦ. Ёсць чым ганарыцца, аднак не варта занадта хваліць сябе за бліскучыя поспехі і дасягненні. Вы яшчэ не заслужылі ўсеагульнага прызнання на ўсё астатняе жыццё. Зноў давядзецца збірацца з сіламі і рабіць усё, каб дасягнуць чарговай вызначанай вышыні. Практычна ўвесь час можа заняць праца, а адказнасць і напружанасць будуць спадарожнічаць на працягу ўсіх дзён тыдня. Вучыцеся не толькі патрабаваць увагі ад людзей, але і нешта рабіць у адказ. Тыдзень будзе поўны эмацыйна афарбаваных падзей — напрыклад, далёкіх паездак або фінансавых пытанняў, якія запатрабуюць дадаткова кантролю. Імкнучыся да поспеху, запасіцеся трываласцю, настойлівасцю і даверам да ўласнай інтуіцыі. Пачуцці гэтых дзён, яркія і глыбокія, неўзабаве запатрабуюць выхаду. У аўторак і сераду непажадана пачынаць штосьці новае, а чацвер — дзень пабудовы грандыёзных планаў на найбліжэйшую будучыню. Выхадныя добра правесці з сям'ёй і роднымі.

БЛІЗНЯТЫ. Адпусціце з мірам сваё мінулае, аддайце даўгі і падвядзіце нейкі вынік. Вас могуць чакаць цікавыя сустрэчы і паездкі. Магчымыя новыя дзелавыя прапановы, але спяшацца з рашэннямі цяпер не варта. Маленькія цяжкасці лёгка адступяць, а больш сур'ёзныя толькі разахвоцяць вас. Зоркі рэкамендуюць праявіць актыўнасць і настойлівасць у рэалізацыі сваіх планаў. Паспяховым будзе асваенне новай прафесіі, здзяйсняльным — жаданне ўнесці ў сваё жыццё кардынальныя змены. У панядзелак могуць пацешыць доўгачаканыя навіны. У сярэдзіне тыдня разлічвайце на свае сілы, але і ад дапамогі не адмаўляйцеся. Выхадныя дні здольныя палепшыць вашу самаацэнку.

РАК. Можаце адчуць прыліў сілаў і энергіі, маркота адступіць, сыдуць у мінулае непрыемнасці і страты. Дзякуючы аптымізму, падтрымцы аднадумцаў і партнёраў можаце актыўна ўключыцца ў рэалізацыю вельмі перспектыўных планаў, асвоіць новую працу. Вы павінны падрыхтавацца да духоўнага і фізічнага абнаўлення, якое спрыяльна адаб'ецца і на асяроддзі, і на поспехах у справах. Паспрабуйце не вып

Краіна здароўя

Выпуск № 2 (171)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Гарачая» лінія ўпраўлення па ахове здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

25 студзеня — загадчык практалагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы ЦІХАН В.К.

26 студзеня — загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі Мінскага абласнога радзільнага дома СЕРЖАН Т.А.

27 студзеня — загадчык атарыналарынгалагічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы КАРЖАНЕВІЧ Е.І.

28 студзеня — загадчык філіяла № 2 Заслаўская гарадская бальніца УЗ «Мінская ЦРБ» КАРАЛЬКО М. І.

29 студзеня — загадчык 2-га туберкулёзнага (лёгачнага) аддзялення Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра ВОРАНАВА Н.А.

Графік работы «гарачай» лініі з 8.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.
У графіку магчымыя змяненні.

Прышчэпка... з мінімальнай рызыкай

«Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, абсталявання і ўтрымання прышчэпкавых кабінетаў і санітарна-гігіенічныя і супрацьэпідэмічныя патрабаванні да правядзення прафілактычных прышчэпак», зацверджаныя Пастановай Міністэрства аховы здароўя 6 студзеня 2010 года, уваходзяць у сілу праз 15 дзён пасля іх падпісання.

Хто можа быць дапушчаны да правядзення прышчэпак, у якіх халадзільніках могуць захоўвацца вакцыны, парадак размяшчэння ўпаковак з імунабіялагічнымі прэпаратамі ў халадзільным абсталяванні, мерапрыемствы па захаванні «халадовага ланцужка» і прафілактыцы паствакцынальных рэакцый — усё гэта знайшло адлюстраванне ў новых СанПІНах.

Для прыкладу, згодна з СанПІНамі, пры захоўванні і транспарціроўцы вакцын павінны выкарыстоўвацца тэрмакантэйнеры або тэрмасумкі, аснашчаныя тэрмометрам для кантролю за тэмпературай. Тэмпература ў тэрмакантэйнеры павінна захоўвацца на працягу 48 гадзін у межах ад плюс 2 да плюс 8 градусаў па Цэльсію пры тэмпературы знешняга асяроддзя да плюс 43 градусаў. На загрузку і разгрузку тэрмакантэйнераў адводзіцца ад 5 да 10 хвілін. Пасля правядзення прышчэпкі ўрач абавязаны назіраць за сваім пацыентам на працягу 30 хвілін, каб у выпадку развіцця імгненнай алергічнай рэакцыі аказаць яму першую медыцынскую дапамогу і выклікаць урача-рэаніматолага для аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі.

Прафілактычная прышчэпка можа рабіцца толькі пры наяўнасці ў медыцынскай дакументацыі запісу аб яе прызначэнні. Прышчэпка павінна рабіцца пацыенту ў ляжачым ці сядзячым становішчы. У пацыентаў, якія маюць рызыку развіцця ўскладненняў на ўвядзенне імунабіялагічнага прэпарату прафілактычныя прышчэпкі павінны праводзіцца толькі ва ўмовах бальнічнай арганізацыі аховы здароўя.

Як тлумачаць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, усе мерапрыемствы, занатаваныя ў новым дакументе, улічваюць сучасныя патрабаванні да захоўвання, транспарціроўкі і ўвядзення імунабіялагічных лекавых сродкаў. А іх укараненне ў практыку павысіць бяспеку пацыентаў і мінімізуе рызыку развіцця ў апошніх паствакцынальных рэакцый ці ўскладненняў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Рэнтген для «несапраўдных» прадуктаў

Аб стварэнні ў Беларусі Нацыянальнай праграмы па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы абароны правоў спажыўцоў на 2011—2015 гады паведаміла журналістам на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч. Гэта будзе ўсебаковы міжгаліновы дакумент, да работы над якім плануецца прыцягнуць усе міністэрствы і ведамствы, якія тым ці іншым чынам маюць дачыненне да пытанняў абароны інтарэсаў спажыўцоў. Як вядома, 2010 год быў абвешчаны кіраўніком нашай дзяржавы Годам якасці.

Па словах Ірыны Наркевіч, напрыканцы 2009 года Пастановай Урада ў дзейныя Правілы ажыццяўлення рознічнага гандлю асобнымі відамі тавараў і грамадскага харчавання былі ўнесеныя змяненні, якія, у прыватнасці, прадугледжваюць абавязак прадаўца пазначаць на цэнніках краіну паходжання тых ці іншых харчовых тавараў, а таксама размяшчаць інфармацыю аб складзе нефасаваных тавараў у даступных для азнаямлення месцах.

— Напрыклад, пакупнік хоча ведаць, чые яблыкі ён купляе: беларускія ці польскія? Ці з якой краіны былі прывезеныя цытрусавыя? Для гэтага яму не давядзецца звяртацца па неабходную інфармацыю да прадаўца. Такая інфармацыя павінна змяшчацца на цэнніку, — патлумачыла Ірына Наркевіч. — А пры набыцці нефасаванага тавару пакупніку не трэба будзе цікавіцца ў прадаўца, з чаго зробленыя кулінарныя паўфабрыкаты, што паклалі ў каўбасныя вырабы ці якія інгрэдыенты выкарыстоўваліся ў торце? Гэта інфармацыя павінна прысутнічаць у месцы продажы...

Ірына Наркевіч паведаміла, што Міністэрства гандлю ініцыявала ўнясенне паправак у дзяржаўны стандарт «Харчовыя прадукты. Інфармацыя для спажыўца. Агульныя патрабаванні». У прыватнасці, прапануецца ўвесці такія паняцці, як «імітацыя» ці «прадукт, які імітуе». Калі Дзяржстандарт падтрымае гэту ініцыятыву, то на крабавых палачках ці крабавым мясе з'явіцца надпісы «імітацыя крабавага мяса». Прычым гэта інфармацыя будзе размяшчацца на бачным месцы і такім шрыфтам, які зможа прачытаць любы пакупнік.

Сёння ў свабодным доступе на сайце Міністэрства гандлю прадстаўлены Рэестр нядобрасумленных пастаўшчыкоў і вытворцаў харчовых прадуктаў з генна-мадыфікаванымі кампанентамі, якія парушаюць вызначаныя заканадаўствам патрабаванні да інфармацыі для спажыўцоў. Прасцей кажучы, «забываюць» праінфармаваць пакупніка аб утрыманні ў прадукце ГМ-кампанентаў. У найбліжэйшай будучыні ў Міністэрстве гандлю збіраюцца рэестр пашырыць і ўключаць у яго вытворцаў і пастаўшчыкоў усіх груп харчовых тавараў, якія парушаюць вызначаныя патрабаванні да маркіроўкі.

Яшчэ адна праблемная зона, над якой плануецца працаваць у Год якасці — гэта паляпшэнне якасці сэрвіснага абслугоўвання тэхнічна складаных тавараў, у тым ліку аўтамабіляў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДЗІЦЯЧАЕ НАВАСЕЛЛЕ

У аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна адчыніўся новы дзіцячы садок

Светлы двухпавярховы будынак спадабаўся дзецям і дарослым.

— Мы пабудавалі аб'ект за 8 месяцаў, хоць павінны былі працаваць год, — расказаў **начальнік Круглянскай ПМК-266 Мікалай ПАТРОНЧЫК**. — Будынак адрозніваецца цікавае праектнае рашэнне, арыгінальныя ўпрыгажэнні з каванага жалеза, прасторныя і ўтульныя памяшканні. Аздабленне зроблена з айчынных, але самых сучасных матэрыялаў.

Новы дзіцячы садок разлічаны на 75 месцаў. ААТ «Александрыйскае» хутка развіваецца, ствараюцца новыя працоўныя месцы, прыязджаюць жыць і працаваць маладыя сем'і. Таму нездарма ў школе-садку малым стала цесна. Толькі ў Александрыі летась нарадзіліся 24 дзіцяці. Усім дзецям з цэнтра гаспадаркі і навакольных вёсак цяпер хопіць месца ў новым дзіцячым садку.

Ілона ІВАНОВА.

Утерянные **полисы серии BY № 2934150** страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих в страны системы «Зелёная карта», и полисы добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу **формы 2РН серии ПТ № 0498884** и **№ 0498885 считать недействительными**.

Што рабіць?

КАЛІ ЦІСК 90/60...

Калі пра артэрыяльную гіпертэнзію шмат пішуць, гавораць, ёй прысвячаюцца навуковыя канферэнцыі, сімпозіумы і распрацаваныя розныя метады лячэння, то гіпатэнзія (у народзе часцей гіпатанія) знаходзіцца ў медыцыны на правах нелюбімага дзіцяці, хоць гэта захворванне таксама дастаткова распаўсюджанае, асабліва сярод моладзі, цяжарных жанчын, а пасля родаў прыносіць нямала непрыемнасцяў маладым мамам.

Прычын у гіпатаніі шмат, галоўная з іх — парушэнне рэгуляцыі сасудзістага тонусу, якое прыводзіць да зніжэння артэрыяльнага ціску. Садзейнічаюць нізкаму ціску маларухомы лад жыцця, стомленасць, нізкакаларыйныя дыеты, авітаміноз, алкаголь і курэнне, збой прывычных біярытмаў, захворванні мікарда, хранічныя інфекцыі і інш.

Важныя лічбы. Некамфортным для маладых жанчын (ва ўзросце да 30 гадоў) лічыцца артэрыяльны ціск, ніжэйшы за 100/60 мм рт. сл., а для сталых — 105/65 мм рт. сл. Аднак не заўсёды лічбы вызначаюць стан чалавека. Бывае, пры ціску 90/60 мм рт. сл. вы адчуваеце сябе добра, працаздольнасць на ўзроўні, а калі ціск крыху павысіцца — усё па-іншаму.

«Букет скаргаў». Гіпатонік скардзіцца на:

слабасць, санлівасць, зніжэнне працаздольнасці;

галаўны боль і галавакружэнне, пацямненне ў вачах пры ўставанні;

дрэнны апетыт;

задышку пры нязначнай фізічнай нагрузцы, перабоі ў рабоце сэрца;

зябкасць і шмат што іншае.

Характэрны знешні выгляд: хударлявасць, скура бледная, рукі і ногі навобмацак халодныя. Хворыя дрэнна пераносяць спёку, душныя памяшканні. Пакутамі для іх становяцца паездкі ў грамадскім транспарце. Артэрыяльны ціск знікаецца пры зменах надвор'я і ў крытычныя дні.

Чым будзем лячыцца? Калі для лячэння гіпертаніі існуе мноства лекаў і іх спіс з кожным днём папаўняецца, то для лячэння гіпатаніі іх раз-два і аблічыўся — у асноўным, гэта прэпараты на аснове кафеіну. Таму даводзіцца ў пошуках выхаду налягаць на каву, чорную гарбату. Але ў іх ёсць і адваротны бок: кафеін, які ў іх утрымліваецца, хутка знясільвае, а павелічэнне дозы вядзе да парушэнняў сардэчнага рытму, бяссонніцы.

Памочніца ў нармалізацыі сасудзістага тонусу — *фітатэрапія*, а асабліва настой з піжмы, крываўніку, сухацвету, лісця з кветкавых кошыкаў бадзяку. Кожнага складніка бяруць па 2 ст. лыжкі, усё перамешваюць. Адну лыжку збору заварваюць звычайным спосабам. Настой прымаюць па палове шклянкі раніцай і ў абед на працягу месяца.

Адначасова можна прымаць па 2 ст. лыжкі арэхава-мядовай сумесі (на ноч). Для яе прыгатавання змяшайце 200 г мёду, 50 г здробненых ядраў грэцкіх арэхаў, 4 нарэзаныя лімоны (іх трэба папярэдне вымыць гарачай вадой) і 40 г соку алоэ.

Замяніць ранішні кубак кавы можа і шклянка настою чайнага грыба з 1 ст. лыжкай мёду, 20 кроплямі настойкі залатога кораня і араліі.

Упартыя галаўныя болі, звязаныя з нізкім ціскам, можна зняць настоем з піжмы, каляндры, палыну, трыпутніку, ваўчкоў.

Настойкі араліі, заманіхі прымяняюць па 30—40 кропляў да яды 2—3 разы на дзень; настойку кітайскага лімонніка прымаюць нашча па 20—30 кропляў 2 разы на дзень; жэньшэнь прымяняецца ў выглядзе 10-працэнтнай спіртавой настойкі па 15—25 кропляў 3 разы на дзень да яды. Усе гэтыя сродкі прымаюць курсамі. Яны не столькі павышаюць артэрыяльны ціск, колькі паляпшаюць самаадчуванне, надаюць бадзёрасці, аднаўляюць агульны тонус, працаздольнасць.

Увага! Прымяненне танізуючых настоек павінна быць узгодненае з урачом.

Паўнацэнны сон. Без яго гіпатанію не перамагчы! Ноччу трэба спаць не менш як 8 гадзін, а калі ўдасца прыхапіць гадзіну-другую ўдзень — гэта толькі на карысць. Не можаце заснуць? Майце на ўвазе, што снатворныя сродкі і транквілізатары зніжаюць ціск, аднак часта выклікаюць адчуванне разбітасці, галаўны боль і дзённую санлівасць. З траў лепш прымяняць чабор, спарыш, сухацвет. Настой з іх прымаюць па 1/2 шклянкі за 30 хвілін да сна.

Правільнае харчаванне. Гіпатонікі, не адмаўляйце сабе ў ежы! У ёй ваша сіла і энергія! Пазбягайце дыет. Набор прадуктаў павінен быць паўнацэнным па аб'ёме і калорыях. У рацыёне павінны прысутнічаць умераная колькасць мясных прадуктаў, пабольш рыбы, кісламалочных прадуктаў, раслінная клятчатка. Харчуйцеся малымі порцыямі, але часта (гэта і для страўніка больш карысна).

Аўтатрэнінг. Прачнуўшыся, не ўскоквайце адразу з ложка, а правядзіце кароткі сеанс псіхатэрапіі: «Мой ціск аднаўляецца, галава ясная, арганізм працуе зладжана. Дзень пройдзе паспяхова...» На гэту формулу самаўнушэння спатрэбіцца 5—10 хвілін. Пасля трэнінгу пацягніцеся, памахайце рукамі, парухайце нагамі, дыхайце глыбока. Гэта дапаможа пазбегнуць рэзкага зніжэння ціску пры ўставанні. Паўнацэнная гімнастыка і кантрасны душ разгоняць рэшткі санлівасці.

Водараторапія. З гіпатаніяй дапамогуць змагацца эфірныя алеі гваздзікі, лаванды, размарыну, герані, язміну. Пры ўпадку сілаў накапайце на насоўку 2 кроплі алею і ўдыхайце на працягу 5 хвілін. Калі ёсць магчымасць раніцай прыняць ванну з любым з пералічаных алеяў, атрымаеце выдатны зарад бадзёрасці на цэлы дзень.

Яшчэ раз нагадваць аб гаючым дзеянні любога актыўнага адпачынку, фізкультуры, разумных фізічных нагрузак, масажу і плавання, пэўна, не варта. Рух — гэта жыццё і здароўе, асабліва пры гіпатаніі!

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ЧАЮЙЦЕ НА ЗДАРОЎЕ!

ХАЛОДНАЯ пара года — самы час для душэўнага чаяпіцця ў коле сям'і і сяброў. А калі "хочацца" лета, лепшы спосаб узгадаць яго — заварыць з чаем сушаныя травы, якія не толькі падораць напою цудоўны смак, але і зробяць яго максімальна карысным. На Русі здаўна, задоўга да з'яўлення ўласна чаю, заварвалі духмяныя травы, каб сагрэцца, паправіць здароўе або ўзняць настрой.

Жыхар Давыд-Гарадка Столінскага раёна Іван ЦЯЦЮРА са сваім хатнім любімцам за ранішняй гарбатай.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мята. Духмяныя лісцікі мяты, завараныя з чорным індыйскім чаем, ствараюць сапраўды хатні настрой. Калі чай нямоцны — такі напой можа супакоіць і расслабіць вечарам. Мята цікавая не толькі сваім водарам, але і карыснымі ўласцівасцямі. Напрыклад, людзям, нястрыманым падчас застолля, мятны чай дапаможа ад пахмелля раніцай. Мята дапамагае і ад нястраўнасці, пры гарачцы падчас прастуды або грыпу. Яна здымае раздражненне і змяншае кашаль пры бранхіце. Ну і, безумоўна, мята супакойвае, дае здаровы сон — нездарма ў даўніну дзяўчаты клалі мяту пад падушку, каб убачыць у сне будучага мужа.

Чай са святаяннікам — народны напой. Гэту траву запаслівыя гаспадыні нарыхтоўваюць летам і заварваюць восенню, зімой і ранняй вясной для прафілактыкі прастуды, альбо каб проста парадаваць сябе духмяным напоем, які пахне свежым лугам і дзённай летняй спёкай. Карысныя ўласцівасці святаянніку выходзяць далёка за рамкі звычайнай дабаўкі да чаю. У гэтай расліне ўтрымліваецца вялікая колькасць дубільных рэчываў і эфірных алеяў, якія дапамагаюць пазбегнуць хваробаў дзяснаў, запаленчых працэсаў у кішэчніку. Святаяннік аблегчыць дэпрэсію, прывядзе вас у норму пры нервовым узрушэнні. Ён будзе карысным школьнікам і студэнтам, таму што дапамагае сканцэнтравацца. Пажылыя людзі са слабым сэрцам могуць знізіць рызыку прыступаў, дзякуючы заспакаяльнаму дзеянню гэтай расліны. Адзіная адмоўная якасць у святаянніку — ён павышае адчувальнасць да ўльтрафіялетавых прамянёў, асабліва ў светлатварых людзей.

Чабор — вельмі смачная і даступная дабаўка да чаю. Чабор валодае мноствам карысных уласцівасцяў, за якія яго проста неабходна ўключыць у набор зімовых прафілактычных сродкаў ад прастуды і грыпу. Эфірны алей гэтай расліны найлепшым чынам дзейнічае на лёгкія і бронхі. (Дарэчы, з чаборам можна не толькі піць чай, але і прымаць духмяныя ванны пры кашлі, рэўматызме, нервовай слабасці, выліваючы ў ваду ўжо гатовы адвар або проста дадаючы ў гарачую ванну сухую траву.)

Маліна. Адвар сушаных ягад маліны — найпапулярнейшы напой у барацьбе з прастуднымі захворваннямі. Між іншым, цудоўна дапамагае пры прастудзе і адвар з лісця і маладых галінак маліны: гэта таксама моцны гарачкапаніжальны і патагонны сродак. Гатуюць яго так: 4 ч. лыжкі сухой сыравіны заліваюць дзвюма шклянкамі кіпеню, настойваюць у закрытай пасудзіне 2—3 гадзіны, працэджваюць. Прымаюць гэты лекавы напой цёплым па палове шклянкі 4 разы на дзень.

Шыпшына — расліна, багатая на вітаміны (асабліва на аскарбінавую кіслату), флаваноіды, дубільныя рэчывы, арганічныя кіслоты, таму яе ўжыванне садзейнічае ўмацаванню імунітэту, павышэнню супраціўляльнасці арганізма да ўздзеяння бактэрый, запавольванню працэсаў старэння.

Каб прыгатаваць чай з шыпшыны, недастаткова заварыць сухія ягады кіпенем — іх варта настояць на працягу 10—15 хвілін (зручна выкарыстоўваць для гэтага тэрмас). Разам з шыпшынай можна настояць пару палачак гваздзікі або крыху мяты для смаку. У гатовы чай можна дадаць мёд, калі вам не падабаецца кіславаты смак шыпшыны.

З кветак ліпы гатуюць цудоўны духмяны напой — ліпавы чай, які аказвае на арганізм чалавека магутны аздараўляльны эфект. Ліпавы чай паскарае прасоўванне крыві па сасудах (добра "ганяе" кроў), прывядзіць у дзеянне ахоўныя сілы арганізма, пад уплывам якіх хутчэй вылечваюцца прастудныя захворванні. Асабліва гэта датычыцца дзяцей.

Вось самы просты рэцэпт: бяруць 2 ст. лыжкі сухога ліпавага цвету, заварваюць 1 шклянкай гатаванай вады, настойваюць 10—15 хвілін і п'юць у цёплым выглядзе.

Імбірны чай — эфектыўны супраць прастуды і насмарку. Імбір адносіцца да разраду "гарачых прыпраў", г.зн. з'яўляецца магутным сродкам, які актывізуе кровазварот, абмен рэчываў, умацоўвае імунітэт, дапамагае пры прастудзе, садзейнічае аддзяленню макроты. Самы просты рэцэпт: 1 ч. лыжку імбіру настояць у шклянцы гатаванай вады 20—30 хвілін, мёд дадаць на смак. Піць 3—4 разы на дзень. Альбо: надзерці свежы імбір на дробнай тарцы або ўзяць палову чайнай лыжкі сушанага імбіру разам з заваркай, настойваць 20—30 хвілін, працадзіць.

Прыгатуйце імбірны чай ад кашлю: 0,5 л вады, свежы корань імбіру (3—4 см), кардамон — 2 стручкі, жменька карыцы, 1 ч. лыжка зялёнага чаю, мёд на смак, гваздзіка — 1—2 штучкі, палова лімона. Заварваем зялёны чай і настойваем 5 хвілін, затым працэджваем, пераліваем у каструлю, дадаём кардамон, дробна пасечаны (або надзёрты на тарцы) корань імбіру, карыцу, гваздзіку. Даводзім да кіпення, трымаем на маленькім агні 20 хвілін. Пасля дадаём мёд і лімонны сок (можна кінуць у каструлю лімон разам з лупінай). Трымаем на слабым агні яшчэ 5 хвілін. Здымаем і настойваем чай 15—20 хвілін. Працэджваем. Па жаданні можна дадаць мяту. Імбірны чай павінен атрымацца бурштынава-жоўтага колеру. (Дарэчы, карыца і гваздзіка добра дапамагаюць пры кашлі з макротай.)

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ТЭХНІЧНАЯ СОЛЬ БОЛЬШ НЕ ТРАПІЦЬ НА НАШЫ ТРАТУАРЫ?

ВЫКАРЫСТАННЕ вадкага хлорыстага кальцыю і тэхнічнай солі ў якасці супрацьгалалёднага сродку на тратуарах і ў пешаходных зонах цяпер забаронена. Новыя «Гігіенічныя патрабаванні да ўтрымання тэрыторый населеных пунктаў», зацверджаныя Пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 30 снежня 2009 года № 143, пачалі дзейнічаць з 22 студзеня.

Згодна з гэтым дакументам, тратуары і пешаходныя зоны, ганкі і прыступкі будынкаў і ўстаноў павінны ў зімовы час штодня і па меры неабходнасці ачышчацца ад снегу, наледзі і пасыпацца супрацьгалалёднымі сродкамі. А вось якімі, на жаль, у дакументе, не згадваецца. Вуліцы, праезды на ўнутрыквартальных тэрыторыях у летні час пры працяглай адсутнасці ападкаў (на працягу 24 гадзін і даўжэй) павінны палівацца вадой, прызначанай для выкарыстання ў тэхнічных мэтах.

У месцах масавага знаходжання грамадзян павінны быць усталяваныя грамадскія прыбіральні ці біяпрыбіральні. Маюцца на ўвазе плошчы, тэрыторыі, што прылягаюць да вакзалаў, чыгуначных станцый, аўтастанцый, аэрапорта, аб'ектаў культурна-масавага і спартыўнага прызначэння, месцы правядзення кірмашоў, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, аўтазаправачныя станцыі і стаянкі для аўтамабіляў, разлічаныя больш чым на 25 месцаў.

Грамадскія прыбіральні ў населеных пунктах павінны мець наступны набор памяшканняў: тамбур, шлюзы з умывальнымі ракавінамі, памяшканне для індывідуальных кабін з дзвярамі, якія зачыняюцца, памяшканне для пісуараў (у прыбіральнях для мужчын) і памяшканне для бідэ (у жаночых прыбіральнях), а таксама службова-бытавое памяшканне. Грамадскія прыбіральні і біяпрыбіральні павінны забяспечвацца мылам, туалетнай паперай, электраручнікамі і (ці) папяровымі ручнікамі. Да таго ж у прыбіральнях павінны прадугледжвацца кабіны і санітарна-тэхнічнае абсталяванне для дзяцей і асобаў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Занатуйце

СВЕЖАЕ ДЫХАННЕ

Ад непрыемнага паху з рота (галітозу) церпіць больш за палову насельніцтва нашай планеты. Некаторыя беспаспяхова вядуць барацьбу з гэтай хваробай, хапаючыся за зубную шчотку некалькі разоў на дзень, але непрыемны пах упарта вяртаецца. Таму што прычынай гэтага можа быць унутранае захворванне. І ў такім выпадку ўжо не абысціся без візіту да ўрача, а таксама захоўвання дыеты. Карысна таксама прымаць травяныя настоі ўнутр, паласкаць імі рот і горла.

Пры галітозе дыета можа выканаць некалькі важных функцый. Перш за ўсё яна дазволіць прывесці ў парадак работу страўнікава-кішачнага тракта і жоўцевыводнай сістэмы. Акрамя таго, пэўныя віды прадуктаў самі па сабе дапамагаюць пазбавіцца ад непрыемнага паху, валодаючы антыбактэрыяльнымі і ачышчальнымі ўласцівасцямі.

Калі вы старанна ачышчаеце ротавую поласць, але пах з рота не праходзіць, змяніце харчаванне ў натуральны бок. Ешце больш сырой, тушанай і варанай агародніны, не забывайцеся пра штодзённае ўжыванне свежай садавіны і сокаў з яе (але свежавыціснутых, а не купленых у пакетах). Пры наяўнасці сур'ёзных захворванняў захоўвайце дыету, якую павінен прапісаць доктар.

Вельмі важна піць у дастатковай колькасці чыстую ваду. Выпівайце ў суткі каля шасці шклянак фільтраванай, а яшчэ лепш расталай вады. Абязводжаны арганізм не здольны растварацца і выводзіць шлакі, а ў забруджаным целе з задавальненнем размнажаюцца бактэрыі, якія выклікаюць з'яўленне непрыемнага паху. Выкарыстоўвайце мінеральную ваду, але перад яе ўжываннем спачатку парайцеся з урачом, каб падабраць для сябе найбольш прыдатную па кіслотнасці ваду.

Нярэдка непрыемны пах звязаны з дысбактэрыёзам, для пазбаўлення ад якога кожны дзень піце біфідакефір, а таксама выкарыстоўвайце іншыя прабіётыкі. Іх можна купіць у аптэцы.

Адмоўцеся ад смажаных страў, не купляйце прадукты з кансервантамі і араматызатарамі, узмацняльнікамі смаку і фарбавальнікамі, «хімічныя» ліманады і замяняльнікі смаку, распадаючыся ў страўніку, выдзяляюць вельмі непрыемны пах, які вы можаце адчуваць у сябе ў роце. Акрамя таго, штучныя дабаўкі парушаюць мікрафлору страўнікава-кішачнага тракта, зашлакоўваюць арганізм, што негатыўна адбіваецца на здароўі страўніка, кішэчніка і пячонкі.

Калі з'яўленне непрыемнага паху суправаджаецца метэарызмам, уздуццем жывата, цяжкасцю ў страўніку, то яшчэ больш старанна адбірайце прадукты для ежы і адмоўцеся ад залішняга ўжывання мяса (асабліва бараніны), цыбулі, часнаку, яек, а таксама кавы і моцнай гарбаты, вялікай колькасці салодкага, асабліва тлустых кандытарскіх вырабаў.

Алкаголь абязводжвае не толькі клеткі цела, але і ротавую поласць, а пры сухасці ў роце бактэрыі, якія выдзяляюць рэчывы, што дрэнна пахнуць, праяўляюць асабліваю актыўнасць. Усім вядома і тое, які «водар» ідзе з рота чалавека, які ўжываў напярэдадні залішнюю колькасць алкаголю. Курэнне таксама не дадае эстэтыкі ў пах рота. Таму кідайце курыць, а алкагольныя напоі піце рэдка, ва ўмеранай колькасці і толькі праверанай якасці.

Пасля ўжывання спіртных напояў, страў з цыбуляй і часнаком вазьміце ў рот галінку пятрушкі і старанна перажуйце яе. Ад непрыемнага паху таксама дапамагаюць яблыкі, апельсіны і морква, 2—3 ядзеркі грэцкага арэха, а таксама зялёная гарбата.

Пры з'яўленні непрыемнага паху з рота хуткім дапаможнікам з'яўляецца раслінная аптэчка.

● Вазьміце сталовую лыжку кветак рамонку аптэчнага і заварыце іх шклянкай кіпеню. Дайце гадзіну настояцца, працадзіце і палашчыце рот.

● 1 ст. лыжку сухога лісця мяты перцавай ці 3 сталовыя лыжкі свежага лісця заліце 0,5 л кіпеню і дайце настояцца на працягу паўгадзіны. Працадзіце праз марлю і выкарыстоўвайце для паласканняў.

● Выражаным антыбактэрыяльным дзеянням валодае дубовая кара, але для максімальнай карысці патрымайце яе на вадзяной лазні. 1 ст. лыжку здробненай кары заліце шклянкай кіпеню і патрымайце на вадзяной лазні 20—30 хвілін, а потым дайце яшчэ гадзіну настояцца. Працадзіце адвар і палашчыце ім рот пасля яды.

● Пры галітозе добра выкарыстоўваць святаяннік. 2 ст. лыжкі травы заварыце шклянкай кіпеню, дайце настояцца, працадзіце і палашчыце рот.

● Дэсертную лыжку насення кмену заліце шклянкай кіпеню, дайце настояцца і працадзіце. Палашчыце рот 4-6 разоў на дзень.

Пры галітозе незамянімая ароматэрапія, бо шмат які алей валодае антыбактэрыяльным дзеяннем. Напрыклад, піхтавы алей вы можаце прымяняць, калі прычынай непрыемнага паху з'яўляецца хранічны танзіліт ці гаймарыт. Пры танзіліце змазвайце міндаліны ватай, прамочанай піхтавым алеем, 4-5 разоў на суткі (праз кожныя 5-6 гадзін). Курс лячэння 2-3 дні.

Пры гаймарыце закапвайце ў кожную ноздру па адной кроплі піхтавага алею 1-2 разы на дзень. Гэтую працэдуру вы можаце рабіць адначасова са змазваннем міндалін. Калі пасля закапвання будзе пячэнне, то пацярпіце 5 хвілін, і ўсё непрыемныя адчуванні пройдуць.

Пры непрыемным паху па прычыне інфекцыі ротавай поласці і дзяснаў палашчыце рот водным растворам алею чайнага дрэва. Дадайце ў шклянку цёплай вады 3-5 кропель алею, добра перамяшайце. Палашчыце рот 2 разы на дзень, раніцай і вечарам, пасля чысткі зубоў.

Калі ж галітоз звязаны з хваробамі страўніка, то паласканнямі рота тут не абысціся. У такіх выпадках травяныя настоі трэба ўжываць унутр. Калі пасля курса прыёму травяных настояў пах працягвае вас турбаваць, то звярніцеся да ўрача, бо пастаянны галітоз можа быць праявай сур'ёзных захворванняў.

І абавязкова для таго, каб дабіцца свежага дыхання, не забывайцеся наведваць два разы на год стаматолага.

Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.

ВА ЎМОВАХ РЫНКУ ВЫЖЫВАЕ МАЦНЕЙШЫ...

ТАКОЙ БЯССПРЭЧНАЙ ІСЦІНАЙ КІРУЮЦЦА Ў НЯСВІЖСКІМ РАЙАГРАСЭРВІСЕ

Дырэктар Нясвіжскага райаграсэрвісу Юрый СКРЫБА.

Нясвіжскі райаграсэрвіс: з гісторыі развіцця. У красавіку гэтага года Нясвіжскаму райаграсэрвісу спаўняецца 70 гадоў. На самым пачатку гэта была машынна-трактарная станцыя, якую з цягам часу пераўтварылі ў аб'яднанне райсельгастэхнікі. У 2003 годзе, пасля зліцця некалькіх раённых арганізацый, якія займаліся абслугоўваннем сельгаспрадпрыемстваў, і было створана цяперашняе ААТ «Нясвіжскі райаграсэрвіс». Выконваючы свае асноўныя ранейшыя функцыі, прадпрыемства разам з тым значна пашырыла кола сваёй дзейнасці, зарабляючы, як тут падкрэсліваюць, на ўсім, на чым можна зарабіць, і з'яўляецца ў краіне сярод аналагічных прадпрыемстваў адным з найбуйнейшых. У свой час яно неаднаразова заносілася на Усесаюзную Дошку гонару на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі былога Саюза.

Чым канкрэтна займаюцца ў Нясвіжскім райаграсэрвісе цяпер?

Яго кіраўнік Юрый Скрыба адказаў на гэта пытанне так:

— Напэўна, прасцей было б сказаць, чым мы не займаемся. Увогуле, сённяшнія ўмовы вымагаюць ад суб'ектаў надзвычайнай мабільнасці, выдатнага ведання патрэбаў рынку і адпаведнай вытворчай хваткі, або ўмення хутка адказаць на гэтыя патрэбы. Калі ўсяго гэтага не будзе, калі ўсяго гэтага не зробіш ты, — зробяць іншыя, твае канкурэнты...

Ну, а калі адказаць на зададзенае пытанне больш канкрэтна, у сферу дзейнасці Нясвіжскага райаграсэрвісу, як расказалі тут, уваходзяць: абслугоўванне тэхнікі сельгаспрадпрыемстваў раёна (прычым працаўнікі райаграсэрвісу маюць у сябе моцную вытворчую базу і, так бы мовіць, з задавальненнем «прыхопліваюць» шэраг сельгаспрадпрыемстваў і з іншых раёнаў), рамонт, мантаж і абслугоўванне даільных залаў і даільных установак малочнатаварных фермаў, цэнтралізаванае забеспячэнне гаспадарак мінеральнымі ўгнаеннямі, абслугоўванне паліўных аўтазаправачных калонак, рамонт вакуумных помпаў, рухавікоў і паліўнай апаратуры (апошнім часам тут набылі новы стэнд з камп'ютарным забеспячэннем, які дазволіць выконваць работы з паліўнай апаратурай узроўню «еўра-3» і «еўра-4»), перадпродажная падрыхтоўка аўтамабіляў «МАЗ» (адпаведна, Нясвіжскі райаграсэрвіс з'яўляецца дылерам Мінскага аўтамабільнага завода), мантаж на падрадзе ў будаўнічых арганізацый сістэм ацяплення і каналізацыйных сістэм і іншыя функцыі. У райаграсэрвісе маюць свой моцны механізаваны атрад, які аказвае рознага роду паслугі сельгаспрадпрыемствам (узворванне глебы, апрацоўка пасеваў і г.д.); тут нават пякуць свой хлеб. «Бяромся за любую пасільную для нас справу, калі ёсць магчымасць на гэтым зарабіць», — таксама падкрэсліваў кіраўнік райаграсэрвісу.

Падабаецца яго цяперашняя работа слесару па наладцы халадзільнага абсталявання Мікалаю ХВІЦЬКО.

Начальнік механічнага цэха Дзмітрый БУБНОЎСКІ.

А пры ўсім гэтым у ім мэтанакіравана працуюць на перспектыву. Апошнім часам у тых жа сельскагаспадарчых прадпрыемстваў вельмі запатрабаванае аказалася сучаснае халадзільнае абсталяванне для малочнатаварных фермаў, для ахалоджвання малака. У прыватнасці, не так даўно менавіта такім выдатным халадзільным абсталяваннем пахваліліся на новай МТФ у СВК «Грыцкевічы» Нясвіжскага р-на. «Імпартнае?» — адразу ж такую выснову зрабілі мы з фотакарэспандэнтам падчас наведвання гэтай гаспадаркі (вельмі ж ужо вылучалася гэта абсталяванне сваім бляскам). Як высветлілася, пашчыравалі працаўнікі Нясвіжскага райаграсэрвісу.

Ідэя выпуску халадзільнага абсталявання нарадзілася ў райаграсэрвісе не спантанна. Як ужо зазначалася, вельмі запатрабаваным стала такое абсталяванне апошнім часам, на што ў ім і звярнулі ўвагу. Адпаведная распрацоўка выканана разам са спецыялістамі адной з нямецкіх фірмаў, для выпуску гэтага абсталявання створаны спецыяльны цэх. На сённяшні дзень выпушчана ўжо каля 200 яго адзінак, яно знайшло добры попыт не толькі ў нашай краіне, але і ў Расіі, выйшлі з ім нясвіжцы і на малдаўскі рынак. «Жывінка» нашага абсталявання для ахалоджвання малака ў тым, што яно мае 4-секцыйныя выпарнікі, і калі, напрыклад, яно загружана малаком толькі часткова, на ахалоджванні апошняга працуе толькі адзін з двух наяўных агрэгатаў, а калі загружана поўнасцю — аўтаматычна ўключаецца другі. У выніку гэтага ёсць магчымасць эканоміць электраэнергію», — падкрэсліваў Юрый Скрыба. Райаграсэрвіс са сваім халадзільным абсталяваннем удзельнічаў у маскоўскай выстаўцы «Залатая восень», дэманстраваў яго ў іншых рэгіёнах Расіі. Як казаў ужо першы намеснік старшыні Нясвіжскага райвыканкама, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Анатоль Коршун, у райаграсэрвісе знайшлі вельмі ўдалую нішу, «гэта — непатапляльны бізнэс».

І яшчэ наступныя перспектыўныя кірункі выбралі тут — вытворчасць малакавозаў на базе аўтамабіляў «МАЗ», а таксама дыскатараў. Апошнія прызначаны для безадвальнай апрацоўкі глебы і таксама з'яўляюцца сёння добра запатрабаванымі на рынку; распрацаваны яны сумесна з нямецкай фірмай «Lenken». Як падкрэсліваюць у Нясвіжскім райаграсэрвісе, іх дыскатары павінны атрымацца (выпуск іх толькі распачаты) надзейнымі, пры гэтым нясвіжцы мяркуюць найлепшым чынам укласціся ў формулу «цана плюс якасць». «Ніша на гэтым рынку ў нашай краіне практычна свабодная, і мы маем магчымасць няблага замацавацца ў ёй», — падкрэсліваюць тут.

У райаграсэрвісе мяркуюць ужо ў хуткім часе асвоіць і новыя для сябе прафесіі — у прыватнасці перамотку электрарухавікоў, мантаж электраабсталявання і некаторыя іншыя. Тут пры гэтым зазначаюць: «Каб утрымацца на тым жа рынку, не трэба замыкацца на аднойчы выбраных відах прадукцыі, відах дзейнасці. Трэба пастаянна рухацца далей, прычым у поўнай адпаведнасці з яго логікай».

* * *

Вытворчая база Нясвіжскага райаграсэрвісу ўяўляе сабой, па сутнасці, сучаснае, добра аснашчанае прадпрыемства. У мінулым годзе ў аснашчэнне толькі новых кірункаў вытворчасці тут выдаткавалі больш за 3 мільярды рублёў. Асобная ўвага — пытанням якасці. Так, тое ж малочна-халадзільнае абсталяванне праходзіць па некалькі цыклаў праверкі на герметычнасць яго зварных злучэнняў. У райаграсэрвісе наладзілі яго гарантыйнае абслугоўванне, не здымаюць з сябе адказнасці і за яго абслугоўванне пасля заканчэння гарантыйнага тэрміну. «Працаваць у сённяшніх умовах — гэта значыць працаваць ва ўмовах канкурэнцыі, і пры адным і тым жа ўзроўні цэнаў на аналагічную прадукцыю ў розных вытворцаў перамагчы можна толькі за кошт якасці», — падкрэсліваў Юрый Скрыба. А тыя ж канкурэнты могуць з'явіцца ў любы момант. Так, калі ў райаграсэрвісе яшчэ толькі выходзілі на рынак са сваімі ахаладжальнікамі малака, канкурэнтаў у краіне ў яго практычна не было, цяпер жа іх ужо чатыры.

* * *

Падчас наведвання райаграсэрвісу мы пазнаёміліся з многімі яго працаўнікамі. Пазнаёміць чытачоў з адным з іх. Такім чынам, Мікалай Хвіцько, слесар па наладцы халадзільнага абсталявання. «Складаная тэхніка. Электроніка, аўтаматыка. Складана яе настройваць. Але цікава», — казаў ён. Па спецыяльнасці ён — мантажнік радыёапаратуры, у райаграсэрвіс прыйшоў ужо ў другі раз. Пасля першага працаўладкавання праз пэўны час звольніўся, пайшоў на будоўлю, дзе больш плацілі. Але ўжо хутка зразумеў, што будоўля — гэта «не ягонае» (дарэчы, тым не менш, сам, уласнымі рукамі ўзвёў двухпавярховы домкатэдж), вярнуўся назад. Ды і заработная плата стала тут большай...

Заработная плата, як адзначалі ў райаграсэрвісе, была ў ім некалі праблемным месцам. Адпаведна, мелі ў райаграсэрвісе і праблему з кадрамі. Вырашаючы праблему заработнай платы, а значыць — і тую ж праблему кадраў, тут апошнім часам пайшлі па наступным шляху — максімальна адышлі ад абязлічкі зароблена ўсім калектывам, агульнымі сіламі, і перавялі ўсе свае падраздзяленні на прынцыпы самаакупнасці, гэтыя добра вядомыя па савецкім часе і, увогуле, вельмі неблагія прынцыпы. Як зразумела ўжо, шматпрофільная дзейнасць райаграсэрвісу патрабуе наяўнасці працоўных кадраў самых розных прафесій. У цэлым праблемы з кадрамі тут цяпер не існуе. Пры гэтым стаўка робіцца на моладзь. У райаграсэрвісе, у розных сферах яго вытворчасці, працуе больш за 600 чалавек.

З гутаркі з кіраўніком райаграсэрвісу Юрыем СКРЫБАМ:

— У нас кожная служба «вядзе» сваіх кліентаў, сваіх заказчыкаў. І кожны кіраўнік пэўнай службы павінен змагацца за сваіх кліентаў, за іх заказы. А будуць заказы — будзе і годная заработная плата. Калі ж гэты кіраўнік не набярэ заказаў адзін месяц, другі, значыць, пойдзе на іншую працу, якую ён здольны пацягнуць. У сённяшніх умовах, ва ўмовах рынку, выжывае мацнейшы. Усё гэта ў аднолькавай ступені датычыць і мяне: узяўся кіраваць — павінен забяспечыць людзей працай...

* * *

Як зазначалася ўжо, у райаграсэрвісе маюць механізаваны атрад, які аказвае сельгаспрадпрыемствам розныя паслугі — робіць узворванне глебы і г.д. Праўда, вось пытанне: аднак сельгаспрадпрыемствы цяпер няблага забяспечаны (а ў Нясвіжскім раёне — асабліва) і сваёй тэхнікай, ці не застаецца той жа механізаваны атрад без працы? У райаграсэрвісе адказваюць на гэта пытанне так: пэўная спецыялізацыя павінна прыйсці і ў эканоміку сельскай гаспадаркі. Тым больш, шмат у якіх сельгаспрадпрыемствах не хапае механізатарскіх кадраў. У механізаваны ж атрад райаграсэрвісу людзі ідуць з большай ахвотай, ён мабільны, тэхніка ў ім, з улікам наяўнасці тут выдатнай рамонтна-тэхнічнай базы, заўсёды на хаду. Адпаведна, гэты атрад можа любыя сельскагаспадарчыя работы выканаць хутка і якасна, а ў тых жа гаспадарках здымаецца галаўны боль наконт наступнага тэхнічнага абслугоўвання тэхнікі пасля правядзення пэўнага цыкла работ. Карацей кажучы, адпаведныя паслугі механізаванага атрада з'яўляюцца няблага запатрабаванымі.

Ёсць у райаграсэрвісе і сваё сельскагаспадарчае падраздзяленне, якое па сваіх памерах не саступае многім самастойным гаспадаркам (гэта падраздзяленне з'явілася пасля далучэння да яго адсталага калгаса). Цяпер гэта падраздзяленне займае ўстойлівыя пазіцыі сярод сераднякоў.

* * *

Як пачалі ў райаграсэрвісе працаваць у новым годзе?

Яго кіраўнік Юрый Скрыба зазначыў:

— Год складваецца ўдала, усё робім пад заказ, заказамі забяспечаны добра.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

«Для своечасовага выканання заказаў па халадзільным абсталяванні забяспечаны ўсім неабходным», — падкрэслівае начальнік цэха Дзмітрый ПЯКУЦЬКА.

У цэху па вырабе халадзільнага абсталявання.

На ўчастку рамонту дызельных рухавікоў. На здымку матарыст Анатоль ЛАЗЮК.

«Зварка ў асяроддзі аргону — гэта зусім проста», — гаворыць малады рабочы райаграсэрвісу Аляксандр ПАЗНЯК.

УНП 600031636.

Развітанне з Калядамі,

альбо Як адкусіць кату «нешта»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

21 СТУДЗЕНЯ — завяршэнне Калядаў. Мінулі Раство, Шчодрыкі, Вадохрышча. Былі бедная і багатая Куцця, прыйшла нарэшце і вадзяная. Калядоўшчыкі, якія яшчэ тыдзень таму шчадравалі пад вокнамі і вадзілі казу, наважыліся ісці да старога дуба на край вёскі. Вёска Новіны зноў нібы расквітнела. І не столькі ад яркага сонца і нябеснай сінечы, колькі ад стракатых хустак і спадніц, руковых шчочак і шырокіх усмешак. І ад Каляды — пшанічнага снапка ў чырвоных стужках, які чынна павезлі папарадзе на запрэжаных санках. Звычайна перад выпраўленнем Каляды гуляюць з выпечаным катом. І гэта, бадай, адна з іскрынак гульбішча. Бо гэты кот не просты. Яго падвешваюць звычайнай вяровачкай да канца палкі і разгушкваюць. А маладыя хлопцы, а часам і дзяўчаты, падскокваюць, каб адкусіць кату тое, што адрознівае яго ад коткі. Жарт, вядома ж, але сэнс гульні ў тым, каб набрацца ад ката сілы на працяг роду і радаводу, стварыць моцную сям'ю. «Каб быць юрлівымі, як той кот».

— «Еду з кута да ката!», — гучна вымаўляе хлопец, скачучы на вілках, і пачынае лавіць зубамі катовы зад. Урэшце ад печанага ката, зробленага рукамі бабулі з суседняй вёскі Чыжаха, нічога не застаецца.

Дырэктар Новінскага цэнтра культуры Ніна Клімовіч, якая адрадзіла абрад і шмат гадоў праводзіць, і ўдзельнікі самадзейнасці прэтэндуюць на атрыманне дзяржаўнага ахоўнага статусу гэтага абрада як культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці. Іх падтрымлівае ў гэтым раённы аддзел культуры і менавіта з гэтай нагоды ў вёску прыехалі назіральнікі-эксперты і спецыялісты з абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.

У энцыклапедыі «Беларускі фальклор» так апавядаецца пра гэты абрад: «Звычайна продкі на вяршыню дуба ўсцягвалі куццю — ахвяру Сонцу, а каля дуба распальвалі вогнішча, каб маладое зноў уваскрэсла. Сонца змагло адужаць, наесціся куцці, набрацца сілаў, растапіць снягі і «пусціці на зямліцу травіцу». Вакол вогнішча спявалі калядныя песні і вадзілі карагод». У Новінах сапраўды добрая навіна — сонца павярнула на вясну. А ўсцягнуты зажыначны сноп будзе берагчы вёску ад грому і спрыяць добраму ўраджаю.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота Вольгі ЛАСКІ.

ПРАКАВЕТНАЕ

АХ, ТАНЯ, ТАНЕЧКА...

Ёсць нагода

Наступны панядзелак, нягледзячы на абяцаныя сіноптыкамі маразы, мае ўсе шанцы стаць гарачым дзяньком для сапраўдных студэнтаў. А як інакш — 25 студзеня ж дзень святой Таццяны, якая лічыцца заступніцай гэтых грызуноў навукі!

Праўда, апякунства над студэнцкім племем святой ураджэнцы старажытнага Рыма «даручылі» практычна выпадкова. Спрадвеку ўсё ж 25 студзеня лічылася святам усіх жанчын і дзяўчат з імем Таццяна — менавіта іх у гэты дзень віншавалі і рабілі падарункі. У народзе лічылася, што народжаныя ў гэты дзень жанчыны стануць добрымі гаспадынямі: «Таццяна і каравай пячэ, і палавікі на рацэ б'е, і карагод вядзе!».

Так здарылася, што менавіта ў Таццянін дзень, 12 студзеня (25-га — па новым стылі) 1755 года, імператрыца Лізавета Пятроўна падпісала ўказ аб заснаванні Маскоўскага ўніверсітэта. З гэтага часу святая Таццяна і лічыцца заступніцай студэнтаў, а з сярэдзіны XIX стагоддзя дата 25 студзеня робіцца неафіцыйным студэнцкім святам — спачатку толькі ў Маскве, а потым і па ўсёй імперыі. Па сцвярджэннях гісторыкаў, адзначаўся Таццянін дзень, у які да таго ж пачыналіся вакацыі, вельмі шумна, весела і масава — адной з улюбёных традыцый, напрыклад, былі харавыя «кашачыя канцэрты» пад вокнамі рэдакцыі газеты «Маскоўскія ведамасці», заснаванай якраз прадстаўнікамі ўніверсітэта. Нават кварталыныя не краналі «цвярозых» студэнтаў, а пры неабходнасці і дапамагалі даставіць загуляўшых таварышаў дадому.

Пасля рэвалюцыі балышавікі палічылі свята «занадта буйным»: у 1918 годзе ўніверсітэцкую царкву зачынілі і зрабілі ў ёй чытальную залу, у 1923 замянілі Таццянін дзень на «Дзень пралятарскага студэнцтва», а ранейшае свята забаранілі. І ўсё ж традыцыя аказалася жывучай і праз некалькі дзясяткаў гадоў адрадзілася. Хоць Міжнародны дзень студэнтаў адзначаецца, у тым ліку ў нашай краіне, значна раней — 17 лістапада, але хіба сапраўдны студэнт упусціць дадатковую магчымасць адпачыць ад навучання? Выбірайце самі, каго павіншаваць найперш — знаёмых Таццян ці знаёмых студэнтаў — галоўнае, рабіць гэта шчыра.

Дарэчы

З Таццяніным днём звязаны шэраг народных прыкмет. Лічыцца, напрыклад, калі дзень выдасца сонечным — гэта да ранняга вяртання птушак з вырая, калі будзе мароз і сонечна — да добрага, ураджайнага лета, а калі пойдзе снег — наадварот, да дажджлівага.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

25 СТУДЗЕНЯ — САМЫ ДЭПРЭСІЎНЫ ДЗЕНЬ. НЕ ПАДДАВАЙЦЕСЯ!

Калі у бліжэйшы панядзелак вы адчуваеце сябе падаўленым, суцешцеся думкай аб тым, што «горш ужо няма куды».

Абвясціць 25-ы дзень першага месяца года самым горшым днём вырашылі расійскія псіхолагі. Паводле іх меркаванняў, у змрочным, дэпрэсіўным стане ўсяго чалавецтва трэба абвінавачваць неаплачаныя калядныя рахункі, праваленыя планы, якія людзі складалі на Новы год, і дрэннае надвор'е. Вучоныя вывеў для такіх падлікаў спецыяльную формулу. У сваім аналізе ён абапіраецца на 6 фактараў, важных для сяроднестатыстычнага чалавека. Гэта «надвор'е», «даўгі», «колькасць дзён, якія прайшлі пасля святаў», «колькасць дзён, якія прайшлі пасля правалу планаў», «адчуванне, што трэба нешта мяняць» і адначасова «— адсутнасць стымулаў». У найбольшай ступені ўплыў названых фактараў узмацняецца 25 студзеня, якое сёлета выпадае на панядзелак.

Пры гэтым Кліф Арнол пераконвае, што большасць гэтых фактараў, якія ўплываюць на настрой, можна пазбегнуць загадзя, каб у наступны «змрочны перыяд» не адчуваць сябе няшчасным. Гэты дзень можна выкарыстаць як свой «трамплін», каб надалей не адчуваць нязручнасцяў і жыць добра. Можна рыхтавацца да наступных Калядаў і планаваць не такую вялікую суму на святочныя расходы, можна кінуць курыць, пачаць правільна харчавацца, памяняць месца працы.

Вельмі важна пачаць шукаць у сваім жыцці пазітыў. «Калі вы няспынна ныеце і скардзіцеся на надвор'е ці маленькія аліменты, спыніцеся! Гэта нудна! — заклікае псіхолаг. — Думайце аб добрых рэчах, якія адбываюцца ў вашым жыцці. Калі адна з канечнасцяў не працуе — пераключыце ўвагу на тры астатнія!»

Псіхолагі звяртаюць увагу на сітуацыю на дарогах. Паводле вынікаў некаторых даследаванняў, сезонная дэпрэсія асабліва ўплывае на вадзіцеляў, робіць іх больш рассеянымі.

Псіхалагічным станам грамадства занепакоены і ў Расіі. Як заявіў намеснік дырэктара Навуковага цэнтра сацыяльнай і судовай псіхіятрыі імя Сербскага Зураб Кекелідзэ, да 2010 года дэпрэсія стане другім па колькасці захворванняў пасля хваробаў сардэчна-сасудзістай сістэмы. Гэта агульная сусветная тэндэнцыя. Пакуль што дэпрэсіі займаюць пятае месца. Трэба памятаць, што розныя людзі рэагуюць на стрэс па-рознаму: адных ён мабілізуе, а ў іншых выклікае цяжкую дэзарганізацыю і можа даць сур'ёзныя змены ў псіхіцы.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 3 (89)

ПАТЭЛЕФАНУЙЦЕ МУЗЫКУ АЛЕСЮ КАМОЦКАМУ!

Квіткі на ўнікальны канцэрт у Купалаўскім тэатры знакаміты бард распаўсюджвае асабіста

У наступную суботу, 30 студзеня, а 19-й гадзіне на малой сцэне Купалаўскага тэатра ў Мінску адбудзецца канцэрт Алеся Камоцкага «Мітусня каляровых дзён». Папярэджваем вас ужо цяпер, бо месцаў вельмі мала, а канцэрт абяцае быць цікавым. Пакуль жа спадар Камоцкі распавёў «Звяздзе», як спяваў уначы на трасе, чаму не прысвяціў песню дзяўчыны Машы і колькі роляў сыграў як акцёр.

— Спадар Алесь, цяпер вы робіце канцэрт у тэатры. А ў якіх яшчэ незвычайных месцах даводзілася выступаць?

— Некалі ў турме выступаў — вельмі ўдзячная публіка там! Аднойчы на трасе іграў. Ноч... Да дому далёка... Машыны не спыняюцца... Вырашыў так прыцягнуць увагу. Спынілася машына, выйшлі людзі, я ім заспяваў...

— Пасля турмы і трасы тэатр — не такая ўжо і экзотыка, выходзіць...

— Я ўвогуле даўно звязаны з тэатрам — яшчэ з часу, калі быў тэатр «Дзе Я?», у якім я працаваў. Таму мне хацелася зайграць у тэатры. І калі ўсё будзе добра, дык гэта будзе не адзін канцэрцік, я хацеў бы, каб такія канцэрты адбываліся з нейкай перыядычнасцю.

— Як лічыце, чым канцэрт на тэатральнай сцэне адрозніваецца ад звычайнага?

— Звычайная сцэна — гэта як бы «шырспажыў», а тэатральная сцэна — яна больш намоленая, так бы мовіць. Больш сімпатычная...

— А вы не лічыце гэта ўмяшаннем у чужую «епархію»: «мы тут спектаклі ставім, а ён сюды з канцэртам прыйшоў»?

— Ну, у мяне ж не такі канцэрт — «дзе вашы рукі» і г.д. Калі паглядзець у маю працоўную кніжку, якая даўно ляжыць дома і я не ведаю, што з ёй рабіць, дык там напісана, што я абсалютна афіцыйна працаваў у тэатры...

— І кім?

— Там напісана, што акцёрам! Хоць я больш пісаў для гэтага ўсяго...

— Сцэнары нейкія?

— Збольшага песні для пастановак, а ў адным-адзіным спектаклі нават іграў ад пачатку да канца!

— Вас там хоць не забілі?

— Не, усё было добра. І любоў да тэатра ў мяне засталася з таго часу... Аднойчы я ў музеі канцэрт рабіў, дык сяброўка смяялася, што «Камоцкі сядзіць і спявае рамансы сярод трупаў казурак»!.. Бо там выстава адпаведная была. Вось гэта было не надта... А тэатральная сцэна — яна для канцэртаў! Тых, дзе ёсць што паказаць.

— Выбар канкрэтна гэтай сцэны — чым ён абумоўлены?

— Самая ўтульная сцэна з маленькіх залаў у гэтым горадзе, на мой погляд.

— Вас так цягне да маленькіх залаў?

— Ну так, бо калі сядзіць шмат народу — я ўжо ўсіх не бачу. Вось такая зала, як малая сцэна Купалаўскага, — гэта аптымальна. А ведаеце, як білеты распаўсюджваюцца? Я сам іх распаўсюджваю. І буду ведаць практычна ўсіх, каму я іх аддаў. Гэта 60 ці 70 чалавек.

— І што, вам гэта цікава — ведаць усіх слухачоў?

— Мне цікава! Мяне цікавяць людзі, для якіх я гэта раблю, вельмі цікавяць. Тым больш, што я для іх ні халеры не раблю ў прынцыпе, а ўсё раблю для

Алесь КАМОЦКІ хоча ведаць кожнага слухача і слухачку асабіста!

сябе. Проста раблю так, каб мне не сорамна было паказаць гэта людзям. Я ніколі не мог напісаць песню пра сваё жыццё, і для нейкага канкрэтнага чалавека не магу нешта рабіць...

— А пра чыё жыццё вы можаце напісаць песню?

— Я калі пішу песні, абавязкова ўсё выдумляю!

— Карацей, шукаць рэальных гісторый у вашых песнях не варта?

— Не-а. Шукаць, што гэтая песня прысвечаная «Машы, у якую я быў закаханы ў сёмым класе» — такога не бывае.

— Аднак Машы, напэўна, было б прыемна...

— Машы было б прыемна, але — неяк не выходзіць...

— І што, ніколі дзяўчаты-жанчыны не крыўдавалі, што песні ім не прысвячаеце?

— На мяне дзяўчаты і жанчыны ўвогуле не крыўдуюць! А што на мяне крыўдаваць?..

— Спадар Алесь, калі вы асабіста ведаеце кожнага слухача — дык раскажыце нам, хто яны.

— Яны самыя розныя — і мне гэта прыемна. Бывае так, што сядзяць адны студэнты. Адзін з апошніх канцэртаў: прыходжу — а ў зале адны бабулькі. Звычайна як? Канцэрт калі пачынаецца, дык першыя некалькі песень ідуць у пясок, пакуль публіка рассядзецца і пачне слухаць. А потым ужо ўсталёўваецца кантакт. А тут — зала бабцяў! І я думаю: «Што ж мы з вамі, бабці, будзем рабіць?» А кантакт усталяваўся — я яшчэ нават не пачаў спяваць!.. Нашы бабці — гэта супер! Дарэчы, наконт слухачоў. Я ведаю чалавека, які на мае канцэрты хадзіў некалі ў жываце мамы. А сёння я яго ведаю, дарослы ўжо.

— Гэта не наводзіць вас на думку, як вы ўжо доўга спяваеце?

— Калі ты праўда займаешся гэтай справай — то часу не існуе... Калі ж гэта стамляе, калі гэта праца — то час ёсць...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.

P.S. *Вяртаючыся да загалоўка: паразмаўляць з Алесем Камоцкім (і замовіць квіток на канцэрт) можна па тэлефоне (8.029) 2532504. Скажаце, у «Звяздзе» тэлефон прачыталі ;)*

САКУРА ДЛЯ АПОСТАЛА

У новым сталічным мікрараёне Каменная Горка зарэгістраваны праваслаўны прыход у імя святіцеля Мікалая Японскага. Ва ўсім свеце ўсяго некалькі храмаў асвячоныя ў імя гэтага святога: тры — у Японіі, два — Расіі, адзін — у Афрыцы, ёсць прыход у штаце Каліфорнія (ЗША), і вось цяпер створана абшчына, а значыць, будзе і храм — у Беларусі. Што ж гэта за чалавек быў — архіепіскап Мікалай Японскі, які звязаў такія розныя мясціны на нашай планеце? Пра асобу святога, а таксама пра адметнасці новага прыходу ў Мінску аглядальніку «Звязды» расказаў настаяцель Мікола-Японскага храма іерэй Павел СЯРДЗЮК.

Японская вуліца

— Айцец Павел, ці вызначана ўжо месца пад храм?

— Так, гэта за два кварталы ад станцыі метро «Каменная Горка». Храм імя святіцеля Мікалая Японскага будзе знаходзіцца ў будучай зялёнай зоне, на скрыжаванні вуліц Калеснікава і 6-й праектуемай. Назвы ў 6-й праектуемай вуліцы пакуль няма, ёсць магчымасць назваць яе Свята-Мікольскай альбо як-небудзь звязаць назву з Японіяй.

— Пра святіцеля Мікалая Японскага мы не так шмат ведаем. Раскажыце гісторыю назвы прыхода.

— У 2007 годзе на пясяджэнні Свяшчэннага Сінода была прынятая канцэпцыя місіянерскай дзейнасці Рускай Праваслаўнай Царквы — гэта дакумент, які мае на ўвазе стварэнне ў кожнай епархіі місіянерскага аддзела і місіянерскага прыхода. Гэта з'ява дастаткова новая...

— Для нашага часу.

— Так, для нашага часу. Вельмі складана вызначыць: місіянерскі прыход альбо не, бо ў любой абшчыне акрамя богаслужэбнай дзейнасці ажыццяўляецца тая альбо іншая асветніцкая і сацыяльная. Напэўна, для місіянерскага прыхода вельмі важна, найперш, стварэнне ўмоў для больш арганічнага ўваходжання людзей у храмавае жыццё. Я бачу задачу прыхода Мікалая Японскага менавіта ў тым, каб людзі, якія асацыююць сябе з праваслаўем, але не ведаюць веры, прыйшлі ў храм і знайшлі тут адказы і апору. Трэба задзейнічаць розум праз усе бакі жыцця абшчыны. Дзеля гэтага, калі будзе на тое бласлаўленне кіруючага архіерэя, мы будзем праводзіць богаслужэнні з тлумачэннем.

— Гэта нешта новае?

— Хутчэй — забытае былое. Сутнасць у тым, што, згодна з царкоўным статутам, падчас усяночнага няспання належыць шэсць разоў звяртацца да вернікаў са словам пропаведзі. Але цяпер такога няма. Між тым гэта — тлумачэнне асноўных ісцін веры.

На гэтых землях набажэнства з самага пачатку было місіянерскім. У гэтым сакрэт поспеху святых братоў Кірылы і Мяфодзія. А цяпер і гэта не сакраэт, Царква ўспрымаецца многімі акультна. Асвячэнне, хрышчэнне, вянчанне, ахвяра — усё зводзіцца да нейкіх магічных дзеянняў. Калі чалавек магічна ўспрымае Царкву, неабходна контрмера, асветніцтва розуму, дэманстрацыя таго, што гэта не так. Таму некаторыя рэчы трэба тлумачыць.

Лічу таксама вельмі карысным увядзенне агульнанароднага спявання. Яшчэ адзін варыянт — гутаркі па-за набажэнствам.

— Але спачатку чалавек павінен прыйсці ў храм...

— Чалавек можа прыйсці ў храм праз удзел у сацыяльных праектах. Таму мы плануем супрацоўнічаць з адміністрацыяй раёна.

— Такім чынам у новым сталічным мікрараёне Каменная Горка створаны менавіта місіянерскі прыход. І імя Мікалая Японскага абрана не выпадкова.

— Калі пачытаць дзённікі святіцеля, то яго асоба не можа не скарыць. Да таго ж, людзям больш зразумелыя святыя, якія псіхалагічна роднасныя, больш блізкія па часе. Мікалай Японскі быў уцягнуты ў супярэчлівыя гістарычныя працэсы Расіі, калі ўжо адбываўся распад дзяржавы. Але для мяне самае каштоўнае тое, што святіцель Мікалай прапаведаваў не абапіраючыся на механізмы дзяржаўнай улады. Сёння праваслаўныя хрысціяне ў Беларусі часта супакойваюць сябе наяўнасцю дамоўленасці з дзяржавай, стабільнасцю і забеспячэннем статусу-кво ў дачыненні да сваёй перавагі. Гэта паралізуе сілы. Мы бачым, што ёсць канфесіі, якія больш дынамічна развіваюцца. Нараджаецца незадаволенасць з-за таго, што нехта працуе з наркаманамі, паспяхова развівае сетку сацыяльнага служэння — раптам, нейкім чынам, мы пачынаем думаць пасектанцку. А сектанцкае мысленне — непаўнацэннае. Праваслаўе ж — гэта паўната благадаці, Дароў Духа Святога.

— Дык чаму праваслаўныя пачынаюць думаць па-сектанцку?

— З-за зайздрасці тым, хто актыўны. У той час як самі знаходзімся ў стане самнамбулізму. Фігура святіцеля Мікалая здольная натхніць, паслужыць прыкладам.

Вядомы цікавы факт, вельмі значны і прадвызначальны. Будучы святіцель Мікалай Японскі — студэнт чацвёртага курса Пецярбургскай Духоўнай Акадэміі Іван Касаткін — выпадкова ўбачыў абвестку пра тое, што патрабуецца настаяцель пасольскай царквы ў Японіі. Але абвестка гэта з'явілася пасля таго, як у Сінод звярнуўся першы рускі консул у Японіі Іосіф Гашкевіч. А Іосіф Гашкевіч, вядомы дыпламат і ўсходазнаўца, нарадзіўся ў Рэчыцкім павеце Мінскай губерні, цяпер гэта Гомельская вобласць. Бацька Іосіфа Гашкевіча быў святаром у Свята-Міхайлаўскай царкве вёскі Стралічава пад Хойнікамі. Так што тут ёсць жывая сувязь з Беларуссю.

— Атрымліваецца, што беларус па нараджэнні Іосіф Гашкевіч сто з лішнім гадоў таму знайшоў не толькі місіянера для Японіі, але і натхняльніка місіянерства для сваёй Бацькаўшчыны.

— Дарэчы, сам святіцель нарадзіўся ў Смаленскай губерні — таксама на гістарычна беларускіх землях. У той час, калі ён патрапіў у Японію, да замежнікаў там ставіліся з вялікай падазронасцю, асабліва прадстаўнікі традыцыйных саслоўяў — самураі: як да людзей, якія хочуць паглынуць, асімілявацьі знішчыць самабытнасць Японіі. Але да іх светапогляду, светаадчування іераманах Мікалай падыходзіць з іншай меркай. Ён не ставіць сваёй задачай пераварочванне свядомасці вялікай колькасці людзей. Ён уважліва вывучае мову, культуру і рэлігію Японіі. Ён часта знаходзіцца ў сінтаіцкіх і будысцкіх храмах. З'ява для місіянера неверагодная — немагчыма ўявіць сабе праваслаўнага святара ў язычніцкім капішчы. Айцец Мікалай не дазваляў сабе абражаць рэлігійныя пачуцці японцаў. Напэўна таму ён і здолеў заснаваць Праваслаўную Царкву ў Японіі. Першы японец, свядомасць якога ён перавярнуў і які потым стаў самым першым святаром-японцам, быў самураем, і спачатку ён шчыра жадаў праваслаўнаму іераманаху смерці, але быў пераможаны цікай любоўю будучага святіцеля.

Нездарма Царква называе гэтага святога роўнаапостальным. Гэты тытул звязаны з апостальскай місіяй — нясеннем Евангелля народу, які яго яшчэ не чуў. Разам з тым, у Мікалая Японскага былі рысы, якія адлюстраваныя ў словах апостала Паўла: *«Мы... былі ціхія сярод вас, падобна як кармініца пяшчотна абыходзіцца з дзецьмі сваімі»*. Пяшчота і адкрытасць уласцівыя людзям, якія глыбока пазналі ісціну веры хрысціянскай, убачылі яе прыгажосць, і для іх Хрыстос — гэта не ідэалагічныя лозунгі, а Жыццё вечнае, рэкі вады жывой, якія цякуць з іх сэрца. Гэта не патрабуе нейкай ідэалагічнай барацьбы з апанентамі. Гэта сведчанне адкрытасці і гэта вельмі прываблівае ў асобе святіцеля. З яго дзённікаў, якія цяпер апублікаваныя, мы ведаем усе яго патаемныя думкі, увесь цяжар працы, усю часам безнадзейнасць, якую ён адчуваў пры гэтым. Але дзякуючы яму ў Японіі з'явілася 35 тысяч праваслаўных хрысціян.

Мы, вядома ж, жывём не ў атачэнні іншаверцаў, але бывае вельмі складана звярнуцца са словам пропаведзі нават да аднаверцаў, да тых, хто ідэнтыфікуе сябе з праваслаўем. У гэтым сэнсе мы ў тым, што рабіў святіцель Мікалай, падобныя.

На гэтых землях набажэнства з самага пачатку было місіянерскім. У гэтым сакрэт поспеху святых братоў Кірылы і Мяфодзія. А цяпер, і гэта не сакрэт, Царква ўспрымаецца многімі акультна.

Зварот без альтэрнатывы

— Якая галоўная складанасць пры звароце да сучаснікаў?

— Складанасць не ў тых, да каго звяртаешся, а ў тым, хто звяртаецца, і з чым. Усякае слова будзе прынятае сэрцам чалавека, калі ён разумее, што яно ідзе ад сэрца. Таму так важны асабісты прыклад прапаведніка, які адпаведнасць гэтаму слову. Безумоўна, можна пацешыць сябе думкай пра місіянерства, пра тое, што ёсць смеласць звяртацца да людзей, гэта натхняе, захоплівае, але, з іншага боку, мы ведаем, чым скончылася пропаведзь айца Данііла Сысоева. Стрэлам. І мы таксама павінны ўвесь час памятаць пра гэта. Слова пропаведзі Евангельскай — гэта слова, якое чалавек выказвае, не маючы альтэрнатывы. Бог дакрануўся да сэрца, і чалавек, які атрымаў дар прапаведніцтва, пераўтвараецца ў Голас. Гэта служэнне можа паварочвацца рознымі бакамі для самога вяшчальніка. Таму, з аднаго боку, смела называць прыход місіянерскім, бо маецца на ўвазе, што ён будзе неяк вылучацца. Але з іншага боку — гэта адказнасць.

Святіцель Мікалай Японскі знайшоў такія словы і паказаў такі прыклад сваім жыццём, якія натхнілі людзей зусім іншых па светапоглядзе. І тое, што гэты чалавек, які быў рускім і да канца сваіх дзён сумаваў па радзіме, змог палюбіць чужы для яго народ, з іншым светапоглядам, — гэта вялікі подзвіг сэрца. Калі архіепіскап Мікалай Японскі памёр, імператар Японіі прыслаў на яго магілу свой асабісты вянок. Гэта адзіны замежнік, які ўдастоіўся такой пашаны.

— Праз захапленне асобай Мікалая Японскага вы самі ці не захапіліся японскай культурай?

— Так, захапіўся. Мне цікавы досвед Японіі тым, што гэта краіна доўга захоўвала сваю ідэнтычнасць. Яна была закрытай да сярэдзіны XIX стагоддзя. Хоць сёння секуляцыйныя і глабалізацыйныя працэсы там праходзяць таксама актыўна, але тым не менш застаюцца і ўнікальная паэзія, і кодэкс самурая... Маё першае знаёмства з японскай культурай адбылося яшчэ ў школе, дзе настаўнік на этыцы парэкамендаваў прачытаць «Галіну сакуры» Усевалада Аўчыннікава. Холад у дамах, прастата абсталявання, каліграфія, засяроджанасць на сузіранні, нейкая трэніроўка душы, важная і для практыкі хрысціянскай аскезы...

— Ці значыць гэта, што паміж сузіраннем у японскай культуры і сузіраннем хрысціянскім няма супярэчлівасці?

— Нейкія пераклічкі ёсць, але дасягаюцца розныя мэты. Хрысціянскае сузіранне мае на ўвазе стварэнне ўнутранай малітвы. А японцы імкнуцца дасягнуць унутранай канцэнтрацыі. Але ў любым выпадку, японцы такім чынам, яшчэ нават у школе, вучацца сузіраць прыроду. Ёсць і рэчы ў японскай культуры, для хрысціянства непрымальныя. Напрыклад, гіпертрафаваны эратызм. Там ніхто не табуіруе эротыку. Гэта не значыць, што хрысціянства скоўвае чалавека, але нейкія рэчы павінны быць усё ж такі табуіраваныя, каб тайна не губляла сваёй прывабнасці.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Праз сад камянёў

— А яшчэ, вы ведаеце, я чамусьці інтуітыўна адчуваю, што культурная сувязь з Японіяй, якая, я спадзяюся, у прыхода з часам усталюецца, дапаможа знайсці адказы на пытанні аб уласнай самаідэнтычнасці. Я не ведаю, у чым тут механізм, але вельмі часта ўсе нашы пошукі ўнутраных адказаў маюць ідэалагічна-палітычную афарбоўку. А гэта ўсё крайнасці, якія не даюць сапраўдных адказаў. Выраз «Жыве Беларусь!» атаясамліваецца не з вершамі Янкі Купалы, а з палітычнымі рухамі. Гэта ўсё з'яўляецца маніфестацыяй падзелу нашага грамадства. Таму, думаю, калі б мы змаглі зразумець культурныя коды Японіі, магчыма, мы б набылі тыя механізмы, якія дапамагаюць асэнсаваць, зразумець, навучыцца сузіраць сваю ўласную ідэнтычнасць.

— А гэта патрэбна?

— Безумоўна, гэта абавязкова патрэбна.

— Але ж большасць людзей жывуць і да канца сваіх дзён не задумваюцца пра сваю ідэнтычнасць.

— Святару часта даводзіцца быць сведкай смерці. Адзін выпадак мне асабліва запомніўся. Калі чалавек перад смерцю прамовіў: «Так і не зразумеў, навошта жыў».

— Як разуменне сэнсу жыцця суадносіцца з пошукам сваёй ідэнтычнасці?

— Напрыклад, японцы сузіраюць цвіценне сакуры і адчуваюць сваю прыналежнасць да навакольнага свету. А мы гвалтам прымушаем прыроду служыць нам, прыходзім і запаўняем яе сваімі аб'ёдкамі. Мы паводзім сябе як дзікуны. Мы зусім аўтаномныя адзін ад аднаго, і ад прыроды...

— Дык што, чалавек, які больш звязаны з іншымі людзьмі, які здольны заўважаць прыгажосць прыроды, гарантавана не будзе паміраць з думкай: «Так і не зразумеў, навошта жыў»?

— Не сумняваюся, што ён наблізіцца да адказу. Сутнасць тут вось у чым. Ёсць язычнікі, якія не ведаюць Хрыста, але яны значна глыбей разумеюць сутнасць таго, што адбываецца, чым мы — людзі, якія жывуць на зямлі, больш за 2 тысячы гадоў асвечанай Дабравесцем. Мы жывём нібы ў адзін бок. Такое ўражанне, што мы ў некаторай ступені звар'яцелі. За галоўны прынцып свайго жыцця мы ўзялі сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Мы спадзяёмся, што гэтыя пераўтварэнні вырашаць усе праблемы. Пераўтварэнні адбываюцца, а праблемы нашы не вырашаюцца. Мы рэальна сталі жыць лепей. Паглядзіце, што сёння людзі купляюць да навагодняга стала. Раней мы пра гэта і марыць не смелі. Але што адбываецца ў душы чалавека? Там чамусьці аўтаматычна росквіту не адбываецца. Таму вельмі важна адказваць на ўнутраныя, праклятыя пытанні: «Хто я? Навошта жыву? Якое маё прадвызначэнне?»

У нас зараз пануе надта прымітыўная жыццёвая філасофія: аванс, палучка, шопінг, серыял. Я не хачу некага абвінавачваць, бо мы ўсе вінаватыя — мы пагаджаемся на такое жыццё.

Гэта патрабуе засяроджання, самапаглыблення. Язычнікі на гэта здольныя. А хрысціяне ад гэтага адмовіліся.

У нас цяпер пануе надта прымітыўная жыццёвая філасофія: аванс, палучка, шопінг, серыял. Я не хачу кагосьці абвінавачваць, бо мы ўсе вінаватыя — мы пагаджаемся на такое жыццё. Таму, магчыма, пагыбленне ў чужую культуру дапаможа нам знайсці свае ўласныя шляхі. Маю на ўвазе менавіта культуру, не рэлігію нават. Жыць па Евангеллі — наша прамая задача. Місіянерскі прыход можа ўключыць у сябе і тых людзей, якія не ўдзельнічаюць у набажэнствах, але жыццё храма павінна прапанаваць гэтым людзям нешта, што можа іх прывабіць. Трэба ўключыць культурную частку грамадства. Для нашага прыхода любы чалавек, які спавядае прынцыпы прыгажосці — паплечнік. А крок да Хрыста — гэта ўжо наступны этап. Гэты крок чалавек робіць самастойна. Хоць могуць быць і тыя, хто пакажа кірунак.

На самым пачатку

— Што прыход уяўляе сабой цяпер?

— Сёння гэта згуртаванне сяброў. Пакуль прыходу няма дзе маліцца. Мы прайшлі этапы падрыхтоўкі дакументацыі для пачатку работы над архітэктурным праектам. Ёсць архітэктар, з якім мы працуем. Канцэпцыя такая: паспрабаваць адлюстраваць гістарычныя рэаліі, сучаснікам якіх быў Мікалай Японскі. Мы заклалі гэту канцэпцыю ў архітэктурнае рашэнне храма ў стылі класіцызму. Мне здаецца, што ў сучасныя новабудоўлі такі храм добра ўпішацца.

Да таго ж Беларусь — гэта сустрэча дзвюх культур: усходне-праваслаўнай і заходне-хрысціянскай. Таму ёсць задума ў экстэр'еры адлюстраваць уплыў заходняй культуры на нашу Айчыну, а ў інтэр'еры цалкам стварыць атмасферу ўсходне-хрысціянскага светаадчування. Гэты сінтэз у наступным будзе распрацоўвацца ва ўзаемадзеянні з архітэктарамі і іканапісцамі. Калі атрымаецца не пошлая эклектыка, то будзе добра.

Яшчэ ёсць жаданне ў ландшафтным дызайне адлюстраваць элемент Японіі, закласці сад сакуры, стварыць нейкую тэрыторыю для магчымага сузірання яе цвіцення, дзіцячую пляцоўку, а калі дазволіць плошча нашага ўчастка, то і спартыўную. Каменная Горка — раён малады, тут шмат сацыяльнага жылля, сем'яў з дзецьмі. Хацелася б максімальна зрабіць жыццё прыхода ўключаным у жыццё мікрараёна. Магчыма, варта зрабіць асобныя ўваходы на тэрыторыю, падзяліць яе на зоны, каб кожны адчуваў тут сябе ўтульна, і хоць бы візуальна знаходзіўся пад шатамі храма.

Гіпермаркеты — яны не прыгожыя, яны функцыянальныя, таму яны ангарападобныя, гэта вялікія склады, і чалавека гэта не выхоўвае эстэтычна. А чалавек, які прыйдзе на тэрыторыю храма, убачыць нешта прыгожае.

— Якім чынам жыхарам новага мікрараёна далучыцца да прыхода?

— Перш за ўсё праз малітву аб будаўніцтве храма. Пакуль што маліцца можна кожнаму ў сябе дома. Усякае жыццё абшчыны пачынаецца з Еўхарыстыі — Літургіі, з магчымасці сходу. Мы шукалі магчымасць часовага памяшкання, якое магло б знаходзіцца ў нежылым фондзе, але нам пакуль былі прапанаваныя надта дарагія варыянты. Мы спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час будзе вырашана пытанне з усталяваннем паклоннага Крыжа, тады пачнуцца набажэнствы на свежым паветры ля Крыжа. А пакуль можна звязвацца па тэлефоне: (297) 01 99 55, (291) 26 82 63 і па электронным адрасе: 7019955@gmail.com

— Айцец Павел, раскажыце трошкі пра сябе.

— Я нарадзіўся ў 1975 годзе ў сям'і студэнтаў (потым служачых) у вёсцы Майсееўшчына Барысаўскага раёна. Гэта практычна мяжа з Віцебскай вобласцю. Бацька — зубны ўрач-пратэзіст, маці — настаўніца рускай мовы і літаратуры ў школе. Другая мая малая радзіма, духоўна для мяне значная, Лельчыцкі раён. Туды, у вёску Мілашэвічы, бацькі трапілі па размеркаванні. Мы пражылі там два гады. Бацька працаваў галоўным урачом вясковай бальніцы, нашу сям'ю там памятаюць дагэтуль. Гэта Тураўшчына, тэрыторыя Прыпяцкага запаведніка. У Тураве, дарэчы, у 1977 годзе мяне хрысціў у храме Усіх Святых, што на могілках, протаіерэй Уладзімір Столяр. Вучыўся я ў сярэдняй школе Жодзіна. Там мае сябры, там, у многім дзякуючы дзейнасці архімандрыта Аляксія (Шынкевіча), пачыналася маё ўваходжанне ў жыццё Царквы.

Вучыўся ў Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва на кафедры паліталогіі. Тое, што я яго не скончыў, лічу вялікай сваёй памылкай. Потым стаў актыўна ўдзельнічаць у жыцці прыхода ў гонар святога праведнага Іаана Кранштацкага, ён размешчаны ў будынку фізкультурна-аздараўленчага комплексу завода «Атлант». Там было шмат маладых людзей. Адтуль я паступіў у Мінскую духоўную семінарыю, туды быў рукапаложаны ў дыяканы, потым два гады служыў там святаром. Праз два гады мяне прызначылі настаяцелям палкавога храма ў гонар святога пакутніка Іаана Воіна ў пасёлку Аколіца Мінскага раёна. Потым служыў у храме імя іконы Божай Маці «Сысканне загінулых» у Мінску, вядомым як Чарнобыльская званіца, там моляцца аб спачыне загінулых ліквідатараў чарнобыльскай аварыі. З 6 кастрычніка 2009 года мяне прызначылі настаяцелям храма ў гонар святіцеля Мікалая Японскага.

— Матушку сваю знайшлі ў Жыровічах?

— Не, мы даўно ведалі адно аднаго. Яна стала маім апосталам — чалавекам, дзякуючы якому я прыйшоў у Царкву.

— Колькі ў вас дзетак?

— Чацвёра.

— Маленькія?

— Сем, пяць, два гады і пяць месяцаў.

Размаўляла Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НАЙЛЕПШЫЯ З НАШЫХ

Вызначаны пераможцы конкурсу апавяданняў «Звязды» за 2009 год

Нашы аўтары сталі больш актыўныя — больш за 50 апавяданняў з паметкай «На конкурс» паступіла ў рэдакцыю летась. 21 апавяданне было надрукавана. Але, на жаль, газета не паспела змясціць усе, якія рэкамендаваў да друку вядучы конкурсу і наш літаратурны эксперт, пісьменнік Віктар КАЗЬКО. А гэта значыць, што ў іх ёсць шанц у 2010 годзе, бо наш конкурс працягваецца!

Ён па-ранейшаму адкрыты для ўсіх, хто піша па-беларуску: і для тых, хто даўно і паспяхова працуе на літаратурнай ніве, і для людзей, якія толькі спрабуюць сябе, імкнучыся падзяліцца назіраннямі за жыццём, распавесці пра яго цікавыя ці таямнічыя імгненні па-беларуску.

Сярод апавяданняў нашых леташніх аўтараў былі творы таленавітыя, неардынарныя, якія вылучаліся філасофскім поглядам на свет і асаблівай аўтарскай манерай. За спалучэнне гэтых якасцяў яны адзначаныя і названыя **пераможцамі літаратурнага конкурсу «Звязды» за 2009 год**.

1-я прэмія — Віктар Супрунчук, апавяданне «Валя» (надрукаванае 8 снежня).

2-я прэмія — Віталь Воранаў, апавяданне «Карціна «Вяртанне» (6 жніўня).

3-я прэмія — Валерыя Саротнік, апавяданне «Разважанні расчараванага кварка» (29 снежня).

3-я прэмія — Барыс Стральцоў, апавяданне «Стрэшка над студняй, альбо Пра бульбінку і рэпку» (11 сакавіка).

Ганаровым дыпломам будзе адзначаны Васіль Шабалтас за апавяданне «Каціны барон» (28 кастрычніка).

Усім нашым пераможцам мы звычным поспеху і натхнення. І запрашаем 29 студзеня (пятніца) а 14-й гадзіне на сустрэчу ў рэдакцыю, дзе адбудзецца ўзнагароджанне. Кантактны тэлефон — 287 18 69 (Ларыса Цімошык), ці 287 19 19 (прыёмная).

Да ўвагі ўдзельнікаў конкурсу 2010!

Творы трэба дасылаць на адрас «Звязды» з паметкай «На конкурс». Згодна з умовамі, як конкурснае разглядаецца толькі адно апавяданне ад кожнага ўдзельніка, памерам не большае за 5 машынапісных (ці камп'ютарных) старонак. Удзельнікам конкурсу можа стаць аўтар апавядання, якое нідзе не друкавалася, напісана для «Звязды» і на беларускай мове. Найлепшыя, на думку вядучага конкурсу пісьменніка Віктара Казько, творы будуць надрукаваныя на старонках газеты. Рэдакцыя «Звязды» заснавала тры прэміі за лепшыя апавяданні. Вынікі будуць падведзеныя на пачатку наступнага года.

Рэдакцыя просіць аўтараў абавязкова паведамляць свае поўныя пашпартныя звесткі, асабісты нумар, адрас і кантактны тэлефон (дзеля таго, каб можна было налічыць і даслаць аўтарскі ганарар). Але не забывайцеся напісаць трошкі пра сябе: чым займаецеся, калі пачалі пісаць, што да гэтага падштурхнула). Нам важна ведаць, якія людзі любяць, падтрымліваюць і імкнуцца захаваць беларускае слова.

ПРЫРОДАЗНАЎЦЫ ВУЧАЦЦА З КАМФОРТАМ

22 студзеня адчыніўся адноўлены будынак факультэта прыродазнаўства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова. Ва ўрачыстасці брала ўдзел кіраўніцтва вобласці і Магілёва.

Рэканструкцыя даваеннага будынку на вуліцы Першамайскай доўжылася два гады і каштавала каля 8 мільярдаў рублёў бюджэтных грошай.

Надбудаваны яшчэ адзін, чацвёрты, паверх, дзе размясціліся сучасныя лабараторыі. На факультэце з'явіліся магутныя камп'ютары. У двух дзясятках светлых і прасторных аўдыторый вучыцца каля 500 студэнтаў.

Ілона ІВАНОВА.

Літаратурныя навінкі

«Ул. КАРАТКЕВІЧ І ПРАЦА»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Кнігу пад такой назвай выдаў доктар філалагічных навук, прафесар, аўтар нашай пастаяннай рубрыкі «Сіла слова» Аляксей НЕНАДАВЕЦ.

У ёй аналізуюцца некаторыя аспекты творчай спадчыны выдатнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча. Як адзначае сам аўтар, у кнізе шмат спасылак на творы класічнай сусветнай літаратуры, зваротаў да міфалогіі і фальклору, выказванняў даследчыкаў спадчыны Караткевіча.

Выданне разлічана на літаратуразнаўцаў, аспірантаў, студэнтаў і ўсіх, хто любіць творы пісьменніка.

Інга МІНДАЛЁВА.

Вясковая філармонія

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Аздзячыцы — край талентаў і адзін з іх, несумненна, Марыя Антонаўна Іванові. З дзяцінства яна не развітваецца з гармонікам, дасканала авалодала інструментам і на ўсе сто рэалізавала сябе як музыкант і кіраўнік мастацкага калектыву: сямейны ансамбль Іванові чаў з Аздзячыцаў некалі літаральна грымеў на ўвесь раён. Маці з трыма дочкамі-спеўніцамі ведалі ў кожнай вёсцы. Сама ж Марыя Антонаўна шмат радасці прынесла аднавяскоўцам, іграючы на вяселлях, хрэсьбінах і провадах у армію. Дарэчы, Марыя Іванові — адназначна наш чалавек на барысаўскай зямлі, яна сябруе са «Звяздою» больш за дваццаць гадоў, з часу, калі працавала вясковым паштальёнам.

Унучкі Ліка і Ангеліна (на фотаздымку) не-не, ды і ўпросяць бабу Машу дастаць гармонік з шафы.

Утерянную **квитанцию 1-СУ серии КС № 0432004** страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной**.

Людзі ў люстэрку мастацтва

НЕХТА ВЕДАЕ, НАВОШТА...

Вечныя пытанні і адказы на іх адлюстраваныя ў вобразах

Спачатку глядзіш на фота: хаткі на зямлі, хаткі пад небам; людзі, якія ў гэтых хатах жывуць — бабулі і дзядулі са спакойнымі вачыма, якія, здаецца, глядзяць у вечнасць; людзі, якія ўмеюць працаваць, а калі ёсць час, то спяваць і весяліцца; цікаўныя і адкрытыя дзеткі, крыху збянтэжаныя з'яўленнем чужых і нязвыклыя да сучасных аб'ектываў. Героі кніжачкі «Навошта» — усе жыхары нашай краіны, маленькіх вёсачак, дзе захоўваецца свой асаблівы сусвет, далёкі ад гарадской мітусні, дзе час ідзе па-іншаму і бязмежнасць прасторы не выклікае сумневу. І думкі пра сэнс існавання не здаюцца бясконца балючымі, магчыма, таму, што гэты сэнс не трэба шукаць, яго трэба адчуваць. Як адчуў сэрца Беларусі амерыканец Джон Кундстадтэр, які зрабіў гэтыя здымкі падчас сваіх паездак па нашай глыбінцы.

Такая Беларусь — разважлівая, з ціхай сціпласцю, цярплівасцю і далікатнасцю кранула Джона і напоўніла павагай да мясцовых людзей з іх асаблівай прыроднай мудрасцю. Яе наш госць адчуваў праз мову — сам засвоіў беларускую. Таму адчувае смак слоў, якія нібыта гавораць замест яго герояў, разважаюць пра жыццё і яго таямнічыя моманты. Іх аўтар — народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Яго афарызмы, яскравыя і трапныя думкі сапра

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (19 студзеня). Па гарызанталі: Робертс. Костнер. Каін. Штопар. Куфар. Эрг. Алтай. Раён. Нумарок. Маа. Тонус. Каша. Кант. Рак. Клетка. Тэраса. Ром. Гір. Палаш. Люпін. Шык. Карта. Славакі. Енк. Дума. Атол. Нектар. Лістоўка. **Па вертыкалі:** Шнэк. Толь. Комін. Трагік. Форд. Асіна. Ратуша. Ікар. Тракт. Тэндар. Сукно. Кут. Пітон. Мол. Кніга. Самалі. Рэймс. Пол. Елка. Грак. Антраша. Ёрш. Кошык. Стоўн. Атам. Кіслата.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.11	16.33	8.22
Віцебск —	8.06	16.17	8.11
Магілёў —	8.01	16.23	8.22
Гомель —	7.51	16.26	8.35
Гродна —	8.25	16.49	8.24
Брэст —	8.19	16.56	8.37

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Анатоля, Макара, Паўла, Рыгора.*

К. *Марыі, Фернанды, Раймунда, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

23 студзеня

Дзве даты

1264 год — пачалося княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Войшалка (сына Міндоўга), які аб'яднаў Навагрудскую, Пінскую, Полацкую і Віцебскую землі. У 1267-м Войшалк пакінуў вялікакняжацкі прастол і пайшоў у заснаваны ім Лаўрышаўскі манастыр.

1933 год — Канстанцін Станіслаўскі, звяртаючыся да гардэробшчыка МХАТа, сказаў: «Тэатр пачынаецца з вешалкі».

Цытата дня:

«Жаніся, нягледзячы ні на што. Калі табе патрапіцца добрая жонка — станеш выключэннем, калі дрэнная — філосафам».

Сакрат (469—3992 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

Шчыра віншуем паважаную **Святлану Міхайлаўну МОШЧАНКУ** са Слуцка з залатым юбілеем. Зычым моцнага здароўя, плённай працы, дабрабыту і шчасця ў сям'і.

Цётка Галіна, суседзі Новікі.

КОЛЬКІ КАШТУЕ ПАКАЗАЦЬ ЯЗЫК ПАЛІЦЭЙСКАМУ?

Кіроўца ў Германіі можа развітацца на трасе з грашыма не толькі за «справу», але і за «слова». Выразы і жэсты, якія былі сказаныя або прадэманстраваныя вартавым парадку або іншым удзельнікам дарожнага руху, заканадаўча стануць падставай для адабрання ў яго буйной грашовай сумы.

Агульнагерманскі аўтамабільны клуб (ADAC) апублікаваў вынікі даследавання, праведзенага на падставе прысудаў, вынесеных кіроўцам па артыкуле 185 Крымінальнага кодэкса: «Абраза караецца пазбаўленнем волі тэрмінам да аднаго года або грашовым штрафам. Абраза, якая суправаджалася ўжываннем фізічнай сілы, караецца пазбаўленнем волі тэрмінам да двух гадоў або грашовым штрафам».

Секундная страта кантролю над сабой і ўласнымі эмоцыямі, а яшчэ горш — наўмысная абраза, могуць дорага абысціся ўдзельнікам канфлікту. Паводле звестак ADAC, самая «нявінная» лаянка, калі справа даходзіць да суда, пры найбольш спрыяльным раскладзе абыходзіцца ў Германіі ў €250, жэст — у €150, максімальны штраф кіроўцу — €4000.

Да гэтага яшчэ дадаюцца адміністрацыйныя пакаранні, прадугледжаныя ў правілах дарожнага руху, у выглядзе запісу штрафных балаў у «картатэку грэшнікаў» Федэральнага ведамства аўтадарожнага транспарту ў Фленсбургу. «Балы ў Фленсбургу» лічацца адным з найбольш эфектыўных сродкаў уздзеяння на кіроўцаў у Германіі. Напрыклад: праезд на чырвонае святло, які лічыцца адміністрацыйным парушэннем, абыходзіцца ў 3-4 балы плюс да €200 штрафу, а за абразу паліцэйскага пасля гэтага кіроўца можа атрымаць 8—9 балаў. Калі колькасць у Фленсбургу дасягае 18 балаў, злосны парушальнік канчаткова пазбаўляецца вадзіцельскіх правоў, і атрымаць іх зноў можа толькі пасля вельмі складанай і дарагой працэдуры. У яе ўваходзіць медыка-псіхалагічны агляд (MPU), прызванае ў народзе «тэстам для ідыётаў». Уласны чорны «рахунак» у Фленсбургу цяпер адкрыты ў 7,1 млн нямецкіх кіроўцаў, гэта значыць у кожнага сёмага з 49,1 млн уладальнікаў правоў на кіраванне аўтатранспартнымі сродкамі, якія пражываюць у Германіі.

Акрамя таго, у розных федэральных землях суддзі па-рознаму ацэньваюць цяжар абразлівых выразаў і жэстаў. Агульнапрынятага каталога, які дзейнічаў бы па ўсёй Германіі, не існуе. Спіс, складзены аўтарамі даследавання, дзеліцца на дзве часткі: штрафы за словы і выразы, штрафы за жэсты.

Штрафы за словы і выразы, прычым не самыя грубіянскія:

1. Dumme Kuh (дурная карова) — €300—600; 2. Witzbold (жартаўнік-самавук, гумарыст) — €300; 3. Du armes Schwein, du hast doch eine Mattscheibe (Куды прэш, свіння няшчасная) — €350; 4. Du blödes Schwein (тупая свіння) — €500; 5. Hast du blödes Weib nicht Besseres zu tun? (Дурніца, табе рабіць няма чаго?) — €500; 6. Звярнуцца да паліцыянта на «ты» (du) — €600; 7. Verfluchtes Wegelagerergesindel (Бандыты праклятыя, зброд прыдарожны) — €900; 8. Idioten, ihr gehört in die Nervenheilanstalt (Псіхушка па вас плача) — €1500; 9. Fieses Miststück (Дз..мо паганае) — €2500; 10. Alte Sau (Свіння старая) — €2500.

Штрафы за жэсты і іншыя знакі:

1. Паказаць язык — ад €150 да €300; 2. Паказаць круг з вялікага і ўказальнага пальца (= слову азадак) — ад €675 да €750; 3. Паказаць «птушачку», гэта значыць пакруціць пальцам у скроні — €750; 4. Памахаць далонню перад тварам (паказаць рух дворніка = слову Idiot) — ад €350 да €1000; 5. Паказаць сярэдні палец — ад €600 да €4000.

Каб нарвацца на непрыемнасці, не абавязкова крыўдзіць паліцэйскіх або іншых удзельнікаў руху. Дастаткова паказаць сярэдні палец у камеру сістэмы аўтаматычнага кантролю на аўтабане. Суд палічыў гэты жэст вульгарным, які абражае гонар і годнасць паліцэйскіх, якія пазней апрацоўваюць запісаныя відэазвесткі. Такі «завочны» сярэдні палец абышоўся жартаўнікам у €1200.

Аўтары даследавання асабліва падкрэсліваюць, што паліцэйскія і іншыя дзяржаўныя службоўцы далёка не ў кожным выпадку абразлівых паводзінаў з боку кіроўцаў падаюць судовыя іскі. Часта, каб пазбегнуць непрыемных наступстваў пасля эмацыйнага ўсплёску, дастаткова папрасіць прабачэння.

ВІДЭЛЕЦ У БРОНЗЕ

Звычайны відэлец, якім мы ўсе прывыклі карыстацца за абедам, з'явіўся адносна нядаўна — першыя згадкі пра яго адносяцца да IX стагоддзя, што нашмат пазней, чым згадка пра лыжку. Але чамусьці менавіта гэты сталовы прыбор прыцягвае ўвагу скульптараў з усяго свету, якія ствараюць у яго гонар дзіўныя помнікі, якія выклікаюць усмешку ў адных гледачоў і здзіўленне ў іншых.

Самы вялікі ў свеце відэлец знаходзіцца ў амерыканскім Спрынгфілдзе (штат Місуры). Скульптурную форму, вышыня якой складае 10,7 метра, пабудавала адно рэкламнае агенцтва, якое лічыць гэты сталовы прыбор сваім талісманам. Амерыканцы — вялікія аматары паесці, таму што спрынгфілдскі відэлец у гэтай краіне не адзіны. Існуе яшчэ адзін, які знаходзіцца ў штаце Нью-Ёрк і стаіць на абочыне дарогі.

Не адстаюць ад замежных майстроў і рускія скульптары. Дзякуючы іх старанням можна пабачыць трохметровы відэлец у расійскім Іжэўску. Праўда, у адрозненне ад заморскіх скульптур, гэты відэлец не адзіноке: кампанію яму складае пельмень.

А ўкраінскія эмігранты, якія жывуць у канадскім мястэчку Глендан, так і не змаглі забыць родныя варэнікі. І паставілі гэтай выдатнай страве помнік. Без відэльца, натуральна, і тут не абышлося.

Аднак відэльцы існуюць не толькі на сушы, але і ў вадзе! Адным з самых дзіўных помнікаў з'яўляецца велізарны відэлец, які дзякуючы старанням карпарацыі Nestle, апынуўся ўваткнутым у дно Жэнеўскага возера. Скульптура, створаная ў 1995 годзе і змешчаная насупраць музея ежы Alimentarium і штаб-кватэры Nestle, атрымала назву «Помнік ежы».

АЧЫШЧЭННЕ АГНЁМ

У Іспаніі чарговы раз адзначалі дзень Святога Антонія Абата, які лічыцца заступнікам хатніх жывёл. Падчас гэтага царкоўнага свята, якое праходзіць у дні каталіцкага Карнавала, святары бласлаўляюць жывёлу і хатніх гадаванцаў, якіх гаспадары прыводзяць у царкву.

У той жа час у іспанскай вёсцы Сан-Барталаме дэ Пінарас існуе шматвяковая традыцыя — свята Las Luminarias, якое традыцыйна праходзіць напярэдадні дня Святога Антонія. Святы Антоній, пустэльнік, вядомы тым, што быў адным з першых святых, хто выбраў аскетычнае жыццё ў пустэльні, цалкам адарваным ад цывілізацыі. З самай раніцы на гарадскую плошчу, дзе размешчаная царква, накіроўваюцца маляўнічыя працэсіі з размаляваных калёс, за якімі ідуць коні, каровы і аслы ў стужках і вянках. Падчас святкавання жыхары вёскі, мужчыны і жанчыны, скачуць на конях праз вогнішча, якое палае. Паводле даўняй традыцыі, удзельнікі дзейства праязджаюць конна праз рытуальныя вогнішчы, якія раскладваюць вакол вёскі. Лічыцца, што пасля таго, як коні атрымалі блаславенне святара, яны таксама павінны прайсці цырымонію «ачышчэння» агнём і дымам. Цырымонія «ачышчэння» Las Luminarias бярэ свае карані ў XVIII стагоддзі. Каб панаіраць за ёй у вёсцы, насельніцтва якой складае ўсяго 700 жыхароў, збіраюцца тысячы людзей. Падчас свята праходзяць «братэрскія баляванні»: мінакам раздаюць каўбасу і мяса, якое яны багата запіваюць віном. Лічыцца, што побач са святым Антоніем Абатам заўсёды палае агонь: «агонь святога Антонія» (гэта значыць «апаясны лішай», herpes zoster) — вельмі хваравітае і небяспечнае віруснае захворванне. Гэтая хвароба завецца так у народзе менавіта таму, што для выгнання яе заклікаўся святы Антоній Абат, які пакутаваў ад хваравітых язваў па ўсім целе, насланых на яго Сатаной, — падабенства пякельнага агню, вельмі падобнага на «агонь святога Антонія».

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ШЭРЫЯ САЛДАТЫ ПАЛЮЮЦЬ ЗА МІНАМІ

Міны, якія не разарваліся, усё яшчэ застаюцца сур'ёзнай праблемай ва ўсім свеце. Больш за тое, размініраванне — вельмі небяспечная і дарагая справа. Але Барт Веегенс з Бельгіі знайшла рашэнне праблемы — дрэсіраваны сумчаты пацук.

На дрэсуру жывёлы патрэбен прыкладна год. Выкарыстоўваючы напрацоўкі Паўлава, у малых пацукоў выпрацоўваюць устойлівую сувязь паху выбуховых рэчываў і ўзнагароды — бананаў і арахісу. «Шэрыя салдаты» даюць фору ўсім астатнім тэхналогіям і жывёлам, якія выкарыстоўваліся для ачысткі тэрыторый ад мінаў, якія не разарваліся, таму што пацук, у адрозненне ад навучанага сабакі, нават наступіўшы на міну, з-за малой вагі не выкліча дэтанацыю зарада. Ды і ў новых рэкрутах недахопу не будзе, бо самка сумчатага пацука ачыцаўляе да дзесяці памётаў у год. Сам жа працэс вельмі просты — пацук (для гарантыі знаходжання ўсіх мінаў, на адным участку паслядоўна працуюць да трох асобін) з павадыром прачэсвае вызначаны ўчастак і калі знойдзе зарад, садзіцца зверху і драпае лапкамі. Далей ужо чалавек абяскшкоджвае міну.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЗАНАТУЙЦЕ

Сардэчнікам лепш пазбягаць чырвонага

У Японіі надаюць вялікае значэнне падбору колеру ў адзенні, афармленні жылля і нават у харчовых прадуктах. Вучоныя лічаць, што гэта вельмі важна для падтрымання добрага самаадчування.

Спецыялісты па колератэрапіі сцвярджаюць, што кожны колер распаўсюджвае пэўныя вібрацыі, якія ўплываюць на здароўе. Чырвоны колер павышае актыўнасць, таму карысны для флегматычных, спакойных людзей. Сардэчнікам жа варта пазбягаць чырвонага, бо ён узбуджае нервовую сістэму, павышае крывяны ціск.

Медыкі заўважылі, што занадта вялікая колькасць чырвонага стварае адчуванне неспакою і цяжкасці ў грудзях. Як паказваюць даследаванні, у чалавека, калі ён знаходзіцца ў пакоі жоўтага колеру, захоўваецца нармальны ціск, у блакітным пакоі ён паніжаецца, а ў чырвоным — павышаецца. Чырвоны колер можа спустошыць чалавека, які ўжо знаходзіцца ў стомленым стане. Акрамя таго, лішак ярка-чырвонага стварае перашкоды для зроку і можа справакаваць галавакружэнне і мігрэнь.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

«Волатаўскі» храп

Некаторыя людзі лічаць, што прыкметай сапраўднага здаровага сна з'яўляецца моцны храп. А што насамрэч стаіць за гэтым гукам? Прычыны храпу могуць быць вельмі розныя. У выніку хваробаў насаглоткі, языка і мяккага паднябення, ацёкаў і запалення мышцы моцна расслабляюцца, што і выклікае храпенне. А яшчэ да храпу можа прывесці атлусценне, курэнне, прыём алкагольных напояў.

У сваю чаргу, моцны храп можа сур'ёзна ўплываць на работу сардэчна-сасудзістай сістэмы, бо ад яго перагружаецца сэрца, збіваецца рытм і мяняецца артэрыяльны ціск. Апроч таго, наяўнасць храпу сведчыць аб тым, што ў чалавека ў працэсе сна адбываюцца перыядычныя спыненні дыхання, а гэта вельмі небяспечна. Да таго ж пры храпенні кісларод паступае ў лёгкія ў недастатковай колькасці, што моцна абцяжарвае аднаўленне і адпачынак арганізма.

З усяго сказанага вынікае, што праблему храпу, як і іншыя праблемы здароўя, неабходна вырашаць комплексна, дабіваючыся здароўя ва ўсім целе. Бо нават калі вы зробіце хірургічную аперацыю ад храпу, але не ліквідуеце яго прычыну, то праблема, хутчэй за ўсё, вернецца зноў. Таму неабходна прайсці абследаванне ў ЛОР-урача, тэрапеўта, эндакрынолага, кардыёлага і неўрапатолага. Сачыце за вагой і не прастуджвайцеся, умацоўвайце мышцы паднябення пры дапамозе нескладаных практыкаванняў.

Закрыйце рот і моцна падцягніце язык назад, каб яго задняя сценка напружылася. Пры гэтым вы можаце адчуць далонню, як напружваюцца мышцы пад падбародкам. Рабіце практыкаванне ад 10 да 20 разоў адзін-два разы на дзень на працягу 2—4 тыдняў, каб умацаваць мышцы. І нават калі храп цалкам не знікне, то стане слабейшым. Можна напружваць тыя ж мышцы, калі праз сілу вымаўляць гук «і-і-і». Колькасць паўтарэнняў гэтага практыкавання трэба паступова давесці да 30 разоў. Выконваць яго неабходна 2 разы на дзень.

Папулярным народным рэцэптам ад храпу з'яўляецца абляпіхавы алей. За чатыры гадзіны да сну закапвайце ў кожную ноздру па некалькі кропель алею. Рабіце працэдуру 2-3 тыдні — гэта зніме розныя запаленні ў насаглотцы і адновіць нармальнае дыханне.

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Энергетычны кактэйль

У халодную пару года стомленасць і пераахаладжэнне лёгка могуць стаць прычынай хваробы. Аднак ёсць чароўны напой, здольны хутка аднавіць сілы, сагрэць, надаць энергію. Гатуецца ён вельмі проста. Змяшайце ў кубачку 25 г каньяку, 100 г гарачага малака і тры пальцы молатага мускатнага арэха. Піце адразу, пакуль кактэйль не астыў.

-2629-

ЖАНОЧЫЯ ХІТРАСЦІ

Даглядаем вусны

Вусны часта выдаюць узрост жанчыны, таму клапаціцца пра іх пяшчотную і чуллівую скуру трэба пастаянна. Выглядаць яна павінна бездакорна — ніводная памада не замаскіруе дэфекты догляду. Аднак калі ўлетку даглядаць вусны не так складана, то зімой давядзецца пастарацца.

ГАЛОЎНЫЯ ВАРАГІ

Што дрэнна ўплывае на скуру вуснаў?

- Холад, вецер, снег — словам, шкодныя ўздзеянні навакольнага асяроддзя.
- Суперустойлівая памада. Памады працяглага дзеяння змяшчаюць мала тлушчаў і шмат пігментаў — усё гэта моцна перасушвае скуру.
- «Прастуда» на вуснах, а дакладней — герпес. Вельмі многім гэта напасць псуе жыццё, часцей зімой і ранняй вясной, калі паніжаецца імунітэт.
- Абязводжванне. Менавіта зімой, як гэта ні дзіўна, вуснам не хапае вільгаці. Высыхаючы, вусны пачынаюць лушчыцца, трэскацца і нават губляюць акрэслены контур. Скура вуснаў ад гэтага робіцца больш сухой.

КАБ ЗАХАВАЦЬ ЗДАРОЎЕ І ПРЫГАЖОСЦЬ ВУСНАЎ

Першым памочнікам для скуры вуснаў у зімовы час з'яўляецца гігіенічная памада. Выбірайце памаду з максімальнай колькасцю тлушчаў і алеяў. Апроч таго, добра, калі яна змяшчае пчаліны воск і вітаміны. Гігіенічную памаду можна наносіць пад дэкаратыўную перад выхадам на вуліцу ці ў тым выпадку, калі з'яўляецца адчуванне сухасці. Не абавязкова выбіраць самыя дарагія маркі — звычайныя дзіцячыя, набытыя ў аптэцы, справяцца з задачай сілкавання і ўвільгатнення не горш. Галоўнае, каб такая памада заўсёды была пад рукой, таму купляйце адразу некалькі і раскладзіце ў розныя сумачкі і кішэні паліто ці курткі.

Апроч памады, вуснам патрэбныя пілінг і пажыўныя маскі. Спачатку, каб вярнуць скуры прыгажосць, неабходна пазбавіцца ад адмерлых частачак эпітэлію. Гэта працэдура называецца пілінгам. Для пілінгу можна скарыстаць скрабы для твару ці зубную шчотку з мяккім шчаціннем. Лёгка памасіруйце вусны шчоткай (без зубной пасты) або прайдзіцеся скрабам. Самы просты рэцэпт скрабу для вуснаў — змяшаныя мёд і геркулес. А яшчэ выдаліць лішнія частачкі эпітэлію дапаможа нятлусты тварог.

Пасля пілінгу змажце вусны пажыўным бальзамам ці зрабіце шматслойную малочную маску: нанясіце на вусны тлусты кефір ці смятану, дайце высахнуць, нанясіце наступны слой. І так слой за слоем, пакуль іх колькасць не дасягне 10 — 12. Маску пакіньце на 10 — 15 хвілін, а затым змыйце цёплай вадой.

У якасці хатніх бальзамаў прыдатнымі будуць любыя алеі (акрамя абляпіхавага — ён сушыць), у якія можна дадаць растворы вітамінаў А і Е.

СМАЧНЫЯ РЭЦЭПТЫ

Смажаніна з курыцай па-хатняму

1 курыца (вагой каля 1 кг), 6 бульбін, 1 морквіна, 1 цыбуліна, 2 свежыя памідоры, 3 зубкі часнаку, 0,5 бляшанкі зялёнага гарошку, 1 шк. таматнага соусу, 2 ст. лыжкі мукі, алей для смажання, соль, чорны перац на смак, зяленіва кропу.

Курыцу разрэжце на парцыённыя кавалкі, пасаліце, папярчыце, запаніруйце ў муцэ, абсмажце на алеі. Затым перакладзіце ў сатэйнік, заліце таматным соусам, тушыце 30 хвілін. Бульбу, моркву і цыбулю парэжце на частачкі, абсмажце да ўтварэння скарыначкі, злучыце з курыцай. Дадайце зялёны гарошак, тушыце да гатоўнасці. У канцы гатавання пакладзіце парэзаныя памідоры і тоўчаны часнок.

Пры падачы на стол на вялікую талерку выкладзіце спачатку агародніну, затым — курыцу. Смажаніну паліце соусам, які ўтварыўся пры тушэнні, і пасыпце кропам.

-2630-

ВАДА-ВАДЗІЦА, БОЖАЯ ПАМАЧНІЦА: ПЕРШАЙ СТЫХІЯЙ СВЕТУ БЫЛА ВАДА

З далёкіх часоў стварэння свету вада была і застаецца адной з самых магутных, загадкавых і нават таямнічых касмічных стыхій, якая можа лёгка пераўвасабляцца, ператвараючыся то ў лёд, то ў снег, то ў цёплы доўгачаканы летні дождж, а то і ў туманную казку-мрою, гаючую юраўскую расу. Ключавымі момантамі ў фарміраванні адносінаў чалавека да вады былі два аспекты. З аднаго боку, яна мела таямнічую здольнасць пластычнага пераўвасаблення, а з іншага давала жыццё (спрыяла, падтрымлівала, жывіла) усяму навакольнаму свету — чалавеку, жывёле, птушкам, раслінам. Разам з тым, вада, як і астатнія касмічныя стыхіі, утрымлівала ў сабе разбуральную энергію: веснавая паводка залівала ўсё навакольле і магла пашкодзіць жытнёвыя палеткі; бясконцы летні дождж мог пакінуць чалавека без ураджаю; нарэшце, вада магла пазбавіць дзіця або дарослага жыцця — забраць у сваё чэрава. Вось гэта фундаментальнае супрацьстаянне «жыццядайнасць — смяротнасць» і было той галоўнай генеруючай ідэяй, вакол якой фарміравалася складаная сістэма поглядаў і ўяўленняў пра ваду.

- Водныя «артэрыі» зямлі — рэкі, азёры, крыніцы — у народзе параўноўвалі з крывяноснымі сасудамі чалавека (у замове, якая павінна дапамагчы суняць кроў, гаворыцца: «Несла баба ваду, зачапілася за калоду. Вада разлілася — каб кроў запяклася»). Пры гэтым лічылі, што зямная і нябесная водныя стыхіі ўзаемазвязаныя, а нерэгламентаваныя дзеянні чалавека (парушэнне агульнапрынятых забаронаў) разбураюць гэтую «непарушную» сувязь. Як вынік, наступіць пакаранне — засуха, градабой, маланка, пярун, таму што ў гэты момант вада «гневаецца» і «карае» вінаватых. Лічылася, напрыклад, што доўгія, так званыя «гнілыя» дажджы, ідуць таму, што недзе «сапсавалі ваду»: утапіўся чалавек, і пакуль яго цела не дастануць з вады, дождж не спыніцца.
- Чалавек разумеў, што ён не можа пражыць без вады ні аднаго дня, таму стаўленне да яе вызначалася асаблівай пачцівасцю, прыязнасцю і нават святасцю. Перад тым, як скарыстаць ваду, трэба было выканаць шэраг адпаведных сітуацыі рытуальных дзеянняў: з ёю віталіся, як з жывой істотай, шапталі самі сабе малітву або замову, прыносілі ёй розныя падарункі.
- Адначасова існаваў цэлы шэраг забаронаў у адносінах да вады. Каля яе нельга было крычаць, сварыцца і брыдкасловіць, пляваць у ваду, біць яе палкай. У асяроддзі беларусаў лічылася, што ноччу ў хаце абавязкова павінна стаяць вядро з вадой, якую ў любы момант можна было выкарыстоўваць для піцця, але пры гэтым добра ведалі, што посуд, у якім яна знаходзілася, трэба абавязкова накрываць. Катэгарычна забаранялі піць ваду, якая знаходзілася ў лазні, нават самую чыстую, крынічную, таму што лазня заўсёды ўспрымалася «нячыстым» месцам.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Мужчына разумее, што закаханы, калі ён на некалькі дзён губляе цікавасць да сваёй машыны.

☺

Два сябры.

— Чым на выхадных займаліся?

— Ды я жонцы прапанаваў у кіно схадзіць, а яна мне ў тэатр...

— Спектакль спадабаўся?

☺

У новай рэдакцыі клятва Гіпакрата пачынаецца са слоў «Толькі пры наяўнасці страхавога поліса...»

☺

— Я перад сваім днём нараджэння разбіў кубак, і некалькі чалавек пра гэта даведаліся. Цяпер у мяне шэсць кубкаў...

☺

Дыялогі ў сеціве.

— Хто-небудзь ведае, чаму каты любяць церціся шчакой аб вуглы?

— Ты сам паспрабуй, гэта здорава!

.....

— Дурань! Бачыў бы ты зараз вочы маёй мамы!!!

☺

За хлявом даярка Сцяпанава вельмі гучна падабалася заатэхніку Пятрову...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 334. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12